*Гладышчук А.*

# Касцюшкаўскае паўстанне 1794 года вачыма Юльяна Урсын Нямцэвіча



Тэкст **«Касцюшкаўскае паўстанне 1794 года вачыма Юльяна Урсын Нямцэвіча»** складзены з двух польскіх выданняў **«PAMIĘTNIKI CZASÓW MOICH»** Ю. У. Нямцэвіча (Парыж, 1848 і Варшава, 1957), якія дапаўняюць адно другое, бо адрозніваюцца зместам адпаведных тэкстаў. Пераклад тэкстаў з польскай на беларускую мову, як і іх аб'яднанне з двух выданняў, падрыхтаваў Анатоль Гладышчук.

**Уступнае слова**

Ніколі не думаў, што давядзецца так шмат займацца лёсам вядомага шляхецкага роду Нямцэвічаў і яго найбольш вядомага ва ўсім свеце прадстаўніка — Юльяна Урсын Нямцэвіча. Але пераезд у Скокі, радзіннае гняздо Нямцэвічаў, і знаёмства з прадстаўнікамі роду ў маі 2002 г. у Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага, выклікалі вялікую зацікаўленасць да гэтых нашых людзей, без якіх яшчэ стагоддзе таму ні ў Брэсце, ні ў яго ваколіцах не вырашалася ні адна справа. Не ведаю, была гэта воля Божая альбо толькі простае імкненне даведацца як мага болей пра тых, чые імёны ў Скоках яшчэ памяталі, але паглыбленне ў гісторыю рода Нямцэвічаў станавілася ўсё больш захапляльным і цікавым. Такім чынам, у 2009 г. у Мінску з дапамогай выдавецтва «Літаратура і мастацтва», а таксама пры фінансавай падтрымцы Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Брэсцкага аблвыканкама і асабіста Алеся Карлюкевіча і Аляксандра Рагачука з'явілася навукова-папулярнае выданне «НЯМЦЭВІЧЫ. САПРАЎДНЫЯ ГІСТОРЫІ», якое сёння ўжо з'яўляецца бібліяграфічнай рэдкасцю.

Яшчэ рэдактар першага выдання В. Ц. Вольскі заўважыў, чаму гэта аўтар не падаў у манаграфіі інфармацыю пра паўстанне 1794 г., з ім часцей за ўсё звязваюць лёс Юльяна Урсын Нямцэвіча з нашымі землямі. Заўвага была справядлівая, але аўтарская задума была іншая: не рабіць акцэнт на паўстанні, а дазволіць чытачу паглыбіцца з чыста чалавечых і жыццёвых пазіцый у гісторыю знакамітага роду, які жыў каля Берасця некалькі стагоддзяў, прымаў непасрэдны ўдзел у яго жыцці, г. зн. тварыў нашую гісторыю. Так адбылася спроба і захапіцца, і апавядаць пра родную гісторыю альбо пра тую яе частку, якую нярэдка атаясамліваюць з чужой, што вельмі несправядліва.

Аднак вярнуцца да паўстання 1794 г., якое часта называюць Касцюшкаўскім, у якім Юльян Урсын Нямцэвіч прымаў непасрэдны ўдзел як сакратар і ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі, заміналі нейкія жыццёвыя дробязі. Працуючы над кнігай «Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі», заўважыў, што неяк выпадкова альбо наўмысна пра ролю Ю. У. Нямцэвіча ў гэтых падзеях было сказана недастаткова. Асабліва гэтае меркаванне ўмацавалася пасля наведвання месца бітвы паўстанцаў з расійскім войскам каля Мацяёвіцаў паблізу Віслы, дзе і Тадэвуш Касцюшка, і Юльян Урсын Нямцэвіч, цяжка параненымі, апынуліся ў палоне. Там, у Мацяёвіцах, ёсць прыватны музей пра гэтыя падзеі. Яго на свае сродкі адкрыў ураджэнец гэтых мясцін. У гэтым музеі, аднак, пра Юльяна Урсын Нямцэвіча, прынамсі, пяць гадоў таму назад, не было ніводнага слова. Гэта здзівіла, але адказ на адпаведнае пытанне тады завіс у паветры.

Адказ на гэтае пытанне дае ў сваіх успамінах сам Юльян Урсын Нямцэвіч, праўда, для гэтага іх трэба прачытаць. Гэтую магчымасць беларускі чытач упершыню атрымае, прачытаўшы новы гістарычны нарыс «Касцюшкаўскае паўстанне 1794 года вачыма Юльяна Урсын Нямцэвіча», які складзены з двух выданняў «Pamiętniki czasów moich» Ю. У. Нямцэвіча — 1848 г. (цяпер амаль недаступнае) і 1957 г. (з'яўляецца вельмі рэдкім), перакладзеных упершыню на беларускую мову. Тэкст «Pamiętników...» у абодвух выданнях адрозніваецца, часам вельмі моцна, таму была зроблена спроба не механічна далучыць тэкст аднаго выдання ў адпаведных месцах да тэксту другога выдання, а злучыць іх так, каб яны растварыліся адзін у другім, каб змест успамінаў быў больш поўны і цікавы. Чаму тэксты двух выданняў так адрозніваюцца, адказаў у прыватнай перапісцы Вітальд Урсын Нямцэвіч. Справа ў тым, што жыццё Юльяна Урсын Нямцэвіча было вельмі складанае, ён вымушаны быў увесь час «падарожнічаць», «губляючы» ў той ці іншай краіне свае манускрыпты, якія ён пасля чарговай «прыгоды» пачынаў пісаць з чыстага ліста. Таму не дзіўна, калі дзе-небудзь знойдуцца яго рукапісы невядомых яшчэ «Pamiętników...». Гэта зусім недаследаваны абсяг творчасці нашага знакамітага земляка, які не падзяляе

літаратурную спадчыну двух суседніх народаў, а, наадварот, аб'ядноўвае яе. Каб гэта адчуць, трэба перакладаць Юльяна Урсын Нямцэвіча на беларускую і іншыя мовы. Па-іншаму зразумець сябе немагчыма.

*Анатоль Гладышчук*

## Эміграцыя

На тым не скончыліся няшчасці Польшчы, падставай для якіх была Таргавіца *(саюз магнатаў Рэчы Паспалітай супраць прагрэсіўных рэформ Чатырохгадовага сейма 1788–1792 гг., абвешчаны ў мястэчку Таргавіца [сёння Украіна] 14 мая 1792 г.).* Апошні смяротны ўдар ёй нанесены быў у хуткім часе невыноснай роспаччу. Народ, які раней не ўмеў карыстацца свабодай, цяпер быў няздольны сагнуцца пад ярмом; прыткі на пад'ём, не звяртаючы ўвагі на тое, які вынік будзе адпавядаць смеласці пачыну, не мог спакойна сядзець і глядзець ні на страты абшараў маёмасці айчыны, ні на абразы, выпрабаваныя ў часы пасяджэнняў, ні на ганебную маскоўскую апеку, якая пачыналася па-новаму. Гэтыя смутныя пачуцці кіпелі глыбока ў грудзях кожнага паляка. Год трывання Канстытуцыі 3 мая 1791 г. даў адчуць палякам салодкі смак разважлівай волі і атрыманую зноў паміж народамі павагу. Ніхто не хацеў разумець таго, што стан сённяшняй нікчэмнасці мог доўга трымацца. Як толькі гэты сейм скончыўся, як толькі кароль вярнуўся ў Варшаву, адразу ж пачаліся тайныя змовы ў арміі, паміж мяшчанамі, асабліва сярод моладзі, для скідвання маскоўскага ярма і атрымання страчанай незалежнасці. *(Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай была абвешчана 18 мая 1792 г. ад імя расійскай імператрыцы Кацярыны II, што дазволіла Расіі разам з Аўстрыяй ажыццявіць у 1793 г. Другі падзел Рэчы Паспалітай).*

Скончыўшы апавядаць пра тую пакуту гвалтаў і неправамоцтваў, трэба мне цяпер вольна ўспомніць пра павароты свайго лёсу. Пасля таго, як кароль падпісаў Таргавіцкае пагадненне, я ўбачыў, што страчана ўсялякая наша надзея на свабоду. Не жадаючы глядзець на балючае відовішча, як уваходзяць у сталіцу маскалі[1], разам з іншымі падаўся я ў Лейпцыг, трымаючыся паблізу нашых межаў, каб пры першай неабходнасці, калі трэба будзе быць карысным маёй айчыне, я мог бы неадкладна вярнуцца да яе. Санкцыі Таргавіцкай канфедэрацыі пазбаўлялі грамадзянства ўсіх тых, хто з'яўляўся ўдзельнікам Канстытуцыі 3 мая. Гэта прымусіла мяне пры наведванні чужых краін, на жаль, шукаць ільготаў.

Прычынай да выбуху паўстання паслужыла варварская пагарда маскалёў, якія не ўмелі альбо не жадалі падсаладзіць ярмо няволі. Згодна з маскоўскімі звычаямі была створана армія шпікоў. Ігельстром

1 Так у польскамоўным арыгінале.— Аўт.

*(у канцы 1793 г. быў прызначаны паслом Расіі ў Рэчы Паспалітай)*, самы высокі маскоўскі правадыр у Польшчы, не знаў меры ў пераследаваннях і рабаванні. Найпершым яго стараннем было распусціць наша войска. Шмат вайскоўцаў, таксама і з замежным грамадзянствам, у якіх адабралі вайсковыя званні, якія з'яўляліся адзіным сродкам да існавання, вырашылі гэтаму супрацівіцца. Пазбаўленне вайсковых крыжоў абразіла многіх салдат. З усіх карпусоў былі адпраўлены дэлегацыі ў Варшаву, каб сустрэцца з непрыхільна настроенымі да перамен, дамовіцца наконт сродкаў і выбраць правадыра. Гэты выбар лёгка ўпаў на генерала Касцюшку *(Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка, як лічаць, нарадзіуся 4 лютага 1746 г. на Берасцейшчыне ў маёнтку Мерачоўшчына каля Косава.— Аўт.)*.

Акрамя заслуг і адвагі (Касцюшка паходзіў, дарэчы, з даўняй, але незаможнай шляхты), ні багаццем, ні прагай прасунуцца, ні нават відавочным талентам не падахвочваў ён іншых да няшчаснай злоснасці і зайздрасці. Выхаваны ў рыцарскай школе кадэтаў на сродкі князя Адама Чартарыйскага, генерала зямель падольскіх, быў пасланы ў Парыж, каб удасканаліцца там у ваеннай навуцы і інжынерыі. Пасля вяртання ў Варшаву нешчаслівае яго каханне да панны Сасноўскай, дачкі гетмана польнага літоўскага, прымусіла яго пакінуць радзіму. Падаўся ён у Амерыку, дзе пачалася вайна за незалежнасць штатаў. На працягу ўсёй гэтай вайны служыў з вялікай годнасцю, прымаў удзел у бітвах пад Саратогай, Трэнтанам, Йелоў Спрынгс, Вест-Пойнтам. Пасля падпісання міру ён вярнуўся на радзіму, дзе пасля павелічэння войска быў узведзены ў званне брыгаднага генерала. Успомнілі мы пра ўчынкі яго апошняй выправы. Зараз нам прыйдзецца сцісла яго ўчынкі апісваць далей.

Пасля нешчаслівай вайны 1792 г. і далучэння караля да Таргавіцкай канфедэрацыі Касцюшка разам з Ігнатам Патоцкім, Калантаем, Вайсенгофам і Нямцэвічам адправіўся ў Лейпцыг. Туды прыбыў тайна і генерал Заёнчак, адзін з самых актыўных рэвалюцыянераў, з данясеннем аб паўсюдным у краіне незадавальненні і намеры паўстання. Але дадаў пры гэтым, што колькі маецца запалу, столькі і недахопаў магчымасці і спосабаў пачатку барацьбы з такім магутным праціўнікам. Палякі, якія сабраліся ў Лейпцыгу, паспрабавалі ў цэлым зразумець сітуацыю глыбей. Пасля канфіскацый, якія здарыліся, і адрэзаныя ад спосабаў атрымання найменшай дапамогі, што ж маглі скласці мы на такое вялікае пачынанне? На што маглі мы спадзявацца ад чужых дзяржаў, якія або супраць нас былі, або былі заняты французскай рэвалюцыяй і трывожыліся больш аб уласнай цэласнасці. Прыходзіў на памяць і зменлівы характар нашага народа, які быў запальчывы ў пачынанні справы, але хутка страчваў ахвоту да гэтага і падаў духам. Непадрыхтаванасць і цемната вясковага люду, немалая колькасць прыхільнікаў Масквы, большасць абыякавых, слабасць

караля, моц непрыяцеля — усё гэта сведчыла, што, калі справа яшчэ не даспела, лепш часова пачатак паўстання трохі адтэрмінаваць, даць час для яго падрыхтоўкі і тады толькі пачынаць.

Дык вось, такім чынам, гарантаваўшы сабе сувязь праз перапіску з саўдзельнікамі па няшчасці: маршалкам Станіславам Патоцкім і Вайсенгофам, бачыўшы аддалены час паўстання, ад'ехаў я з Лейпцыга ў Вену. Там быў яшчэ паслом даўні наш прыяцель пан Война. Меў я надзею, што венскі двор, расчараваны царыцай, таму што пры апошнім падзеле быў выключаны ад пранікнення ў Польшчу Масквой і прусамі, неахвотна пазірае на ўсё гэта і можа схіліцца да крокаў, якія дадуць нам зручны выпадак вярнуць набытыя свабоды і нашыя страты.

Менавіта ў той жа час прыехаў у Лейпцыг Ян Загорскі, жмудскі пасол, мой калега па сейме: гэты малады чалавек, які ніколі не быў за мяжой, пажадаў пусціцца разам са мной у далейшае падарожжа. Такім чынам, выехалі мы разам у Дрэздэн. Не без сумнага расчульвання глядзелі на дабрачыннага саксонскага абранніка, на яго дачку, якія за кароткі момант нашай незалежнасці ўжо сталі лічыць нас уладарамі. З Дрэздэна па дарозе ў Берлін заехалі мы ў княства Дэсау і Верліца. Спыніліся ў гасціным двары, такім акуратным і цудоўным, што нідзе такога, апроч Англіі, мне ўбачыць не здаралася. Сядзелі за агульным сталом, дзе шмат знаходзілася чужаземцаў, як заўжды, захопленыя адзінай думкаю і пачуццямі. І вось, калі мы аплаквалі слабасць няшчаснага Станіслава Аўгуста, які так лёгка саступіў нахабству таргавічан, пачулі голас нейкага чалавека, які адазваўся па-польску:

— Бо таксама, той ваш кароль, вялікая курва[2]!

Здзіўленыя такой увагай, нават неяк неахвотна, што хтосьці слабага караля зневажае адзначаным назоўнікам, запыталі, хто гэта такі будзе?

— Некалі вашым суайчыннікам быў, — адказалі нам, — Генрык Бруль.

Пасля такога адкрыцця, ужо як з нашым суайчыннікам, трывала паміж намі фамільярная, але сумная, доўгая размова пра няшчаснае наша становішча.

Назаўтра мелася быць у Верліцы княжацкае паляванне на аленя. Атрымалі мы верхавых коней, каб маглі быць рухомымі пры адчуванні звера, знаходзіліся побач з паважным старцам, маршалкам княжацкага двара Дэсау. Гаваркі старац апавядаў мне пра сваю даўнюю службу пры двары. Успомніў, што ў сваёй маладосці быў прыдворным у князя Ангальт-Цэрбсцкага, бацькі пануючай цяпер царыцы Кацярыны II; што прысутнічаў нават пры двары, калі пасол царыцы Елізаветы прыехаў да Цэрбстаў, каб прасіць аб княжне Софіі (так у той час звалі Кацярыну) для

2 Так у польскамоўным арыгінале.— Аўт.

вялікага князя, пазней Пятра III; што ў час размовы з бацькам убегла маладая княжна, якая вяла гаспадарку дробнага князя, з пяром за вухам, трымаючы ў руцэ меню абеду.

— Хто б мог у той час сказаць, — прамовіў старац, — што тое маладое дзяўчо цяпер будзе трэсці светам.

— Што пераверне, — дадалі мы, — заўжды непавіннае Польскае каралеўства.

Князь Георг, брат правячага князя, запрасіў нас пасля палявання да сябе на абед, але занадта мы былі абцяжараны сваім смуткам, каб перамешваць гэтае сваё са святочнай вялікасцю і весялосцю.

Шкада, што пануючы ў той час князь Дэсау не быў валадаром большага краю. Са святлом, навукай, чалавечнасцю, якімі ён валодаў, гэты край быў бы ашчаслівулены падобна таму, як ашчаслівіў ён сваё маленькае княства. Быў гэта выгляд, які радаваў па-сапраўднаму сэрца вандроўніка — глядзець, як гэты малы край апрацаваны, гаспадарчы, квітнеючы; як усё, што ў ім дыхала, было шчаслівае. Пры атрыманні ўлады застаў гэты князь у сваім краі некалькі ўдзельных шляхцічаў — як гэта часта бывае — яны моцна прыгняталі сваіх сялян. Адкупіў князь іхнюю спадчыну, а стаўшы сам адзіным землеўласнікам, падзяліў княства на малыя арэнды і выпусціў іх даследным земляробам за бестэрміновы чынш. Вельмі добрая апрацоўка глебы, дастатак і шчасце сталі вынікам таго праўлення. Палац, паркі, звярынец у Верліцы былі ўзорам найлепшага разраду і густу. Князь, у якога не было магчымасці мець арыгіналы найлепшых мастакоў, сабраў копіі гэтых твораў. Пазіраючы на квітнеючы стан такога малога княства, падумалася:

— Ах, чаму ж сёння не ўвесь свет падзелены на такія дробныя княствы, дзе вока валодаючага ўсё хутка можа ахапіць і ўсяму хутка зможа даць рады? Як жа людзі пры гэтым былі б шчаслівымі.

Але спынім на гэтым пажаданні сваю ўвагу, што шчасце людзей найбольш за ўсё залежыць ад характару пануючага. Дай княству Дэсау padазронага, цёмнага вар'ята за пана і — як сёння — убачыш паўсюль калатнечу, хмурнасць, пабляднелыя твары і пакінутыя нівы.

З Дэсау, задаволіўшы цікавасць майго сябра-спадарожніка, адправіліся мы ў Берлін. Сталіца, пабудаваная сярод акіяна пяскоў толькі для дэкарацыі, праз аддаленасць ад граніц караля Францыі і з-за адсутнасці войска паказалася мне яшчэ больш нелюдзімай і смутнай, чым раней. Паўсюдна было відаць, што нашыя колішнія незаможныя васалы, прыгнятаючы сваіх падданых, сіляцца як фанабэрыстыя скнары, каб з сябе выдаваць пацешных манархаў.

Праехаўшы праз Прагу, спыніліся мы ў Вене ў кастрычніку. З жалем пабачылі, як чэхі, некалі нашыя пабрацімы, намаганнем свайго ўрада штораз больш змянялі нас на немцаў. Шляхта ўжо не ведала сваёй роднай

мовы. На жаль — падумаў я пра сябе — так будзе і з няшчаснай нашай Польшчай: гучанне нашай мовы застанецца толькі ў сумленных сялян.

Пасля прыбыцця ў Вену і пасля маёй размовы з панам Войнам даведаўся я, што акрамя добрых пажаданняў для нас, а хутчэй за ўсё расчаравання і антыпатыі да Масквы, на большую падтрымку мы не маглі тут спадзявацца. Каўнітц ужо пачаў дзяцінець. Філіп Кобенцл і Тугут былі на чале замежных спраў. Слабы малады манарх, усе слабыя яго міністры свае намаганні рабілі толькі на тое, каб прыдушыць французскую рэвалюцыю.

Значную частку зімы з 1792 па 1793 г. мы пражылі ў Вене. Сустрэлі там князя А. Чартарыйскага, генерала зямель падольскіх, годных яго сыноў, князёў Адама і Канстанціна, а таксама Асалінскага, генерала Заёнчака і многіх іншых, што знайшлі ад маскалёў тут таксама часовы прытулак. Памножылася лічба чужаземцаў у Вене і добраахвотнымі выгнанцамі з Францыі: з каралеўскага боку — бесцырымоннай прынцэсай Полігнак і яе цудоўнай дачкой, княжною Грумонт, а таксама Эстэрхазы, Лузіднан, дэ Рыв'ерэ, дэ Водроіл і іншымі. Справа дзіўная: уцякаць яны мусілі са сваёй краіны, таму што засталіся вернымі манаршай уладзе; мы ж былі выгнаны з-за таго, што ў анархічнай Рэчы Паспалітай канстытуцыйна спрабавалі замацаваць манархію.

Не паказваліся мы тут у аўстрыйскіх магнатаў, але бывалі часта ў французаў. Прыцягвала нас туды іх ветлівасць, дасціпнасць і, асабліва, рэдкі талент апавядання важных ці дробных здарэнняў. Шчыра падзялялі іхні боль ад жудаснай смерці Людовіка XVI.

Аднавіў я сваё знаёмства з баранэсаю К..., з якой пазнаёміўся яшчэ ў дзяцінстве. Маці яе была іспанка, дачка захавала жывасць, дасціпнасць і вялікія іспанскія чорныя вочы. Кампанія з ёю не раз разганяла хмары майго глыбокага смутку.

У канцы 1792 і пачатку 1793 г. даходзілі да нас толькі весткі з радзімы пра шалёныя пракламацыі Шчаснага: пра дні Астрэі, абвешчаныя ў Польшчы, пра дзікую ашалеласць Ржэвуцкага, які забаўляўся са сваёй гетманскай булавою. *(У грэчаскай міфалогіі дачка Зеўса і Феміды, багіня справядлівасці і сястра сарамлівасці, пасля таго як пакінула Зямлю з-за людскіх сапсаваных нораваў і ўзнеслася на неба, стала менавацца сузор'ем Дзевы. Дні Астрэі ў Польшчы — гэта быў намёк на Кацярыну II, званую «Паўночнаю зоркаю», якую атаясамлівалі з міфічнай Астрэяй.— Аўт.).*

У той час, каб высмеяць неразумнасць таргавічанаў, напісаў я лёгкі посвіст вострай сатыры пад тытулам «Фрагмент таргавіцкай бібліі. Кніжкі Шчаснага», потым верш да верхаводаў Таргавіцы, нарэшце, калі ўжо, на жаль, прыйшла вестка пра захоп нашых правінцый, напісаў элегію на падзел Польшчы пад назвай «Вясна», якая пачыналася вершам: «Прыйшла вясна, увенчаная майскім вянком...». Пісаў я, ходзячы па пар-

ках Вены, не раз лінія алоўка акраплялася маімі слязамі. Элегія засталася ў маіх працах з некаторымі зменамі. «Біблія таргавіцкая», «Форма ўрада Таргавіцкай канфедэрацыі», верш да таргавічанаў, які ў наш час нязмерна рэдкі таму, што некалькі картак, хутка надрукаваных, згубіліся, а таксама таму, што Навасільцаў, калі дзе-небудзь пра іх даведваўся, збіраў і паліў, а ўладальнікаў вершаў знявольваў. Усё гэта друкавалася ў прадмесці Леапольдштадта ў невядомага друкара. Упэўнены, што венская паліцыя пра гэта мусіла ведаць, але ўрад, можа, не гневаўся, што лупцоўка пагардай і камізмам дасягала нямілай яму Кацярыны.

Цікавым быў спосаб, якім гэтыя ўсе пасланні дастаўляліся ў Варшаву. Французскія эмігранты князь дэ Рышэльe і граф Лангерон з некаторага часу паступілі на маскоўскую службу. Былі яны пасрэдніцкім звяном паміж французскімі князямі і царыцай, і таму часта іх ганцы былі кур'ерамі з Пецярбурга да Вены праз Варшаву з малымі пасылкамі, але з нязмернымі абяцаннямі. Найбольш фамільярна французы наведваліся ў дом пані Войнавай, жонкі нашага пасла ў Вене. Яна ўжо мела на гэты час прыгатаваны да адпраўкі пакуначак з некалькімі экзэмплярамі «Бібліі таргавіцкай», завяраючы гасцей, што пад выглядам падарункаў перадае яна тасёмкі альбо іншыя жаночыя рыштуначкі. Пані Войнава прасіла, каб французы ўзялі гэта з сабою і па дарозе аддалі ў Варшаве для яе сястры, княжны Яблаоўскай, кракаўскай каштэляншы. Смяяліся мы не раз ад душы, як кур'еры Кацярыны з найвялікшай клапатлівасцю і паспешліва везлі на сваіх грудзях пакет найз'едлівых снарадаў для пані, якая іх утрымлівала. Кур'еры дастаўлялі гэтыя друкі ў Варшаву княжне Яблаоўскай, адкуль яны пападалі да валадароў Таргавіцы і разыходзіліся па ўсёй Польшчы. Шчасны і Ржэвуцкі не маглі ніяк зразумець, адкуль гэтыя атручаныя дзіды з грамадзянскай знявагай знаходзяць іх.

Пенілася ад злосці Таргавіца, раззлавалася і царыца, прыйшлі з Пецярбурга да Вены скаргі, што там друкуюцца лісты і рыфмы, якія абражаюць царыцу і мужоў, што былі пад яе пратэкцыяй. Устрывожаныя прыяцелі пераканалі мяне, што слабы венскі двор не будзе вагацца ні хвіліны, каб выдаць мяне царыцы і настойвалі на тым, раілі, каб я найхутчэй пакінуў Вену. Шмат на той час маіх землякоў і таварышаў праз Швейцарыю падаліся ў Парыж, сярод іх: Мастоўскі, Загорскі, Бляшынскі, княгіня Аляксандра Любамірская з Хадкевічаў, самая прыгожая для свайго часу кабета, тая самая, якую раз'юшаныя французы так жудасна замардавалі. Угаворвалі яны мяне ўзяць з сабой, але крывавае зарыва, якое штодзённа павялічвалася над Францыяй, выклікала ў мяне агіду да таго люду. Аддаў я перавагу наведванню яшчэ раз спакойнай Італіі, галоўным чынам і таму, што меў дастатковы запас зберажэнняў на гэтае падарожжа. «Народная газета», у якой я з'яўляўся адным з пісараў, вельмі добра разыходзілася і

пакінула для мяне са сваіх даходаў каля сямідзесяці дукатаў. Дамовіўшыся з генералам Заёнчакам, што ён мне загадзя паведаміць, калі пачнецца паўстанне, і аб карэспандэнцыі з маршалкам Патоцкім і палякамі, якія засталіся ў Вене, каб пазбавіцца ад сваіх смутных думак, у пачатку 1793 г. пусціўся я праз Цыроль і Роверэда ў Італію.

На жаль, не было ўжо (!) у гэтай цудоўнай краіне той для мяне прывабнасці, якую я ў ёй знайшоў, калі дзесяць гадоў таму назад наведаў Італію першы раз. Эх! Які вялікі ўплыў маюць абставіны на нашы пачуцці і аб'ектыўнасць успрымання намі рэчаіснасці! У той час быў яшчэ наш край амаль цэлы, была надзея выбрацца з залежнасці; сёння ён разадраны, дашчэнту прыгнечаны, бездапаможны — знікла ўсё мілае абаянне, лазур нябёсаў — усё гэтае для мяне, здаецца, пакрылася чорным жалобным сукном. Быў я гадоў дзесяць таму сталы, меў настрой, нязлосны, і вырашыў не забаву для сябе, а карысць для свайго краю з таго падарожжа прынесці. Зрабіў захады роднаю мовай дакладна апісаць Італію, як выкананне майго намеру. Пазней раскажу, як манускрыпт той загінуў, а зараз запішу толькі некаторыя ўспаміны пра тое падарожжа.

Падабалася мне пражыванне ў спакойнай Фларэнцыі, зняў я пансіён у купца, які таргаваў сукном, сіньёра Бісіда. Спадарыня Лебрун, слаўная мастачка, дала мне пісьмы да маркграфіні Вентуры французскага паходжання, слаўнай сваёй прыгажосцю, фаварыткі Людовіка XV. Яе дом, галерэя, паездкі і прагулкі, бібліятэка св. Лаўрэнца, таварыства слаўнага анатаміста кавальера Фантана, хіміка Фаброні напаўнялі ўвесь мой час. Хутка прыехаў з Рыма ў Фларэнцыю маршалак сейма Станіслаў Малахоўскі. Ён, як і я, шукаў спакою. Смуткавалі мы і суцяшаліся разам. Гэта мяне яшчэ больш схіліла застацца ў Фларэнцыі. Таксама пазнаёміўся там з ветлівай, абаяльнай Анжэлікай, спадарыняй Хервэй. Узаемная прыязнасць, якая ўзнікла тады, захавалася паміж намі аж да позняй нашай старасці.

Мазэі, італьянец, з якім я быў знаёмы яшчэ ў Парыжы і які пазней далучыўся да двара Станіслава Аўгуста, даў мне ліст да слаўнага паэта, графа Альфіеры. Апошні пазнаёміў мяне са сваёй прыяцелькай графіняй Альбана, з дома Стальберга, удавою англійскага прэтэндэнта на трон. У першым маім падарожжы ў Італію бачыў я яе ў поўнай красе разам з мужам, праўда, прэтэндэнт ужо тады ўпаў у дзяцінства: меў заўсёды пры сабе капітана гвардыі ў англійскім мундзіры і герб гэтага каралеўства на карэце. Меў цікавасць да гэтага старца і я, і як да сведкі змен лёсу эпохі, і як да ўнука караля Яна III.

Альфіеры, паэт, быў статны, высокі, з тварам, на якім адбівалася вялікай душы моц, бледны, вочы блакітныя, валасы светлыя. Выказваўся з такой жа звязнасцю і сілаю, якія мы бачым і ў яго рыфмах. Гарачы абаронца ра-

зумнай вольнасці, але абуралася яго душа крывавай лютасцю французаў, як ганебнаю і згубнаю справе чалавецтва. Дом графіні д'Альбаны быў над ракою Арно, непадалёку ад моста Святой Тройцы. Найлепшае таварыства — будзь гэта чужаземцы, будзь гэта і суайчыннікі — збіралася ў гэтай спадарыні. Давалі там часам тэатральныя рэпрэзентацыі, найбольш трагедыі Альфіеры. Бачыў і самога аўтара ў фраку з плашчом, толькі накінутым на плячо, які граў ролю Брута. Моц ігры Альфіеры і дэкламацыі кампенсавалі сапсаванасць ілюзій часам не бясспрэчных убораў.

Часта наведваў слаўнага анатама кавальера Фантана. Заставаў яго не раз за падрыхтоўкаю адразу пяці альбо шасці чалавечых галоў. Рабіў ён велічэзную чалавечую постаць (шаблон), у якой з разнастайных гумаў і матэрыялаў былі зроблены выразна бачнымі недаступныя чалавечаму воку жылы і сасуды і ўсе тыя часткі ўнутранасцяў, нават і вантробы, што былі прымацаваны шрубкамі так, як пры раненні. Неяк раз Фантана адкруціў частку сваёй статуі, што адпавядала больш ранняй частцы працы, і разам з ім убачыў я, што ўнутры было таксама ўсё пакалечанае.

Як прыемна было жыхару паўночнага краю пасярод зімы хадзіць нават без плашча, глядзець на яснае неба, на лаўры, амандры, пінолы, вечна зялёныя ў парку Баболі. Толькі іншым разам у маім пакоі распальваў камін аліўкавым галлём. Рупліва прыкладваўся ў той час да лацінскай і італьянскай моў, узяўся за прабелы ў рысунку з мэтрам, спадаром Гросам, вучнем Давіда, што сёння так ганарова праславіўся сваім талентам, які таксама маляваў мой партрэт і так смутна закончыў сваё жыццё.

Пасярод той зімы неспадзявана да Фларэнцыі завітаў госць — быў гэта генерал Касцюшка. Даверыў ён мне вайсковыя задумы пра рэвалюцыю і вызваленне ад маскоўскага ярма.

— Узважылі справу, — дадаў ён, — бачу я: недаспела яшчэ, хочуць, каб я стаў за начальніка, але пакуль не бачу, з чаго пачаць і як утрымацца. Не хацеў бы ні краіне, ні сабе даваць спакусы на лютасць для яшчэ большага няшчасця.

Толькі два дні ён забавіўся ў Фларэнцыі і выехаў да Рыма. З Рыма з тымі ж думкамі напісаў да мяне ліст, я адпісаў яму, што цалкам яго розуму і грамадзянскасці давяраюся і калі хвіліна гэтая прыйдзе, буду гатовы да яго загадаў.

Неяк раз вечарам сядзеў у сябе пры лямпе і чытаў гісторыю Фларэнцыі Макіявелі, чую, адчыняюцца дзверы і гэтыя вось словы па-польску:

— Слава Езусу Хрысту!.. Як справы, братка?

Здзіўлены, гляджу пільней і пазнаю Ельскага, быў то наш ліцвін, калега мой на сейме. Абняліся мы сардэчна. Быў ён пасланы руплівымі паўстанцамі, каб Касцюшку прыспешыць да вяртання на радзіму.

— Што ты тут робіш? Прыехаў па вас, па Касцюшку і цябе, рыхтуемся да рэвалюцыі.

Тут я запытаўся пра гэтыя прыгатаванні, пра колькасць войска, грашовыя запасы, пра народны дух, даведаўся пра тое, што і ў Заёнчака больш было запалу, чым фактычнай падрыхтоўкі, і надзеі, каб уся справа ўдалася. Не настройваючы супраць сябе тых, хто старанна рыхтаваўся, а, наадварот, я запэўніў Ельскага, што па першай позве народнай улады паспяшаюся найахвотней да радзімы.

— Дайце мне знаць, — дадаў я, — як толькі гэтая справа будзе пачынацца, паспяшаюся як мага раней.

Папярэдзіў Касцюшку аб прыбыцці Ельскага. Адпісаў яму, што яшчэ мне здаецца, што справу можна распачынаць, але калі паедзе ён да Лейпцыга, каб зблізку лепш пра ўсё даведацца, што там робіцца ў нашым краі і адтуль ужо, не марудзячы, мне няхай усё паведаміць.

У хуткім часе прыехаў генерал Касцюшка і перадаў мне весткі, якія атрымаў з краю і з Лейпцыга, паведаміўшы мне, што на такіх нязначных, як дасюль, падставах немагчыма будаваць такую вялікую справу; гэта сумна было б вельмі — лёгка і неабдумана пачаць, каб затым упасці. Касцюшка, наведаўшы Рым і Неапаль, паехаў да Ламбардыі. Я захацеў быць сведкам урачыстасцей і абрадаў Вялікага Тыдня ў Рыме. Прагнучы пабачыць касцёльныя цырымоніі, паехаў да гэтай сталіцы. Ехаў у Рым з кніжкаю Лівія ў руцэ па дарозе, якой Ганібал цягнуўся заваёўваць Рым, спыняўся на кожным месцы, суадносячы становішча месца з апісаннем рымскай хронікі. У Рыме атрымаў лісты з Польшчы толькі са спачуваннем пра кіраванне маскалёў, ні адзінай, нават у скрытных словах, надзеі на адмены не ўпаміналася. Лісты ад маршалка Патоцкага толькі здалёк рабілі намёкі пра патрэбу збліжэння. Пасля сканчэння, такім чынам, касцёльных цырымоній задумаў Рым пакінуць і, не затрымліваючыся нідзе, паспяшацца да Вены і да Польшчы.

У Рыме застаў у вялікай колькасці палякаў: князя Станіслава Панятоўскага, які там ужо асеў некалькі гадоў таму, падканцлера Храптовіча, Адама Валеўскага з жонкаю, пані Радзішэўскую, Сабалеўскага Валянціна, Стася Грабоўскага (пазашлюбны сын караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага), якога кароль жадаў абавязкова бачыць духоўнікам, але той уздрыгваў ад адной думкі стаць ксяндзом, і шмат іншых землякоў.

Не апісваю вядомых усім абрадаў Ватыкана на Вялікім Тыдні, усе яны вялікапышныя і чуллівыя, але як жа быў я абураны, пабачыўшы, як чыстая рэлігія Хрыстоса была зняважана свецкім выглядам яго слуг. Празмерна чыняць хрысціянскія павіннасці тым, хто прыйшоў да споведзі, да польскага penitencjariusza; экс-езуіт з лагоднасцю слухаў мае прызнанні, але калі я паведаў, што праклінаў не раз маскоўскую царыцу і таргавічан,

толькі цяпер пачаў мяне сурова дакараць, і не грахом праклёну, а асобай, на якую я накінуўся.

— Вы не бачыце, — сказаў ён, — што вялікая гэтая манархіня адзіная з усіх еўрапейскіх валадароў, якая ордэну езуітаў дала прытулак і падтрымку. Не сумнявайцеся ў тым, што да забраных сёння ваяводстваў манархіню прывёў наш ордэн.

Павінен жа быў узыходзіць я да дыспуту на споведзі, але змоўк, падумаўшы пра сябе, што справядлівасць, што чалавечнасць, што любоў і міласэрднасць над айчынай былі нічым, а ўсім з'яўляецца распаўсюджанасць і магутнасць таго сапраўды небяспечнага ордэна езуітаў.

Як звычайна, у гэтую пару мноства чужаземцаў, асабліва англічан, напаўнялі Рым. Знаходзіўся сярод іх князь Аўгуст дэ Сасэкс, каралевіч англійскі: малады, прыстойны, вясёлы. Быў ён жанаты на лэдзі Віргініі Мюрэй і меў ад яе сына, аднак парламент шлюб гэты, які супярэчыў каралеўскаму праву, пазней скасаваў. Праўда, у той час каралевіч быў такі шчаслівы і вясёлы, як мы былі хмурымі. Становішча няшчасных палякаў выклікала саладкаватую прыхільнасць ва ўсіх добрасумленных сэрцах. Князь Аўгуст шукаў з намі знаёмства, нават дружалюбнасці. Запрашаў ён нас часта да сябе на абеды. Пражываў у al Corso, у месцы, дзе знаходзілася магіла рымскага імператара Аўгуста. Кранутыя справай гонару і жадаючы адказаць на такую ветлівасць, вырашылі палякі злажыцца па пяць дукатаў і даць князю банкет па-польску. Выбралі дом для гэтай мэты alla Piazza di Spagna, Адам Валеўскі меў з сабою кухара паляка, аб'ядналі яго з італьянцамі. Былі — наколькі памятаю — упамянуты Валеўскі з жонкаю, княгіня Мацеёва Радзівілава, Хадкевічава, пані Радзішэўская, Сабалеўскі Валянцін, стараста варшаўскі, Храбтовіч і шмат іншых. Паміж італьянскімі і французскімі стравамі былі і польскія, а паміж гэтымі — зразы. Стравы польскія, асабліва зразы, каралевічу, які прыбыў на банкет з графіняю Мунстэр і шмат яшчэ з якімі англічанамі, вельмі падабаліся, праўда, замест зразаў іменаваў іх *Esterhazy*, што выклікала вялікі смех, забылі на гэты момант пра сваю бяду і гнятлівы наш смутак. Штораз, то лепш госці ўздымалі келіхі, прыпаміналі мы сабе Таргавіцу, ганебнае насілле маскоўскае, сарамлівую слабасць караля, адтуль нараканні і яго праклінанне. Хутка польскі банкет перайшоў у англійскі: пачалі госці жадаць здароўя каралевічу і ўсе правы даваць яму за поспехі і адраджэнне Польшчы. Віно і словы ўдзячнасці расчулілі ўсіх да слёз, нарэшце, Адам Валеўскі з вялікім келіхам у руцэ ўнёс прапанову аб дэтранізацыі Станіслава Аўгуста і выкрыкнуў выбраць польскім каралём князя Аўгуста дэ Сасэкса і, упаўшы на калені, прысягнуў яму на вернасць. Гэта радасна паўтарылі ўсе:

— Віват Аўгуст IV, кароль польскі!

І зараз жа ўсе рушылі да яго і, стоячы на каленях, прысягнулі яму на вернасць. Калі б гэтая прысяга, выкананая на падпітку, адбылася на цвярозы розум, калі б Англія аб'яднала свае намаганні з неахвотнаю да Масквы Аўстрыяй і польскай справе энергічна адважылася б дапамагчы, можа быць тады мы пад Аўгустам IV яшчэ раз годна расквітнелі б. Але англійскі кабінет нічога найперш не робіць без карысці для сябе: колькі пэўнага працэнта прынясе Англіі яе палітычны ўчынак. Надта ўсе дзяржавы ўсхваляваны жахам распаўсюджвання французскай рэвалюцыі, да яе прыкавана ўся ўвага і сілы, а няшчасную Польшчу пакінулі ў кіпцюрах Кацярыны. Паўторна, такім чынам, Францыя стала прычынаю нашай згубы: у 1773 г. з-за жанчынападобнай вяласці Людовіка XV, сёння праз увагу тых, якія нас маглі абараніць.

У 1831 г., калі я быў высланы да Лондана і наведаў князя дэ Сасэкса, паведаў ён мне:

— Вы ж выбралі мяне каралём тады і не дарэмна, таму што некалькі гадоў пазней, калі я быў у Берліне і аглядаў тамашні скарбец, надзелі мне на галаву карону аднаго з вашых каралёў. Была гэтая карона забраная з іншымі каралеўскімі рэгаліямі ў 1794 г. у час кароткага знаходжання прусакоў у Кракаве.

Агледзеў яшчэ раз на развітанне старажытнасці Рыма, але наймілейшы мой шпацыр быў вечарам, калі пры бляску месяца я выйшаў да Калізея і там, сеўшы на камень, што ўпаў са сцяны, паглыбіўся ў разважанні. Тады паўсталі перад маімі вачыма цудоўныя дзеянні гіганцкага рымскага люду. Куды дзелася магутнасць яго, дзе столькі імператараў, герояў, столькі пакаленняў, што калісь усё жыццё назіралі за пышнымі гульнямі ў гэтым месцы? Ад столькіх пакаленняў, ад столькіх мільёнаў жывых істотаў не засталося сёння і пылу. Якая мізэрная рэч ёсць чалавек, як поўны ён, аднак, пыхі і надзеі, пакуль рухаецца. Не раз лагодзілі разважанні мае падабрэлыя галасы італьянцаў і немцаў, якія прыходзілі да гэтага месца спяваць найлепшыя ўрыўкі з твораў сваіх кампазітараў. Якімі прыемнымі пачуццямі напаўнялася на гэты час маё сэрца, як лёгка пераносілася думка мая ўраз у даўно мінулыя часы і зноў вярталася ў нязнаную будучыню.

— І гэта пройдзе! — суцяшаў я сам сябе.

Ужо меўся за два дні выязджаць, калі, выходзячы ад слаўнага разьбяра Цановы, поўны захаплення ад яго боскіх твораў, сустрэў знячэўку знаёмага паляка-бернардзінца:

— Вялікую маю вестку паведаміць пану...

Гэта здарылася ў хуткім часе пасля Вялікадня. Ён мне паведаміў, што атрымаў ліст з Кракава ад сваіх айцоў святых, у якім яму пішуць, што ў гэтай старажытнай сталіцы абвешчана пра паўстанне народа пад

кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі. Што таксама ён ужо выйшаў супраць маскалёў і пад Рацлавіцамі разбіў іхняга правадыра Тармасава, забраў дзесяць гармат, што вязняў маскоўскіх поўна ў Кракаве. Перапынілася дыханне маё, жывая кроў праступіла на твары на такую шчаслівую вестку. Паспяшаўся, што найхутчэй, да сябе, па дарозе спаткаўся з землякамі, якія мне пацвердзілі тое ж самае данясенне, дадаўшы, што ўвесь край у хваляванні. Досыць таго было для мяне, каб ураз свае манаткі ўкласці і пусціцца ў дарогу. Чым спешней рухаўся наперад, тым часцей да мяне даходзілі весткі з радзімы.

На дзень толькі затрымаўся ў Вене, каб пабачыць князя Чартарыйскага, генерала зямель падольскіх, даведаўся з жалем, што спадар гэты, адзін з найзаможнейшых у дзяржаве (хто б паверыў?) знаходзіцца цяпер у патрэбе, таму што царыца Кацярына засеквестравала ўсю яго маёмасць. Пісар Ржэвуцкі, які меў у яго 30 000 дукатаў даходу, сурова яго падагнаў да аддання гэтай маёмасці. Шчыра засмуціўшыся ад такога становішча князя, якому быў так удзячны, пакінуў у Скаўронскага, яго сакратара, 300 чырвоных злотых на першыя патрэбы і, забраўшы з сабою афіцэра артылерыі Схегміча, пусціўся да Кракава.



## Паўстанне

Застаў я Кракаў у ваенным руху, але і ў смутку таксама. Палкоўнік касінераў Крупінскі, ранены пад Шчакацінамі, паведаміў мне пра нашае паражэнне там ад аб'яднаных маскоўскіх і прускіх войскаў пад камандаю Дзянісава і прускага караля.

Тут месца якраз паведаміць пра пачатак і выбух нашага паўстання. Апішу гэта коратка аж да хвіліны, калі я злучыўся з Касцюшкам. Да цяжкай агрэсіі і нашых страт. Да прыдання на Гародненскім сейме знявагі і насілля, якія пацягнулі да роспачы развярэджаны польскі народ. У застаўшымся яшчэ кавалку польскай зямлі не пераставалі маскалі рабіць тысячы насілляў і прыгнятанняў — Ігельстром панаваў усемагутна ў Варшаве. Польская моладзь, адчуўшы ў час Чатырохгадовага сейма смак незалежнасці, жыва адчувала путы і абразы. Мяшчане, пакаштаваўшы таксама нададзеных ім свабод, не маглі знесці іх страты. Памяншэнне войска, аддаленне ад службы афіцэраў, большасць з якіх, апрача платы за свае ступені, не мелі іншага спосабу свайго ўтрымання, прыводзіла да роспачы і вайскоўцаў.

— На што маем азірацца, — гаварыла гарачая з роспачы моладзь, — суайчыннікі нашы ўжо страцілі імя палякаў яшчэ пад агульным скіпетрам, і гэтая частка спадчыны Пястаў, што засталася, пасля смерці Станіслава Аўгуста, з рэшты пойдзе на здабычу змоўленых суседзяў, нічога больш да страчвання не маем. У энергічным парыве трэба ўзяцца за зброю, пры

падтрымцы, можа, праз незаахвочаную пасля апошняга падзелу Аўстрыю, можа быць, праз трыумфуючую Францыю, за крыўды адпомсціць, страты вярнуць, а, прынамсі, сораму пазбегнуць і са зброяй у руках на магіле айчыны маглі б загінуць.

Так нецярпліва выказвала непраслаўленая, што прагнула справядлівай помсты, наша моладзь свае пачуцці. І чым больш павялічваліся пераследаванні і прыгнёт маскалёў, тым больш павялічвалася прага вызвалення ад іх. Адзіныя пачуцці, адзінае полымя любові да радзімы ахапілі сэрцы ўсіх. Не дзіва, што з такімі схільнасцямі, у такім стане рэчаў узнік у Варшаве тайны саюз моладзі, мяшчан і вайскоўцаў. Дзіўна другое, як гэта прайшло міма прыроджанай падазронасці маскалёў — начныя супольніцкія спатканні, што засталося ўсё гэта ім невядома. Прыпісаць гэтае належыць, з аднаго боку, вернасці нашых грамадзян у захаванні таямніцы, з другога — палкаму каханню Сіверса, пасла маскоўскага, да Залускай, а Ігельстрома, правадыра маскоўскіх войск, да пані Духеснай. Як бы там ні было, варшаўскі саюз пачаў дамаўляцца з вайскоўцамі ў правінцыях, высылаць пасланцоў сваіх да выгнаннікаў у Лейпцыг, менавіта, да маршалка Патоцкага, Калантая і Касцюшкі. У той жа час Заёнчак, які разам са сваім генеральскім рангам страціў усялякія сродкі да існавання і ў Вене ўтрымліваўся адзіна шчодрасцю князя Чартарыйскага, генерала зямель падольскіх, дык вось Заёнчак апавядаў:

— Калі даведаўся пра гэты рух, найперш падаўся да Лейпцыга, адтуль, пераканаўшы Патоцкага і Калантая, пераапрануты, паспяшаўся да Варшавы. Аж да самай граніцы мяне праводзіў Касцюшка, які з нецярпеннем застаўся там чакаць маіх данясенняў, якімі б я яго, заехаўшы на месца, павінен быў надзяліць: пра сродкі паўстанцаў, пра іх падрыхтоўку да такой вялікай справы.

Не былі ў той час вуліцы Варшавы так асветленыя, як сёння, не былі таксама яшчэ палякі ў маральнасці сваёй так сапсаваныя, каб, як сёння, за землякамі сваімі шпіёніць, самі маскалі здзяйснялі подлае тое рамяство, а апусканні іх у п'янства і распусту менш за ўсё рабілі іх да гэтага асцярожнымі. Дзесяць дзён без найменшай падазронасці ў маскалёў заставаўся Заёнчак у Варшаве, штоноч сустракаючыся з арганізатарамі змовы. Яшчэ раней абраным кіраўніком паўстання заставаўся Касцюшка. Яго мужныя спатканні з ганцамі адбываліся пад імем Дубінка, якое сабе ён выбраў, калі быў яшчэ на службе ў Злучаных Штатах Амерыкі. Яго сціпласць, памяркоўнасць, не менш, можа, як і тое, што не надта вылучаўся сваім знатным паходжаннем, невялікім маёнткам, чым не абражаў роўных, як і не ўзбуджаў зайздрасці ў вышэйшых, учынялі тое, што ён усеагульна з'яднаў жаданні і галасы.

Прыйшоўшы да асэнсавання ўсяго нашага становішча, Заёнчак паслаў даверанага з данясеннем да Касцюшкі, што сябры таварыства паўстанцаў палымнеюць найвышэйшай стараннасцю, занадта нават схопліваюцца, што магчымасці іх абмежаваны, што люд звычайны зусім быў не падрыхтаваны да паўстання, што ўся надзея на тое, калі дзе-небудзь справа пачнецца і нянавісць супраць Масквы ўсіх запаліць.

— Паўстанцы, — пісаў ён далей, — да гэтага часу не маюць аніякага вырашанага плана, уся іх вера ў правадыра, якога выбралі. Маюць стасункі толькі з жыхарамі правінцый, якія знаходзяцца недалёка ад войска. Мадалінскі і Дзялынскі абяцаюць надаць увесь корпус артылерыі, калі пачнецца паўстанне, палаюць найлепшым да гэтага духам; у войсках, падпарадкаваных маскалям, трымацца патрэбна толькі тых, дзе знаходзяцца надзейныя палякі. З тым усім, у прысутнасці паўсюдна шматлікіх маскоўскіх палкоў не выходзіць амаль думаць пачынаць паўстанне, але з тым усім, калі энергічная падрыхтоўка будзе прыстасавана да гэтага, калі атрымаем адкуль-небудзь стойкую дапамогу грашыма, тады можна будзе па вясне задаць маскалям цяжкага клопату.

Заёнчак, пакідаючы Варшаву, рэкамендаваў арганізатарам змовы найвышэйшую асцярожнасць, таемна прыстасавацца да справы распаўсюджання паспалітага духу сярод сялян, запэўніць падтрымку нашых палкоў, узятых на маскоўскую службу. Гарачая, нецярплівая наша моладзь менш адчувала веліч распачатай справы і небяспеку, многія перашкоды і нашы недахопы ўспрымала дрэнна, як і параду прадбачлівасці будучых падзей. Брыгадзір Мадалінскі выказваўся, каб устрымацца ад выступлення датуль, пакуль не прыйдуць разбіраць яго брыгаду.

Такія вось весткі прывёз Заёнчак Касцюшку. Той жа ў час прабывання Заёнчака ў Варшаве сакрэтна меў з генералам Вадзіцкім размову. Не пазбегла гэтая размова ўвагі маскоўскага палкоўніка Лыкошына, які стаяў у Кракаве. У размове з Касцюшкам Вадзіцкі заўважыў, што маскаль здагадваецца аб чымсьці, і парадзіў Касцюшку, каб ён чым хутчэй аддаліўся ад мяжы з Польшчай. Касцюшка гэтым крокам збянтэжыць падазронасць маскалёў і дасць час даспець нашай падрыхтоўцы да вайны. Згодны з гэтым, Касцюшка падаўся да Італіі, указаўшы Заёнчаку вярнуцца зноў у Варшаву, каб там стрымліваць нецярплівасць паўстанцаў і рыхтаваць усё, што датычыць справы, якая мае пачацца.

Цяжкім і небяспечным падалося Заёнчаку гэтае прадпісанне Касцюшкі, таму што паўстанцы, штораз памнажаючы сваю колькасць, штораз больш пашыралі і сваю таямніцу: юнак давяраў юнаку, мешчанін — мешчаніну, вышэйшы вайсковец — ніжэйшым афіцэрам, афіцэры — салдатам. Нішто больш у той час для палякаў не прынесла такой вартасці, як тое, што ў такой вялікай колькасці не знайшлося ніводнага ні даносчыка, ні здрадніка.

Яўны довад таго, якім чыстым духам грамадзянскасці і гонару палалі ўсе, як горача і ўсеагульна ненавідзелі маскалёў. Ужо сёння ў падобным выпадку падобная таямніца не змагла б утрымацца. Заёнчак, такім чынам, узважыўшы сваю небяспечнасць знаходжання ў Варшаве, палічыў за лепшае ад'ехаць у Лейпцыг і там з маршалкам Патоцкім і Калантаем параіцца наконт пачатку паўстання.

Як толькі ўжо менш заставалася да той палахлівай надзеі спелых межаў паўстання, грамадскасць з трывожнасцю задумалася над нашым сапраўдным становішчам. Якім жа невыказна крытычным было гэтае становішча! Сам запал моладзі, непадзелены з масай люду, здаўна абражанай, нешматлікія вайсковыя сілы, скупыя, амаль ніякія грашовыя запасы, ніяк не маглі абяцаць перамогу над шматлікімі, ва ўсім дастатку, маскоўскімі сіламі. Самыя тыя годныя мужы да задуманай справы ўкрываліся ад пераследавання ў Лейпцыгу, агаленыя Таргавіцаю ад сваіх маёнткаў і ўлады, у апошняй знаходзіліся патрэбе ў дзяржаве. Змоўленыя прусы і Масква, занятыя сваімі справамі Францыя і Аўстрыя, — у халоднай абыякавасці да нашага лёсу маўчала ўся Еўропа. Францыя нават справу нашу лічыла справай арыстакратычнай, занадта сама занятая рэвалюцыяй, занадта ад нас далёкая, ніякай надзеі нам на дапамогу не выказвала.

У гэтым становішчы пакутлівага неспакою і заставаліся палякі. Штораз павялічаныя пераследаванні і ўжо пайменны загад згортвання польскага войска нават у Варшаве прывёў грамадскую думку да апошняй роспачы. Вайсковая і цывільная моладзь, не бачачы ніякіх вынікаў, палаючы толькі помстай, без ніякай падрыхтоўкі, гатова была схапіцца першай. Згортванне войска паскорыла хвіліну выбуху. Паслалі паўстанцы Ельскага да Касцюшкі з просьбай, каб ён як найхутчэй паспяшаўся да краю, павялічваючы насуперак рэальнай сітуацыі ўзровень падрыхтоўкі і свае магчымасці.

Першым развярнуў харугву паўстання Мадалінскі! Бо калі дайшоў да яго маскоўскі загад, каб ён распусціў сваю брыгаду, якая стаяла ў Пуўтуску, ён загадаў неадкладна свайму рыцарству — сямсот чалавек — сесці на коней, паведаміўшы ім усім, як было б ганебна для польскага рыцарства баязліва і нікчэмна скласці сваю зброю.

— Выкарыстаем, — выгукнуў ён, — яшчэ раз сваю зброю, купаючы яе ў маскоўскіх і прускіх карках.

Апавядаюць, што, пераправіўшыся праз Віслу, ён уступіў у прускія граніцы свайго забранага краю, захапіў і пазносіў вартавыя прускія каманды, якія стаялі ўздоўж новай мяжы, знёс іх усе, пазабіраў касы і, мінуючы Варшаву, паспяшаўся да граніц Галіцыі, набліжаючыся да Кракава. Яго намерам было дапамагчы паўстанню гэтага ваяводства і чакаць

там Касцюшку, а ў нешчаслівым выпадку — перайсці са сваёй брыгадаю ў Галіцыю і пастуціць на аўстрыйскую службу. Маскалі, усумніўшыся, што могуць утрымацца ў Кракаве, пакінулі горад.

Уласна кажучы, Касцюшка вярнуўся ў гэты час з Італіі да Дрэздэна, дзе яго і дагнала вестка пра сутычку Мадалінскага з прусамі. Неадкладна адправіўся ён у Кракаў. Усе жыхары кракаўскага ваяводства: шляхта, мяшчанства, просты люд, войскі — горача палалі нянавісцю да маскалёў і таму лепш былі падрыхтаваныя да паўстання, чым у іншых частках Польшчы. Супраць пяцісот маскалёў, што стаялі ў Кракаве, асада наша складалася з чатырохсот. Дык вось, з дапамогаю жыхароў яны маглі б быць разброенымі і забранымі, калі б разумна гэта было зроблена і хутка, але гадзіны, дадзенай на роздум маскалям, якія прадчувалі, куды ўсё гэта занясе, было дастаткова, каб пакінуць ім горад.

Усяго праз некалькі гадзін пасля выйсця маскалёў з Кракава, паказаўся Касцюшка, акружыў яго з усіх бакоў народ, вітаючы крыкамі і слязамі радасці. **24 сакавіка 1794 г. быў абвешчаны гэты муж найвышэйшым правадыром войска, Начальнікам усяго паўстання з дыктатарскаю ўладай аж да сканчэння вайны**, гэта значыла, да вызвалення краю ад маскоўскай няволі. Люд і войска прысягнулі яму на паслушэнства, а сам ён прысягнуў народу на вернасць. Мой Божа! Што за перспектывы! Жменька зняволенага люду, слабая, пакінутая ўсімі, якая не мае надзеі больш, як толькі на Бога, прысягнуўшы свайму Богу, прысягнуўшы ў сталіцы старадаўняй сваёй раскошы, поруч з прахам сваіх каралёў, што хоча памерці альбо жыць незалежна. О, вялікі Божа, чаму ж ты не выслухаў нашых просьбаў?

Зачытаны на рынку Кракаўскі акт паўстання з высакароднай прастатой выказваў прычыны нашага паўстання. Касцюшка, разаслаўшы ўніверсалы па ваяводствах, пастанаўляе аб стварэнні ваяводскіх камісій, вяртае гарадам забраныя Таргавіцай прывілеі, а даведаўшыся, што Мадалінскі, пераследаваны сямю тысячамі маскалёў, набліжаецца да Кракава, ведаючы, якімі шкоднымі былі нам зацягванні, пастанавіў даць бой і, не трацячы часу, з палком пяхоты Вадзінскага 1 красавіка выйшаў з Кракава. Хутка з ім злучыліся Мадалінскі і Мангет. Сілы Касцюшкі складаліся з кракаўскага апалчэння, з чатырох батальёнаў пяхоты, аднаго палка конніцы пад камандай генерала Мангета і дванаццаці гармат. Спяшаючыся са свайго наступальнага паходу, як ужо гаварылася, прыцягнуўся і Мадалінскі. Малое гэтае войска складалася з 3000 пехацінцаў і 1500 коннікаў. У Канюшы далучылася да Касцюшкі 300 сялян толькі з косамі. За некалькі міляў адсюль стаў маскоўскі корпус пад кіраўніцтвам Тармасава і Дзянісава-казака. Страціўшы адзін дзень на тое, каб падпарадкаваць гэтае малое войска, Касцюшка выцягнуўся пад Рацлавіцы. Пад Рацлавіцамі

паказаліся непрыяцельскія заставы, а ў хуткім часе і само войска Тармасава ў вельмі добрым становішчы на ўзгорках, размешчаных паміж ярамі. Маскалі першыя спусціліся ў даліну, падзяліўшыся на тры калоны. Касцюшка, які вырашыў перамагчы, тры разы стрымлівае наступаючых і дае ім стойкі адпор. Перастаўшы, нарэшце, страляць, Касцюшка становіцца на чале толькі ўчора прыбыўшых з косамі сялян і аднаго батальёна пяхоты, уломваецца ў сярэдзіну маскоўскага войска, адбірае іх пазіцыю. Паварочвае зноў на правую калону, у той час, як Заёнчак і Мадалінскі ўдарылі па левай — усе пачалі ўцякаць перад напорыстасцю палякаў. Смеласць, жаданне помсты, палкасць пераможа і перавагу сіл, і пераважнасць пазіцыі. Перамога абвіла вянком сваім іх акрываўленыя чолы. Вораг ушчэнт быў разбіты, здабыта 12 яго гармат, мноства забралі палоннікаў. Перамога адбылася 4 красавіка 1794 г.

Гэтая перамога над праціўнікам, што больш чым удвая перавышаў сілы паўстанцаў, да таго ж звыклым да бою, даводзіць, што можа смеласць і прыклад правадыра: бачылі на чале з Касцюшкам сялян толькі з косамі ў руках, зламалі бронзу, што атакавала, вывергнулі агнявыя кулі шчыльнага войска маскалёў. Чаго ж не даказаць было гэтага ў 1792 г. Станіславу Аўгусту, калі б валодаў падобнай смеласцю, калі б даў падобны прыклад.

Не магу тут змаўчаць пра адвагу аднаго селяніна, якога звалі Главацкім. Ён наблізіўся да маскоўскай гарматы, калі кананір запальваў ужо яе кнот, агонь ён прыгасіў сваёй шапкай, а потым касою кананіру адцяў галаву. Гэты Главацкі падаўся потым да польскіх легіёнаў і дэманстраваў там цуды храбрасці.

Карыстаючыся начным змрокам, маскалі адышлі, пасля крывавай бітвы малому войску Касцюшкі патрабаваліся і адпачынак, і ўладкаванне. У дадатак Начальнік не ведаў, што робіцца ў сталіцы і па правінцыях, меркаваў, такім чынам, што найлепш з атрыманай перамогі будзе скарыстаць, каб памножыць свае нешматлікія сілы, замяніць ненадзейныя прыстасаванні да бою: затрымаўся таму ў Басутове, за дзве мілі ад Кракава.

Яшчэ перад атрыманай перамогай пад Шчакацінамі маскоўскі палкоўнік Лікошын, вышмыгнуўшы, як мне паведамілі, з Кракава, паспяшаўся да Варшавы і пра паўстанне, якое мелася пачацца ў Кракаве, данёс Ігельстрому. Такім чынам, падвоілася асцярожнасць, больш было схоплена падазроных, схапілі і пасадзілі і Стаса Патоцкага. Закручванне далейшай суровасці Ігельстром адклаў аж да таго, як прыйдзе вестка (калі ж ён на гэта пэўна спадзяваўся) пра перамогу Тармасава над Касцюшкам. Але, калі на яго здзіўленне вестка прыйшла супраціўная, заёрзаўся ў немалым клопаце. Не хацеў ён агаляць злоснай супраць яго сталіцы, не захацеў нават паслаць дывізіі з Любліна, каб і там не распачалося паўстанне, ад-

нак пачаў пазней варушыцца, сам да перасільвання здрады — як звыкла ў маскалёў — рыхтавацца.

Вестка, што Касцюшка паказаўся ў краіне, вестка пра ягоную перамогу, выклікала ў палякаў шмат радасці і добрай надзеі, столькі ж напоўніла маскоўскага каменданта ў Варшаве Ігельстрома бояззю і трывожнасцю, павялічыла яго засцярогу і сродкі суровасці: арыштоўваў, выганяў, задумаў раззброіць польскае войска. Гэтыя суровыя крокі павялічвалі раздражненне, прыспешвалі да пачатку справы вызвалення. Нехк было, што Ігельстром асадзіў усе дарогі, толькі б паведамленне аб паражэнні Тармасава не прыйшло ў Варшаву. Занадта яно было важнае, занадта суцяшальнае было для палякаў, каб добразычлівыя не данеслі яго як найхутчэй, як і калі пачаць паўстанне, моцна пабуджала сэрцы ўсіх біцца. Падвоеная паўсюль варта і маскоўскае віжаванне ўжо не дазвалялі зрабіць і начных сходак, на вуліцах не асмельваліся нават спыніцца, наблізіцца, загаварыць. За шчасце было, калі на вуліцах верныя справе паўстання маглі некалькі слоў паспешна сабе дазволіць: немагчымасць стасункаў паміж сабою стварыла перашкоды для таго, каб скласці план, калі мажліва было б узяцца за справу. Афіцэры артылерыі, што найчасцей палалі любоўю да радзімы, асабліва сярод іх Рох Банашкевіч, таемна, аднак, мелі стасункі з ніжэйшымі афіцэрамі гвардыі і палка Дзялынскага. Капостас, значны варшаўскі купец, і Кілінскі, па прафесіі заможны кравец, смелыя, яны мелі вялікі ўплыў на просты люд, не пераставалі таемна гэты люд узрушваць да таго, каб кінуцца на маскалёў і выправадзіць іх з Варшавы. Такім чынам, быў вызначаны на таемнай радзе дзень 17 красавіка, Вялікі Чацвер, да ўзяцця за зброю. Нічога, аднак, рашучага не было зроблена, калі Кілінскі папярэдне асцярог арганізатараў змовы, што маскалі робяць прыгатаванні, каб авалодаць арсеналам, што намер той павінен быць выкананы напярэдадні Вялікадня, што выстрал з гарматы, які звычайна азначае касцёльную велікодную ютрань, меў быць знакам да штурму арсенала, што маскалі, убраныя ў польскія мундзіры, павінны былі трываць варту ў касцёлах, замкнуць іх і не дапусціць тым самым, каб люд пайшоў на дапамогу польскаму войску, калі маскалі ўдараць па нашым арсенале і казармах. Дадаў да гэтага Кілінскі, што кравец, сусед яго, уласна працаваў над мундзірамі, у якія павінны былі пераапрануцца маскалі.

Складзена было неадкладна, што рэвалюцыя пачнецца ў поўнач 17 красавіка. Да адкрыцця маскалямі змовы нястомнымі былі афіцэры артылерыі ў падрыхтоўцы ўсяго да абароны і да сутычкі. Адно ўдавалася ўтойваць ад вайскоўцаў, навучаючых іх, што павінны тут рабіць іншыя 200 чалавек, якія пераселяцца сюды ўначы, але, не адступаючы ад гэтага ні на крок, гарматы і амуніцыю рыхтавалі да хуткай патрэбы. Усё гэта рабілася сярод ніжэйшага звяна польскіх афіцэраў, не давяралі гэтага старшым

афіцэрам, надта прывязаным да месца сваёй працы і сваёй выгоды. Адзін толькі Гауман, палкоўнік Дзялынскага, быў дапушчаны да таямніцы. Паводле спехам складзенага плана, Кілінскі з атрадам мяшчан, абхітрыўшы пераапранутых маскоўскіх афіцэраў, павінен быў прашмыгнуць да дома Ігельстрома і за сабою прывесці яшчэ больш. У выпадку, калі маскоўская пільнасць не дазволіць таго зрабіць, атрад гэты будзе вымушаны першым пачаць шум, каб 500 іншых паспяшаліся на дапамогу. Аддзяленні пяхоты былі расстаўлены па вуліцах: адныя павінны былі падтрымліваць мяшчан, другія — ударыць па доме Ігельстрома.

Усё, што толькі залежыла ад артылерыі, было гатова да прызначанай гадзіны, менавіта — на поўнач 17 красавіка. Гарматы і амуніцыя былі прыгатаваны да выкарыстання, дзе б яны ні спатрэбіліся, але толькі Кілінскі штосьці спазняўся з прыводам сваіх прыяцеляў. Не цяжка ўявіць сабе страшэнную трывожнасць саюзнікаў. Застаў іх золак у тым прыгнечаным становішчы. У гэты ж момант, праязджаючы праз горад, патруль каралеўскіх уланаў заўважыў афіцэра, які паспешна гнаўся да казармаў для аб'язных коней, што выклікала падазронасць. Дык вось! Стрэлілі яны па маскалю. Але выпадковы гэты стрэл быў прыняты за знак рухацца. Ніжэйшыя афіцэры гвардыі, прытрымліваючыся ўказанняў сваіх начальнікаў, загадалі салдатам узяць ружжо на плячо і накіраваліся ў прызначанае кожнаму месца. Артылерыя расставіла гарматы па найважнейшых напрамках і адкрывала агонь па кожным маскоўскім атрадзе, які толькі паяўляўся. Варта Ігельстрома складалася толькі з аднаго батальёна пяхоты і чатырох атрадаў, якія размяшчаліся ў праходах, што вялі да яго дома. Пражываў ён на рагу вуліц Мядовай і Капітульнай, амаль насупраць капуцынаў, у доме Залускіх. Неўзабаве гэты батальён, па якім з усіх бакоў стралялі польскія паўстанцы, сышоў з месца і замкнуўся ў доме Ігельстрома. Маскалі ўстанавілі свае гарматы ў вокнах дома свайго правадыра і ўпарта бараніліся.

У той дзень ад самага світанку можна было пабачыць з усіх бакоў люд, які збіраўся натоўпамі. Ціхоцкі, камандзір нашай артылерыі, які здолеў здабыць вернасць Ігельстрома і адвярнуў яго ад адабрання нашага арсенала, адчуў сэрца паляка, якое б'ецца ў ім, і той арсенал адчыніў для простых людзей. Узброены люд рушыў на маскалёў. Пачалася жудасная бітва, страляніна на вуліцах, у вокнах паяўлялася нават нямала жанчын. З усіх бакоў неслася магутная кананада, ва ўсім горадзе — бязладнасць, лютасць альбо страх. Выбягалі з дамоў людзі з розным узбраеннем, перажываючы адначасова адвагу і страх, але і гэтыя разбройвалі яшчэ сонных маскалёў, вязалі іх і замыкалі ў падвалах. Кожны, хто выходзіў з дома Ігельстрома, быў забіты альбо ўзяты ў палон. Стралкоўскі, капітан, які нёс варту на

Каралеўскім замку, надумаў пакінуць гэты замак — Станіслаў Аўгуст выбег за ім і ўпрошваў яго не пакідаць замак.

— Найяснейшы пан, — вымавіў малайцаваты малады чалавек. — Ваша каралеўская мосць знаходзіцца ў бяспецы, але айчына ў небяспецы, выканаўшы маю павіннасць, я вярнуся ў замак.

Ахвотны вокрык салдата пацвердзіў пачуцці свайго камандзіра, і Стралкоўскі паляцеў туды, дзе кіпела бітва.

Не менш крывавай і ўпартай адбылася сутычка каля аб'язных казармаў. Палкоўнік Гауман вёў полк Дзялынскага з Кракаўскага прадмесця. Князь Гагарын на чале чатырох батальёнаў маскалёў заступіў яму дарогу. Доўга агнём з гармат білі па вуліцы, пакуль маёр Ліпніцкі не загадаў свайму батальёну наставіць штыкі: ударыў па маскалях і зламаў абарону. Там палёг Гагарын, яго пасеклі салдаты.

Шматгадзінны крывавы бой, пастаянны гул гармат, відовішча загінуўшых маскоўцаў на вузкіх вуліцах зрабіла смялейшымі сярод разні і смерці нават спакойных мяшчан. Адны беглі на штурм дома Ігельстрома, нават жанчыны, з вокнаў стралялі па маскоўскіх кананірах і тым самым не адзін раз іх гармату прымушалі замаўкаць. Прыгожую пані Далінскую, калі ўжо яна не аднаго палажыла маскаля, дастала ўрэшце маскоўская куля — назаўсёды сваю прыгожую галаву звесіла яна з акна. Маладыя, некаторыя яшчэ зусім дзеці, кадэты выскачылі міма сваіх афіцэраў са свайго Казіміраўскага палаца і змяшаліся з байцамі.

Паспяшаўся на дапамогу сюды з трыма тысячамі маскоўскі генерал Навіцкі з артылерыяй, але хутка аказаўся акружаны простым людам на Саскім дзядзінцы і вымушаны быў пасунуцца з горада назад. Найбольш накіраванымі сілы палкоў былі ў напрамку палаца Ігельстрома на Мядовай вуліцы. Ноч развяла праціўнікаў.

Назаўтра ранкам яшчэ раз пасыпаліся кулі з дома Ігельстрома, але ўжо не паказваліся маскалі, і, як маглі, крадучыся, уцякалі з горада. Вечарам, нарэшце, дом Ігельстрома быў узяты штурмам, сам ён падаўся да палаца Рэчы Паспалітай, які зваўся палацам Красінскіх, дзе хацеў прыняць капітуляцыю. Спрабаваў кароль схіліць народ, каб ён устрымаўся ад бою, дарэмна. Але калі, нібыта, справа з капітуляцыяй Ігельстрома ўжо складвалася, ён, пераапрануты, задворкамі Святаюрскай вуліцы ўцякае з горада да прусаў, якія прыбылі сюды з Сахачова і знаходзіліся непадалёку ад Варшавы.

Крывавае гэтае паўстанне падманам назваць нельга. Маскалі спадзяваліся напасці на арсенал, дзень і ноч трымаліся насцярожана, атрады іх стаялі ўсюды напагатове і налічвалі 10 000 войска супраць 2000 нашых. Пэўна, былі мяшчане, але толькі праз некалькі гадзін пасля пачатку паўстання па неабходнасці пачалі ўмешвацца ў бой. Палягло маскалёў у

той бойні дзве з паловаю тысячы, чатыры тысячы пяцьсот было ўзята ў няволю, захоплена сорак дзве гарматы; шмат генералаў і афіцэраў з жонкамі і двор Ігельстрома трапілі ў няволю. Прусакі пачалі набліжацца да горада, але некалькі выстралаў з гармат адагналі іх далёка.

Просты люд пачаў рабаваць дамы маскалёў, але хутка гэта стрымалі. Забралі архіў маскоўскага пасольства і каля 95 090 чырвоных злотых аддалі ўраз створанаму ўраду, забяспечылі ахоўваю дамы замежных паслоў. Просты люд кінуў вокліч выбраць прэзідэнтам Варшавы любімага ім Ігнацы Закжэўскага, які гэтым урадам займаўся ў 1791 г. Прызваны да паўстання народ ужо 20 красавіка адносіў забраную зброю да арсенала і стаў паслухмяным. Выслалі да Касцюшкі ганца, як і да маршалка Патоцкага і Калантая, якія былі ў Лейпцыгу, з паведамленнем пра вызваленне сталіцы.

Доўга яшчэ Варшава мела паўсюдна сляды тых крывавых баёў, тых гарматных снарадаў, якія неслі смерць. Сапраўды ўсе дамы на Мядовай і Доўгай вуліцах былі прабітыя градам карцечы і пазначаныя шчарбінамі. Ужо цяпер, калі Масква гэты старажытны горад выбеліла нанова, стаў ён як іх Пецярбург, каб толькі ўчарашнія адбіткі шляхетнай польскай роспачы былі знішчаныя.

Ужо ў хуткім часе той шум бою ўгаманіўся, сабраўся магістрат горада, які абвясціў, што гарадскі люд вяртаецца да сваіх прывілеяў, дадзеных яму Канстытуцыяй 3 мая. Была створана Часовая Рада, якая занялася ваеннымі і цывільнымі справамі, пакуль найвышэйшы Начальнік Касцюшка не назначыць найвышэйшай Пастаяннай Рады. Камендантам Варшавы быў прыназначаны Макраноўскі, які яшчэ падчас баёў паўстання атрымаў прыступ жахлівай падагры, хацеў пазбавіцца ад яе, загадаў сабе кроў пусціць, пасля таго ў хуткім часе цяжка захварэў эпілепсіяй, якая яго не адпускала ўжо да смерці.

Такім чынам, яшчэ раз спакусніца-фартуна дазволіла сабе звычайную гульню з палякамі, прываленымі сапраўды магільным каменнем у дзень Божага Уваскрашэння, і на хвіліну паднесла ім новыя надзеі і жыццё. Ніколі свята Вялікадня не было весялейшым, як у той раз. Люд, ахоплены звычайным шчасцем, не задумваўся пра будучыню. Радасным святкаваннем быў ва ўсіх дамах Вялікдзень. Часовая Рада, узначаленая Высаготам Закжэўскім, харунжым познаньскім, даўнім прэзідэнтам сталіцы, не спыняла сваёй працы. Падзялілася яна на аддзелы да ўсіх частак улады, складаючыся ў гронцы сваёй са шматлікіх старанных мяшчан. Вызначаны быў крымінальны суд, загадана было набіраць на службу кожнага восьмага селяніна з дыму, высланыя былі моцныя раз'езды для ачышчэння ваколіц Варшавы ад непрыяцеля. Неадкладна быў зроблены ўлік запасаў жыўнасці, зброі, а таксама людзей і амуніцыі. Пасадзілі ў турму біскупа Касакоўскага, Анквіча, маршалка Рады, Забелу і Ажароўскага, таргавіцкіх

гетманаў. Лёс маскоўскіх палоннікаў забяспечаны быў з усёй чалавечнасцю і прыстойнасцю. Дух грамадзянскасці, здавалася, усіх натхняў. Былі распачаты суровыя захады, каб забяспечыць грамадскі спакой. Загадана было ўсім жыхарам паспяшацца да ўзвядзення валоў вакол Варшавы. Ва ўсіх актах, пазбягаючы ўсялякай з французскай рэвалюцыяй сувязі, узята было тры словы на пячатцы: свабода, цэласнасць і незалежнасць, акрамя слова роўнасць.

Неспакойна было толькі ў Каралеўскім замку. Таму час апавядаць, якім было ж абыходжанне з бедным Станіславам Аўгустам. Адмова ад дэмакратычных зменаў, свежы прыклад бязлітаснай, бяспраўнай смерці Людовіка XVI непакоілі Станіслава Аўгуста і яго сям'ю, уласна іх, урэшце, трывожыла і сумленне. Паслядоўнасць усяго яго панавання, апошняе падпісанне Таргавіцы ўжо аж занадта пераканалі народ у яго палахлівасці, зменлівасці і няздольнасці. Не хацелі шляхетныя палякі адпомсціць яму за столькі сораму і няшчасця. Такім чынам, пакінулі яго ў спакоі, але не дапусцілі да самага меншага ўдзелу ва ўладзе. Як для асобы манаршай паведамлялі яму пра пастановы Рады. Апрача таго, спатрэбілася для задавальнення недаверлівага да яго люду яшчэ і прысутнасць у яго двух мяшчан. Кароль, пані Кракаўская і Падольская, сёстры яго, усялякія ілюзорныя спосабы ўжывалі, каб здабыць прыхільнасць тых мяшчан да сябе. Напалоханыя французскай рэвалюцыяй, яны не ведалі меры ў сваім рабалепстве. Бачылі ў той час за сталом пані Кракаўскай краўцоў і мяснікоў. Упершыню на той час убачылі, як польская веліч і арыстакратыя спусцілася аж да задобрывання гмінных людзей. Пані Кракаўская, каралеўская сястра, якая спалучала ў сабе найвышэйшую павагу з далікатнасцю, ліслівячы важакам люду, запрасіла на абед краўца Кілінскага і мясніка Мараскага. Калі тыя прыбылі, Кілінскі пацалаваў пані Кракаўскай руку, наблізіўся да яе і мяснік, і калі пані Кракаўская працягнула яму руку, звярнуўся ён да яе са словамі:

— Пані, я — мяснік і не маю ніякага дачынення да скуры, я працую з голым мясам, няхай пані зробіць ласку і скіне пальчатку.

Мусіла зрабіць так дастойная матрона, і толькі тады мяснік пацалаваў яе руку. Кароль двух мяшчан заўжды браў да задавальнення сваёй камергерскай службы. Гэты довад павагі да гарадскога становішча, прыроджаная далікатнасць Станіслава Аўгуста так выразна захапіла першых варшаўскіх мяшчан, што да ўпаду гатовы былі яго бараніць.

Але ў цэлым паўстанне Касцюшкі ніколі не перайшло гэтай крайнасці. Абыходзячыся, наадварот, з каралём так, што створаная раней Рада, як ужо гаварылася, пасылала яму штодзённа рапарты пра сваю дзейнасць. Найбольшая чалавечнасць была аказана таксама маскоўскім палоннікам,

асабліва жанчынам. Яны ўтрымліваліся з найбольшымі выгодамі, як гаворыцца, з раскошаю і коштам грамадскім.

Устрымлівалася Часовая Рада ад усякай празмернасці французскай рэвалюцыі, у т. л. і пагарды рэлігіяй. І так, 29 сакавіка была адпраўлена ў святога Яна ўрачыстая памінальная імша за душы загінуўшых у змаганнях сямнаццатага і васямнаццатага дня, і ў прысутнасці ўрада і натоўпу жыхароў Варшавы ксёндз Віташынскі ўзяў за экзарцызм наступныя словы святога Пісання:

— Яны жадалі хутчэй шчыра памерці, чым ярмо насіць і непрыстойную свайму роду цярпець крыўду.

Над катафалкам узнесліся лаўровыя вянкі, сярод якіх быў надпіс: «Душы і целы нашыя аддалі мы за права айчыны, заклікаючы Бога, каб хутчэй зміласцівіўся над нашым народам».

У той жа час атрады нашых войск і валанцёры ачышчалі ваколіцы Варшавы. Адзін з тых атрадаў злавіў ганца Ігельстрома з лістом да ваеннага міністра ў Пецярбургу, паміж іншымі, былі такія там словы: «Рэч Паспалітая ўжо амаль знішчыла ўсю надзею маю, пакладаюся толькі на Бога і дабрыню маёй манархіні. Разважаючы сур'ёзна, трэба з гэтым закончыць перш, чым з туркамі пачнем, кажы ўвесці войскі Салтыкова і Суворава. На прусакоў і аўстрыякаў спадзявацца нельга. Прусакі іншыя ў гэты раз, як былі за Фрыдрыхам Другім, толькі палітыкуюць і ўсяго баяцца: не маюць больш як па дзвесце чалавек у батальёне і па пяцьдзясят у эскадроне. Не маю ніадкуль дапамогі, а ні ад саюзнікаў, а ні ад войскаў манархіні, думай пра мяне і г. д., г. д., г. д.».

Эх, калі б у той разгубленасці Масквы, у тым ваганні прусакоў шляхта села на коней, выставіла згодна рашэння Начальніка кожнага пятага селяніна з касой, былі б мы сёння вольныя, але люд столькі вякоў няволі нічым не трывожаны, шляхта, што за столькі часу страціла ахвоту да афіцэрства, палічылі маскалёў за непераможных, ніколі перамагчы іх не адважыліся б. Далей падзеі гэтага паўстання выявілі, калі былі адважныя душы, то пагарджалі сваім жыццём і недаўгавечнымі пажыткамі, а былі такія (як заўсёды ў падобных здарэннях бывае), якія аддавалі перавагу сабе над любай айчынай.

## У Літве

Вестка пра паўстанне ў Варшаве з хуткасцю сонечнага святла разнеслася па ўсім краі, рассеянае наша войска асмялела злучыцца з таварыствам, што ўжо змагалася. У цывільных больш азірання было на тое, што настане потым. Але рушыла ўсё ж паўстанне па ўсіх паветах, вольных ужо ад маскоўскага салдата, дайшло яно і да Літвы. У Шаўлях жа, на Жмудзі, генерал Несялоўскі, Рамуальд Гедройц, Антоній Прозар, Пётр Завіша,

брыгадзір Сулістроўскі перасілілі толькі што прыбыўшага да іх генерала Хлявінскага, каб ён падтрымаў паўстанне. У Вільні ж стаяў маскоўскі генерал Арсеньеў са значным гарнізонам і штабам. Не было там больш як за чатыры харугвы зменшанага ўжо літоўскага войска, прыдатнага больш толькі для суправаджэння несапраўднага гетмана Касакоўскага. Прыгнятанне, скарачэнне войска, загад Касакоўскага, каб прытрымаць шмат афіцэраў, паскорылі толькі распачаць справу паўстання. Якуб Ясінскі, палкоўнік інжынерыі, асоба мужнага розуму з адважным сэрцам, рэдкіх здольнасцей, так энергічна, спрытна і з вышэйшай воляй склаў змову, што ноччу 23 красавіка аж у чатыры разы большую колькасць, як было саміх, раззброіў і ўзяў у няволю маскоўскіх асоб. Ён напаў са сваімі прыхільнікамі на дамы Арсеньева, каменданта маскоўскага, і Касакоўскага, што ў час Таргавіцы сам сябе абвясціў літоўскім гетманам. З усялякім ушанаваннем права народу абышліся з маскоўскімі палоннымі, у цэлым, запал і помста люду скіраваны былі супраць Сымона Касакоўскага, які, будучы на маскоўскай службе генералам, сам сябе зрабіў літоўскім гетманам. У тую ноч былі пасланы афіцэры да яго дома, каб узяць яго ў пасцелі і пасадзіць у турму. Калі дабраліся да сваёй мэты, Рудзінскі, ад'ютант Касакоўскага, ірвануўся да пісталета, але папярэдзіў яго адзін з афіцэраў і выстралам улажыў на зямлю. Вызначыў вайсковы суд Сымону Касакоўскаму і яго калегу Швыкоўскаму, абодвум за іхнюю здраду, пакаранне смерцю. Назаўтра зранку на рынку асуджаныя закончылі сваё жыццё на шыбеніцы. Былі забраныя ўсе паперы Сымона Касакоўскага, досыць было там тых довадаў, каб яго асудзіць, меў іх копіі (!), але з рэштkай рыштункаў прапалі і яны.

Быў абвешчаны ў Вільні Акт паўстання і выслана дэпутацыя да Начальніка Касцюшкі. Маскоўскі маёр Тучкоў, які стаяў пад Вільняй на Пахулянцы, якога не змаглі атакаваць з-за недахопу сіл, спаліў Пахулянку, і, адступаючы, паліў усе масты па дарозе да Гародні. Ясінскі пусціўся за маскалямі, адцясніў іх пад Немечын і Солы, але мусіў пасунуцца назад, пабачыўшы значныя карпусы войск пад камандаваннем Кнорынгена, Цыцянава, Міхаіла Зубава і Бенінгсена, якія падцягваліся супраць яго. Пашырылася паўстанне на ўсю Літву, але толькі не ад усіх мела падтрымку.

Тым часам наша рыцарства, ужо з забраных Масквой правінцый і пераважна скарочанае і раззброенае, перабіралася са зброяй у руках да свайго таварыства. Прывёў адважны Копаць 600 вершнікаў з-пад Оўруча і Житоміра, Вышкоўскі з-пад Старога Канстанцінава 1200 чалавек, Лазнінскі праз Галіцыю і Мултаны прывялі некалькі соцень. Атрады, якія стаялі ў Холмскім і Люблінскім ваяводствах, выбралі сабе камандзірам, наперакор іншым генералам, якія выклікалі менш даверу, падпалкоўніка Грахоўскага, які калісьці служыў у прускім войску.

У Літве маскалі здолелі спакусіць шмат заслужаных і руплівых грамадзян. Такі лёс спаткаў Солтана, надворнага літоўскага маршалка, Радзішэўскага, пасла на Канстытуцыйны сейм, Міхала Брастоўскага, ксяндза Богуша, брата слаўнага сакратара Барскай канфедэрацыі. Шмат было довадаў ахвяраваць сабой у асобных людзей, нават у прыгожага полу. Прыносілі яны штодзень ахвяры на алтар Айчыны, польскія матроны зносілі свае каштоўныя ўпрыгожанні. Князь Юзаф Панятоўскі, год назад кіруючы цэлым войскам, ахвяраваўся служыць простым салдатам. Казімір Сапега, які нядаўна быў генералам літоўскай артылерыі, ахвяраваў сябе служыць у рангу капітана. Колькі іншых падобных прыкладаў? На жаль! Чаму ж падобны дух не натхніў увесь народ?! Шляхта, прывучаная выкарыстоўваць без перашкод карысць з маёмасці і сваіх сялян, праз сілу рабіла выкананне загаду Начальніка паўстання выслаць кожнага пятага селяніна з касою да войска. Нават вясковы люд, які так доўга быў нявольны, у большасці сваёй не ўяўляў лепшага лёсу, таму нават не разбіраўся ў гэтым і быў абыякавы да паўстання. **Марна Касцюшка сваім універсалам з-пад Паланца 7 мая 1794 г. аб'явіў вясковы люд вольным, забяспечыўшы яму свабоду.** Універсалы тыя альбо не даходзілі да людзей, альбо не знаходзілі веры.

У хуткім часе таксама, як і Касакоўскі, закончылі сваё жыццё затрыманыя ў першыя дні рэвалюцыі першыя здраднікі айчыны. Выпала гэта на дзень 8 мая, калі распачаліся ў Варшаве хваляванні з мэтай вызвалення Анквіча. Люд у бояззі, каб здрадцы не ўцяклі, прыспешыў Крымінальны суд, каб іх судзіў што найхутчэй. Выправадзілі, такім чынам, злачынцаў пад грамадзянскай стражай да ратушы, менавіта: Ажароўскага і Забелу, таргавіцкіх гетманаў, Анквіча, маршалка аднаўленай Пастаяннай Рады, і Касакоўскага, інфлянцкага біскупа. Прад'явілі ім уласнаручныя довады стасункаў іх з Масквою, квіткі на атрыманую імі царову зарплату, якія знайшлі ў паперах Ігельстрома. Кожны з іх асобна быў прызваны да суда, кожны сам і з дапамогаю заступніка бараніўся: абарона гэтая забрала тры гадзіны часу. Аднагалосна ўсе былі прыгавораны да павешання. Трое першых пасля доўгай споведзі атрымалі сваю кару на рынку. Касакоўскі, калі яго павезлі да бернардзінаў, каб зняць з яго капланскае намазанне, крычаў, колькі меў сіл:

— Павесьце ж і караля, таму што ён усялякага зла прычына!

Але атрымаў і ён заслужаную кару. На ўсіх павешаных быў надпіс: «Кара за здраду Айчыне».

25 мая прыбылі ў Варшаву доўгачаканыя Ігнацы Патоцкі, маршалак вялікі літоўскі, і падканцлер Гуго Калантай. Іх, што ахвяравалі сябе Айчыне, іх, як ахвяраў таргавіцкай помсты, з агульнай радасцю і выкрыкамі сустракаў народ. Прыйшоў таксама загад ад Начальніка Касцюшкі аб

арганізацыі Найвышэйшай Рады. Вызначанымі да яе былі Закжэўскі, прэзідэнт, Вавжэцкі, Велавейскі, Мышкоўскі, Суліструўскі, Ігнацы Патоцкі, Яскевіч і Калантай. За іх заступнікаў былі прадстаўнікі шляхты і мяшчан.

Нельга папракнуць ні Начальніка, ні Найвышэйшую Раду, што ў частых сваіх закліках яны не стараліся распаліць народны дух, што магло толькі памножыць народныя сілы і скарб. Вырашана было з апалчэннем, вызначаны быў кожны пяты селянін з дыму, падвоены падаткі, на жаль, усё гэта толькі часткова было здзейснена. У Варшаве больш было напружання, штодзень і часцей добраахвотныя ахвяры зносілі грашыма, абсталяваннем і каштоўнасцямі.

Ёсць час, каб мы вярнуліся да генерала Касцюшкі, які знаходзіўся паблізу Кракава і чакаў сцягвання да яго надзейных вайсковых атрадаў, а таксама і касінераў. Пасля перамогі пад Рацлавіцамі Касцюшка быў надта слабы, каб быць дзейсным супраць Дзянісава, узмоцненага рэштай варшаўскай асады, і ўдарыць па ім, таму прыкладаў усе намаганні, каб свае нешматлікія сілы павялічыць і зрабіць іх здольнымі да бою. Тысячы перашкодаў стрымлівалі яго задумку. Касцюшка цалкам спадзяваўся на ўсеагульнае паўстанне і ўзбраенне сялян, але маскоўскія карпусы, што лёталі паўсюдна, перашкаджалі яму, яны так усюды асадзілі шляхі, што да 25 красавіка Касцюшка нічога не ведаў пра варшаўскае паўстанне. Даходзілі да яго, па праўдзе кажучы, весткі, што Грахоўскі, аб'яднаўшы атрады ў Люблінскім і Холмскім ваяводствах, ідзе на Уладзімір-Валынскі і імкнецца да злучэння з ім, што Копаць з Пінска цягне брыгаду да Дубны.

Маёр Вышкоўскі без ведама свайго палкоўніка ўчыніў смелы крок: з дзесяццю эскадронамі коннікаў рушыў з Падола сярод маскоўскіх войск, пад Старым Канстанцінавам натрапіў на хмары казакаў, знёс іх, забраў сем гармат, касу і пазней злучыўся са сваімі. Брыгадзіры Лажнінскі і Чыжэўскі са сваімі атрадамі, прабіўшыся скрозь маскоўскае войска, забраўшы іх гарматы і абоз, праз Галіцыю і Валашчызну шукалі спосабы абходу навакол, каб злучыцца з Касцюшкам. Было ў той час у інтарэсах Аўстрыі, ашуканай царыцаю, абапірацца, а, прынамсі, не перашкаджаць нашаму паўстанню, але сляпая на гэтае, верная сваім правілам стрымлівання паўсюль вольнасці, яна хапала палякаў, што занадта далёка зайшлі на Букавіне. Што гаварыць: хапала, загадвала шмат каго павесіць, паміж імі і Мельфарда, маёра кароннай гвардыі.

Хоць весткі тыя, што падцягваліся карпусы, падсілкоўвалі надзеі Касцюшкі, але ж праз адлегласць, на якой яны знаходзіліся ад яго, няхутка абяцалі быць здольнымі, менавіта, да зараз чаканай падтрымкі. З цяжкасцю і прамаруджваннем былі сабраны 2 тыс. сялян з косамі. Можна было з імі ўразіць Дзянісава, які, падмацаваны корпусам з Варшавы, у тры

разы перавышаў нашыя сілы? Чакаць, такім чынам, прыходзілася, што мелася падысці падмацаванне, і ўтрэсці «сыры» люд да бою — да гэтага прымушаў той момант.

Недахоп падрыхтаваных афіцэраў быў такі вялікі, што Начальнік, пакідаючы Кракаў, каманду над ім вымушаны быў даручыць Веняўскаму, які не меў іншай перавагі, іншага досведу, як тры гады службы ў галіцыйскай гвардыі ў Вене.

5 мая Начальнік пакінуў сваю пазіцыю пад Басутовам і пацягнуўся да Шкалмежа. Маскалі на ўсім кракаўскім шляху пазабіралі ўсе пажыткі і спалілі ўсе ўладанні. Прыбыў урэшце Касцюшка пад Паланец. Пазіцыя гэтая з аднаго боку прыпіралася да Віслы, з другога — да густога лесу, мела, апрача таго, рэшткі даўніх акопаў і здавалася досыць бяспечнай, каб тут можна было чакаць прыбыцця Грахоўскага. Узмацніў ён свой лагер батарэямі і частаколам, бо ваенная яго пазіцыя давала надзею, што ён зможа доўга яе ўтрымліваць. Прамаруджанне, аднак, у падыходзе чаканай дапамогі, цяжкім засмучэннем абцяжарвала яго душу. Разлічваў ён на шляхетную свядомасць усяго народа, меркаваў, што ў стойкім адчаі мэты паўстання будуць здзейснены. Толькі гэтаму сваё прысвячэнне, толькі гэтая роспач маглі распачатую справу прывесці да шчаслівага канца, наадварот жа, такая велічэзная справа апіралася толькі на колькі сотняў тысяч чалавек, і то толькі часткова і кепска ўзброеных.

Толькі ўладкаваўся Касцюшка, калі паказаліся маскоўцы перад усёй пярэдняй часткаю нашага войска. Двойчы ўтрымалі правае і левае наша крыло, двойчы адагналі іх з найбольшай стратай. Гадзіну конніца іх змагалася з нашай. Маскалі пад кіраўніцтвам Дзянісава штурмавалі па некалькі разоў касцюшкаўскі лагер, заўсёды, аднак, са стратамі ўдавалася адбіцца ад іх. Даходзіла вестка, што падыходзяць прусакі. Яны доўга марудзілі з прычыны перагавораў пра ўзнагароду за аказаную дапамогу. Але хутка Кацярына паабяцала ім, што ўся Польшча застанецца разарванай, і што прусы будуць узнагароджаны шчодрым трафеем. Сам кароль Прусіі на чале шматлікага войска рушыў на нас, каб злучыцца з Дзянісавым.

Штодзень жудаснае зарыва паўставала вакол нас: суровае відовішча пажару пяці альбо шасці палаючых уладанняў. Гэтыя варварскія пажары так распалілі і разгневалі Касцюшку, што ўжо, не чакаючы дапамогі, задумаў ён атакаваць войска Дзянісава, калі атрымаў вестку, што Грахоўскі, пераправіўшыся праз Віслу пад Рахавым, спешным парадкам імкнецца да яго. Пасля яго прыбыцця маскалі, якія ніколі на роўных лічбах не хацелі сутыкацца з намі, карыстаючыся ноччу, зняліся і адыйшлі далёка. Касцюшка, войска якога ў той час налічвала да 15 тыс. жаўнераў і ўзброеных вяскоўцаў, праз некалькі дзён выйшаў на непрыяцеля.

У той жа час атрымаў Касцюшка паведамленне, што маскоўскі генерал Загражскі з 6 тыс. чалавек цягнецца з Валыні і набліжаецца да Холма. Неадкладна выслаў Касцюшка туды Ведэльштэдта з тысячай вершнікаў і такі ж атрад Гаўмана, які стаяў у Радоме. Яны павінны былі злучыцца з валынскім паўстаннем, але неўзабаве, не настойваючы на тым, ён паслаў на Валынь генерала Заёнчака, каб той прывёў усё гэтае войска як агульны начальнік.

Дагнаў нарэшце Касцюшка маскоўцаў пад Шчакацінамі 8 чэрвеня. Пачатак той бітвы быў для палякаў найудалым і шчаслівым: конніца польская перамагла конніцу маскоўскую, здабылі нават восем гармат, ужо пачалі цясніць маскоўскую пяхоту, калі сярод гэтых поспехаў паказаўся неспадзявана на чале дваццацічатырохтысячнага войска і са шматлікімі гарматамі сам кароль прускі, які аб'яднаўся з чатырнаццаццю тысячамі маскоўцаў (*Т. Корзан лічыць, што расійска-прускія сілы складалі 26 500 жаўнераў.— Аўт.*). Тыя зараз жа выдыхнулі агнём і змяшалі наша войска, такой моцнай была перавага. Касцюшка, убачыўшы, якой была перавага ворага, загадаў трубіць на адыход. Мноства гармат прымусіла нашых адступіць і пакінуць поле бою, пакінуўшы некалькі сваіх гармат непрыяцелю. Лес і конніца пад камандаю князя Яўстафія Сангушкі прыкрылі адыход Касцюшкі, але страцілі мы храбрых генералаў Вадзінскага і Грахоўскага з дваццаццю афіцэрамі. Касцюшка памяняў двух коней, забітых пад ім. Адам Панінскі і Павел Бялінскі актыўна там змагаліся, але першы, гэтак як і Крупінскі, цяжка быў паранены. Непрыяцель, нягледзячы на сваю перамогу і перавагу сваіх сіл, не асмеліўся даганяць Касцюшку, і ён выкарыстаў гэты час, каб у сваім пацярпелым паражэнне войску навесці парадак, і пацягнуўся пад Казлоў, акружаны лясамі. **Бітва пад Шчакацінамі адбылася 8 чэрвеня 1794 года.**

Ужо тады адкрыта мы мелі двух ворагаў. Да гэтага яшчэ вагаўся прускі кароль супольна дзейнічаць з маскалямі, аж пакуль не атрымаў з Пецярбурга запэўненне, што паўторна, да таго спісу будзе належаць, каб дзяліць здабычу, і яму паабяцалі ў Польшчы новыя землі, тады ўжо і пачаў ён дзейнічаць супольна і трываў у гэтай справе да канца.

Позна ў Італіі даведаўся я пра паўстанне. Нягледзячы на ўсялякую паспешнасць, ледзь толькі на наступны дзень пасля Шчакацінскай бітвы спыніўся я ў Кракаве, спалоханы толькі нанесеным паражэннем. Праведаўшы нашых параненых, і нават маскоўскіх параненых, сярод іх палкоўніка Марозава, люта пасечанага пад Рацлавіцамі, хацеў я, што найхутчэй, адправіцца да лагера Касцюшкі, але з-за казакоў, што ўсюды валачыліся, дарога па сушы была надта няпэўная. Дык вось, задумалі мы пусціцца па вадзе. Солтык Станіслаў, Ліндэ, аўтар вымаўлення дыялектаў,

і некалькі іншых, нанялі мы плот і пусціліся па Вісле, не затрымліваючыся нідзе, сталі аж пад Казімірам.

Прабіраючыся да Казеніц мужыцкімі падводамі, даведаўшыся, дзе знаходзіцца Касцюшка, забралі пошту і адправіліся да яго лагера, калі не памыляюся, пад Рогава і знайшлі яго сярод цёмнага бору.

Прыняў мяне як сваяка (!) і сябра, а калі я яго запытаў, куды мне загадае падацца і які вызначыць абавязак:

— Застанешся пры мне, — сказаў ён, — і заменіш Ліноўскага, які рвецца да Варшавы.

Аляксандр Ліноўскі, чалавек красамоўны, прыстойны, але з неабмежаванай фанабэрыяй, ад самага Кракава займаў пры Касцюшку пасаду — як тады гаварылі — сакратара дзяржавы і даверанай асобы. Начальнік яго пасаду даверыў мне. Такім чынам, гэтыя высокія абавязкі зваліліся цяпер на мяне, і адтуль стала і неразлучна ад Касцюшкі трымаўся я яго верна аж да хвіліны, у якую і ён, і я, цяжка параненыя, дасталіся ў маскоўскія рукі пад Мацяёвіцамі, аж да высадкі потым на беразе Філадэльфіі; не разлучаўся я з ім аж да дня, у які ён пакінуў Амерыку.

## Ад'ютант Касцюшкі

Ласкавым было маё прывітанне з польскім рыцарствам, пяшчотны выгляд мелі вяскоўцы ў чорных світках з бліскучымі косамі, далей размясцілася пры зброі пяхота, за імі — вершнікі з коньмі, прывязанымі лейцамі да дрэваў. Усё, як і люд, простае, пад чыстым небам, акружанае цёмнай і непраходнаю пушчай. Тры дні адпачывалі мы ў тым бары. Высылаў Начальнік атрады на разведку. Нарэшце рушылі пад Варку.

Ад таго часу і да Мацяёвіц толькі да менш важных скочваліся нашы бітвы, ужо зусім мала памнажаліся нашы сілы, раслі толькі маскоўскія. Начальнік накіраваў генерала Заёнчака пільнаваць Буг ад маскоўскага генерала Дэрфельдэна, які падцягваўся да гэтай ракі. Сілы Заёнчака складалі разам з касінерамі каля пяці тысяч, адной 12-фунтовай гарматы і пяці шасціфунтовых.

У той жа час прыбыў з-за мяжы князь Юзаф Панятоўскі, галоўны начальнік нашых войскаў год таму назад. Цудоўны даў прыклад шчырасці і грамадзянскасці — калі той, які нядаўна загадваў, ахвяраваўся служыць простым валанцёрам. Які, як просты жаўнер, першы быў на нашых каравулах, першы з дзёрзкасцю і праўдзівай адвагаю нападаў на непрыяцеля.

Але вернемся да дзеянняў Заёнчака. У параўнанні з сіламі ворагаў, сілы нашы былі слабыя, бо з тым усім дайшло паведамленне, што яшчэ значнейшы маскоўскі корпус меў злучыцца з Дэрфельдэнам. Заёнчак аб'яднаўся з Ведэльштадтам, Вышкоўскім і Хаментоўскім з артылерыяй. Гэты афіцэр, нягледзячы на тое, што доўга знаходзіўся ў фамільярнасці абе-

дзвюх Шчэснотаў у Тульчыне, пакінуў іх, хутка ўгледзеўшы іхнюю здраду і агіднасць. Таксама цудоўны грамадзянін, як і поўны збройнай адвагі, быў адным з найруплівейшых дзеячаў рэвалюцыі. Заёнчак, злучыўшыся з генераламі Гауманам, Ведэльштадтам, Вышкоўскім і Хаментоўскім, вырашыў ударыць па непрыяцелю. Бітва адбылася на ўзвышшах за Холмам. Сітуацыю нашу і шыкоўную пазіцыю дапаўняла асабістае знаёмства военачальнікаў.

Маскоўцы не пасмелі з ходу ўдарыць па нашых, кожны раз, як рушылі наперад на якісьці наш фланг, заўсёды былі адбіты са стратамі. Дык вось, выкацілі яны дваццаць пяць штук васямнаццаціфунтовых, із гэтых пушак з паўдня да сёмай гадзіны вечара вялі густы агонь. Але не так з-за перавагі сілы, а хутчэй з-за праважнай умеласці нашых артылерыстаў, якія не толькі змаглі вытрымаць агонь, але і вялікую непрыяцелю ўчынілі страту. Не раз лёс бітваў залежыць ад выпадку! Нястомны, храбры Хаментоўскі пры найспраўнейшай нашай батарэі ўраз падае: непрыяцельскае ядро адрывае яму галаву. Узрушаны смерцю ўлюбёнага военачальніка батальён спускаецца з гары; Ведэльштадт прымае гэты рух за дадзены загад адыходзіць, пачалі пасоўвацца назад таксама і іншыя карпусы. Заёнчак, не адмаўляючыся ад бою, апрача таго, атрымаўшы крыху падмацавання і гарматы з Варшавы, хацеў яшчэ даць маскалям бой, але на жаль! Не знайшоў ён у падначаленых военачальнікаў такой жа гарачай ахвоты. Ведэльштадт і Вышкоўскі перамяняць ужо дадзены ўсяму войску загад адыходу не сталі і пакінулі свае пазіцыі. Цень ночы развяла праціўнікаў.

Занадта адступіўшы назад,- Касцюшка перад навалай маскалёў і прусакоў даў загад Заёнчаку, каб ён злучыўся з ім. Заёнчак, жадаючы ўчыніць дыверсіі на Валыні і Украіне, выслаў туды Ліберацкага з пяцьцюстамі вершнікамі і харугвай пяхоты. Гэты афіцэр, спрытны, дзейны, адважны, пазносіў шмат малых маскоўскіх атрадаў, папаліў іхнія склады, але, прыціснуты трыма тысячамі маскалёў, укрыўся ў Галіцыі.

Не аднаго толькі Ліберацкага прымусіла роспач на ўсялякія пагібельныя прыгоды: нешматлікае, нерэгулярнае лінейнае войска, нявопытныя военачальнікі, натоўп касінераў без агнястрэльнай зброі, здранцвеннне ў шляхты, краіна, што раскінулася ў неакінутых вокам раўнінах, без цвердзей, праз якія маглі б затрымаць непрыяцеля, без гор, без вялікіх рэк, без тых пазіцый, дзе малой колькасцю можна большую затрымаць і бой працягваць далей... Усюды роспач, толькі надзея прымушала са зброяй у руках чакаць ганаровай смерці. Тое, прынамсі, захаваць, што найбалюча прыходзілася страціць — гэта значыць, гонар і славу нашага імя.

У рэвалюцыях, калі непазнавальную процьму апануе грамадская думка, наймалейшай няўдачы прыпісваецца зараз жа здрада. Такі лёс напаткаў Заёнчака. Падпарадкаванні прымусілі яго пераправіцца праз Віслу.

Люблінскае ваяводства, сталіца трыбуналаў і склочніцтва (!), аказалася для шчырых паўстанцаў несамавітым і ў папаўненні войска жыўнасцю, і ў дастаўцы сялянства, такім чынам, Заёнчак адступіў пад Варшаву.

Таксама, калі пад Начальнікам і папярэднімі камандзірамі нашы шматлікія атрады, супраціўляючыся злучанаму маскоўскаму і прускаму войску, засланялі сабой сталіцу, то па-рознаму ўліваліся раздрабнёныя па краіне паўстанцы да рэшты войска і атрадаў добраахвотнікаў пад каманды ўжо былых афіцэраў і ўжо пацверджаных Начальнікам паўстання ваяводскіх і павятовых генералаў, якія з'яўляліся аж нават на старой маскоўскай мяжы; хаця і папярэднія гэта дзеянні, але памянуць пра іх належыць.

І так, у Літве Ваўжэцкі, Зянковіч, Хлявінскі, Вайткевіч, Ельскі адбіралі гарматы, зменшаныя маскоўскія касы, жыўнасць, склады, заходзілі занадта далёка на разведку ў Браслаўскае і Мінскае ваяводствы. Агінскі, жадаючы змыць пляму, што сябе да Таргавіцы прыпісаў і ад яе ўладу літоўскага падскарбія атрымаў, пусціўся на чале добраахвотнікаў аж да Інфлянды, дзе спаліў Дэрпет, па дарозе шмат забраў кас і амуніцыі. Стэфан Грабоўскі прасоўваўся аж да Мінска, але абодва, устрывожыўшы непрыяцеля і шмат яму зрабіўшы шкоды, былі акружаныя і рассеяныя: Грабоўскі захоплены, а Агінскі з цяжкасцю амаль адзін дайшоў да Вільні.

Важнейшая здабыча, бо адкрывала ўсю жудасную на нас лютасць Кацярыны, дасталася нам з узятым пад Палангай ганцом князя Рэпніна да маскоўскага генерала Дэрфельдэна. Выпісваю ўласныя словы тут гэтага князя: «Што да спосабу, якім Ваша Светласць можа абыходзіцца ў Польшчы, нельга лепш зрабіць, як надзяліць Вас загадам да мяне Найсвятлейшай манархіні наступнымі словамі:

Эксцэрпцыя з ліста яе Імператарскай Вялікасці да князя Рэпніна:

„Змардавана пастаяннымі турботамі, распачатымі праз бурныя грамадскія думкі палякаў, хачу ўжо раз і назаўсёды палажыць ім канец. Для гэтага рэкамендую Вашай Светласці, каб, адклаўшы ўбок усялякія мроі чалавечнасці, маё войска пад яго камандаю, будучы ў польскіх землях, так абыходзілася, якая будзе вынікаць неабходнасць, каб адняць надалей усе сродкі да бунту. Ні адзінага, такім чынам, жыхара гэтай зямлі, хаця б сябе спакойнасцю засланялі, прапускаць не трэба, выявіўшы тых, якія схоплены былі са зброяй у руцэ і далі мужнасці якісьці доказ, такіх інкарпарыраваць, Ваша Светласць, будзеш у мае палкі; будуць яны прыдатныя да вайны, якую, як Вашай Светласці вядома, па ўспакаенні разрух у Польшчы адбудзем на поўдні"».

Такімі ж былі пачуцці Кацярыны, хвалёнай паэтамі і філосафамі, называнай таргавічанамі багіняю. Называла нас бунтаўшчыкамі, за тое,

што мы баранілі родныя землі; заняўшы гэтыя землі, захацела яшчэ род палякаў знішчыць. Вось яна маральнасць манархаў!

Як быццам не даволі нам ворагаў, што надыходзілі на нас хмарамі. Хатнія хваляванні павялічвалі клопаты Начальніка, бо калі Заёнчак для злучэння з Касцюшкам і прыкрыцця Варшавы пераправіўся праз Віслу, маскалі, уваліўшыся да Пулаў, гэтае цудоўнае і прыбранае месца пачалі спусташаць варварскімі спосабамі. Захапіўшы там гаспадароў, князёў Чартарыйскіх, усе багатыя рыштункі, мэблю, шматлікую і рэдкую бібліятэку, разрабавалі склепы, падвалы, сховішчы. Варварская іх распуста не ведала граніц. Ёсць пасярэдзіне пулаўскага дзядзінца шырокая з фантанам сажалка. Бібікаў, камандзір усялякіх грабяжоў, загадаў забраць вялікія запасы цукру, цытрынаў і некалькі аксэфтаў рому, усё гэта ўкінуў у сажалку і ўсю сваю дывізію запрасіў на пунш: піло, такім чынам, быдла той пунш кубкамі, чэрпаючы яго прама з сажалкі.

Аднаго дня Касцюшка пад Фалентамі, а Заёнчак пад Гоўкавам былі атакаваны скамбінаваным войскам прусакоў і маскалёў. Пад Гоўкавам, спаткаўшыся яшчэ раз з маскалямі, Заёнчак у першы дзень атрымаў поле бітвы, генерал Князевіч у той дзень праславіўся адвагаю. Усюды тады адбілі непрыяцеля са стратамі. Пастанавілі пасля гэтага сканцэнтравацца пад Варшавай. Начальнік заняў пазіцыі ад Макатова да Волі, у Волі стаў Заёнчак, Макраноўскі сцярог рэшткі абвода Варшавы, ад Павандзэк да Вілянова і Віслы, Вяльгорскі быў пасланы да прыняцця камандавання ў Літве.



**13 ліпеня падцягнуўся Касцюшка пад Варшаву** і размясціўся, як планавалася, карпусы Заёнчака і Макраноўскага занялі таксама свае пазіцыі. Узяліся, чым найхутчэй, за насыпанне малых валоў, называных стрэламі. Слабымі выглядалі і тыя валы, і траншэі, слабыя былі і нашы сілы, з усім складаючы не больш як 22 тыс. чалавек войска, у якім ледзьве 9 тыс. можна было лічыць рэгулярным войскам, рэшта — новыя наборы і сяляне. Праз некалькі гадзін наблізілася саюзнае войска з музыкаю і пры парадзе, паказаўшыся прама перад нашым фронтам. Прусы занялі пазіцыю пад Бабяй, маскалі ў Служаве, развярнуўшы свае флангі так, што замкнулі нас цалкам на левым беразе Віслы.

Не сумняваўся Касцюшка, не сумняваліся і іншыя военачальнікі, што варожае скамбінаванае войска, якое так дужа перавышала наша і па колькасці, і ў артылерыі, яшчэ гэтай ноччу ўдарыць па неўпарадкаваных, нічым не прыкрытых нашых атрадах. І калі б мелі тую смеласць, усё схіляла да гэтага, то той жа ноччу ўраз на нашых спінах увайшлі б у горад, але кароль прускі беражлівы быў да сваіх людзей: і ён, і Ферзен, які камандаваў маскалямі, добра яшчэ памяталі, якая мужнасць была праяўлена жыхарамі Варшавы, і захацелі нас пажэрці без уласнай страты.

Тады Касцюшка, які заўсёды напярэдадні бітвы быў узрушаны, прыспешыў тым часам у акопы, а калі сцямнела, загадаў мне ехаць з ім на кані. Аб'ехалі мы ўсе нашыя пазіцыі. Касцюшка, асцерагаючыся атакі ворага, падбадзёрваў жаўнераў да энергічнай абароны, усюды абяцаючы неабходнае падсілкаванне. Нідзе не заўважылі мы хваляванняў, такой вялікай была вера ўсіх Касцюшку. Не распранаючыся, сядзелі мы ў намёце Касцюшкі: і я, і ён, і ўсе правялі амаль цэлую ноч у напружанні — наймалейшы голас, рух у лагеры непрыяцеля ўжо парываў нас да зброі і на коней. І гэтай ноччу, і ў шмат наступных, і ў днях, і ў начах не адважыліся ні маскалі, ні прусакі ўдарыць па нас. Спакайнейшымі непараўнана былі мы ад непрыяцеляў нашых, чым ад унутраных хваляванняў, скрытнай хітрасці, разбуральнай нянавісці: марнавалі цэлыя дні і ночы мы на пісанне пракламацый, лістоў, падбадзёрванняў і прымірэнняў, колькі разоў, аднак, адпраўляўся Касцюшка ў Варшаву, неадступна быў і я пры ім.

## Віры рэвалюцыі

Яшчэ калі мы сталі лагерам пад Гаўковам, прыйшла да нас вестка пра скандальныя хваляванні ўзбуджанага люду ў Варшаве. Такім чынам, пакуль Заёнчак і Касцюшка перад большымі па сіле прусакамі і маскалямі цягнуліся да Варшавы, каб абараніць сталіцу, уладу і ўсе ваенныя прыпасы ад напасці, даводзіцца кінуць погляд на сумныя і важныя падзеі, якім гэтая сталіца была сведкай. Вось адна з прычын таго хвалявання.

Начальнік Касцюшка, пакідаючы Кракаў, праз недахоп вопытных і выпрабаваных афіцэраў, пра што я ўжо гаварыў, перадаў камандаванне горадам і ўзброенай міліцыяй Віняўскаму: дзесьці да трох тысяч было там узброеных мяшчан, не лічачы некалькі сотняў сялян. Даў указанне Касцюшка Віняўскаму, што ў выпадку, калі пад націскам прусакоў альбо маскалёў не ўдасца ўстаяць, тады хай ён абмяркоўвае становішча з аўстрыйскім камандаваннем і аддае яму ў апеку і пад ахову Кракаў з умоваю, каб пасля заканчэння вайны Кракаў зноў быў аддадзены Польшчы. Нядоўга старадаўняя сталіца Польшчы цешылася сваёй незалежнасцю: пасля бітвы пад Шчакацінамі хутка Касцюшка быў вымушаны наблізіцца да Варшавы. Кароль прускі аддзяліў генерала Эльснера з трыма тысячамі людзей, каб той найхутчэй пастараўся захапіць Кракаў. Пры набліжэнні Эльснера да Кракава Віняўскі, хутчэй можа з-за баязлівасці, чым здрады, не ведаю, як гэта здарылася, адправіўся паспешна да аўстрыйскага генерала д'Гарнонкорта, прапануючы яму аддаць пад ахову Кракаў. Д'Гарнонкорт выказаў пажаданне забраць гэтую сталіцу не ў дэпазіт, а як уласнасць, або, як звычайна ў аўстрыйскай уладзе, доўга адказу на запытанне не даваў, затрымаўшы канчатковую дамову з Віняўскім. Баязлівы гэты важак, пераклаўшы перамовы пад абарону высакароднасці, адправіўся да прусакоў, а пасля раз-

мовы з імі падаў у адстаўку правячай Кракаўскай камісіі, а палкоўніка Калька вызначыў на сваё месца, адаслаў ключы магістрату, пакінуўшы яму волю дзейнасці, бо меркаваў, што будзе так найлепш. Гэтыя ўцёкі Віняўскага збілі з панталыку зноў сабраны да зброі народ: не знайшлося тады адважнага мужа, які здолеў бы паўторна авалодаць даверам народу. Пачалі пакідаць акопы, перапраўляцца на Падгор'е, на аўстрыйскі бок. Мяшчане, прыхапіўшы з сабою дзве гарматкі, замкнуліся ў Кракаўскім замку і паўтары гадзіны вялі абстрэл ворага. Даўжэй няроўнае змаганне не вытрывала, і прусакі спакойна захапілі Кракаў.

Далейшае іх знаходжанне ў гэтым горадзе не было для жыхароў цяжкім, але для нас стала вялікім, жахлівым, неабмежаваным ударам. Вядома, што ў Кракаве знаходзілася каралеўская скарбніца, гэта значыць, каралеўскія кароны і ўсе рэгаліі, якія патрабуюцца пры каранацыі нашых каралёў. Ксёндз Себасцьян Серакоўскі, каронны кусташ, быў адным з ахоўнікаў гэтага скарбу. Да яго звярнуўся прускі генерал па ключы ад скарбніцы. Кусташ адказаў, што яны знаходзяцца ў падскарбія. Прусак не налягаў больш, але якім было пазней здзіўленне ўсіх, калі пасля заняцця Кракава аўстрыякамі адчынілі скарбніцу, то знайшлі яе пустой, і, пры гэтым, замкі і патройныя пячаткі ні ў чым не былі парушаны. Перад смерцю, ужо цяпер, ксёндз Серакоўскі склаў пісьмова архіву Каралеўскага таварыства прыяцеляў навук паведамленне, якім спосабам былі выкрадзены тыя каралеўскія рэгаліі. Не давяраючы кракаўскім рамеснікам, прусакі прывезлі з Сілезіі слесараў і кавалёў. Тыя ўначы, не парушаючы замкоў, падважылі завесы абедзвюх дзвярэй і скрыняў і ўсе рэгаліі выбралі. Знаходзіліся там кароны Баляслава Храбрага, каралевы Ядвігі, Ягелонаў, Стэфана. І так тыя, якія ад гэтых карон атрымалі васальства над цудоўнымі прускімі землямі, якія перад каронамі гэтымі схілялі калені — няўдзячныя васалы — здзерлі і пакралі іх. У час Венскага кангрэса ў 1814 г. пры маім напісанні пра гэта да князя Адама Чартарыйскага, напомніў пра тыя рэгаліі цар Аляксандр. Адказаў яму брацішак яго Вільгельм (*Фрэдэрык Вільгельм III, кароль прускі [1797–1840].— Аўт.*), што нічога аб тым не ведае. Не ставілі больш таго пытання.

Адны кажуць, што адразу ж гэтыя спрадвечныя памятныя рэчы нашага гонару былі паламаны і расплаўлены, іншыя — што іх хавае берлінскі двор, каб калі-небудзь пры магчымых спрыяльных варунках, валодаючы каронамі Храбрых і Ягелонаў, пацвердзіць сваё права на польскую карону. Няхай мне даруюць за гэты абзац, смутны ён, але ўсё ж з'яўляецца і важным для нас сёння і на будучы час.

Шчасце, што некалі Касцюшка загадаў адтуль узяць вялікі з чыстага золата крыж, пераплавіў яго і перабіў на трохдукатныя сувеніры, адзін з іх

завёз я ў Філадэльфію і падараваў яго да збору медалёў Філасофскаму таварыству, членам якога быў абраны.

Кракаўская камісія складалася ў той час з Чэха, Тэадора Дэмбоўскага і ксяндза Солтыка. Справу пра страту Кракава прыслала яна да Найвышэйшай Народнай Рады ў Варшаве, усю віну склаўшы на Віняўскага.

У рэвалюцыйныя часы, дзе кожны ўчынак усімі асуджаецца, найчасцей з натхненнем і сляпым азартам, дзе — як і ў нас — расчараванне доўгімі здрадамі і хітрасцямі хутка розум схіляе да падазронасці, дзе ж ужо відней, калі аднаго абвінаваціць у здрадзе, як віна ў шмат каго знойдзецца. У часы, кажам, рэвалюцыйныя, дзе ўраду, у якога працы процьма, мноству саступіць трэба, а не раз мусіць ліслівіць, заўсёды гвалтоўнай запальчывасці ад гэтага люду належыць чакаць. Такім чынам, хутка вестка прыбыла пра здачу Кракава, запальчывы гнеў ахапіў варшаўскі люд. Дык вось, ужо гаворана, вынікі палахлівай маруднасці нашага ўрада, што зрабілася ў Кракаве, і ў нас тое ж можа зрабіцца, шмат жа бясспрэчных, перакананых здраднікаў, паблажкамі і доўгімі фармальнасцямі крымінальнага трыбунала дасюль жывуць беспакарана, а калі суд вагаецца, няхай сам люд справядлівасць з імі ўчыніць. Такімі вось вымовамі двух энтузіястаў, Канопкі і Дэмбоўскага, падбухторваўся люд, які хадзіў па вуліцах натоўпамі.

— Ідзіце, — заклікалі яны, — адбівайце турмы, выцягвайце прадажных здраднікаў і вешайце іх. Няхай гэты прыклад занепакоіць падобных да іх.

На такіх крыках прайшла ўся ноч 27 чэрвеня, на досвітку ў шмат якіх месцах Варшавы з'явіліся шыбеніцы. Назаўтра а восьмай гадзіне з раніцы натоўп узброеных людзей сабраўся перад памяшканнем прэзідэнта Закжэўскага, патрабуючы неадкладнага выраку абвінавачаным вязням. Прэзідэнт чуллівай моваю, здаецца, гэты люд схіляў да таго, каб даць суду час абысціся законна, але ў іншых месцах, дзе Дэмбоўскі і Канопка не пераставалі абмяркоўваць здраду Віняўскага і пабуджаць народ да скорай помсты, кінуўся разгарачаны зброд па розных турмах, адбіў іх, і замкнутых там Боскампа, грэка, вернага Маскве, Рагускага, Грабоўскага, Пянтка за шпіёнства, Масальскага, віленскага біскупа, Антонія Чацвярцінскага за здраду і перакананыя ў тым, што забіраў плату, вывалаклі і зараз жа павесілі на шыбеніцах. Загінулі ў тым запале і невіноўныя Вульфэрс, адвакат, вядомы шчыры грамадзянін, і Маеўскі, які бараніў вязняў ад захопу іх людам, бо раз'юшаны люд не ведаў, што такое ўвага і не ўмеў задумвацца. Ужо ўся гэтая зграя наблізілася да палаца Брулоўскага, каб вывесці адтуль Машынскага і іншых, калі бясстрашны Закжэўскі паўстае паміж неўтаймаванымі. Паднялі яго на свае плечы добрыя грамадзяне: так узвышанай прамоваю звярнуўся ён да звар'яцелых, на яго голас пачаў уціхамірвацца просты люд і, як звыкла бывае ў натоўпе, з адной крайнасці

ў хуткім часе перайшоў да другой. Не толькі не адбілі вязняў, а парушылі нават шыбеніцы і свайго прэзідэнта на руках з трыумфам аднеслі дадому.

Гэты скандальны запал, узбуджаны натхніцелямі люду, гэты гвалт, падмацаваны правам — злачынствы нават пакараных апраўдаць не могуць — быў адзіным учынкам, які збрудзіў святасць і чысціню нашага паўстання. Не было б гэтага, што дапусціў наш па прыродзе мяккі люд, не было б, калі б нікчэмныя падбухторшчыкі не распалілі яго сваімі фанатычнымі дэкламацыямі. Кажам, нікчэмныя, бо ні паслуг, ні аднаго іх грамадзянскага ўчынку дасюль не ведаем. І хто ж яны былі? Дэмбоўскі, па нараджэнні габрэй, ахрышчаны, служыў за хлопца ў ксяндза Пірамовіча, так добра заслужанага перад грамадзянамі і навукаю. З прыроджанай у габрэйскага народа пранырлівасцю, адукаваўшыся, набраўшыся навукі, трапіў за перапісчыка да маршалка Патоцкага. Прыбыўшы ў Варшаву, пакінуў маршалка і зрабіўся ў цёмнай навалачы важаком. Мала чым розніўся ад яго вядомы Канопка, які чапляўся за Калантая, перабольшыўшы ў гэтым месцы пажаданні свайго прынцыпала. Не паказваліся больш тыя шалёныя на публічнай сцэне. Як парушальнікі грамадскага спакою, былі пасаджаны ў турму. У лістападзе, калі Варшаву занялі маскалі, Канопка, які належаў да манахаў бернардзінцаў, быў вывезены ў Сібір, шчаслівейшы крыкун Дэмбоўскі падаўся да французаў, там сваёй нахабнасцю і якабінскімі прамовамі ўзнёсся да высокіх вайсковых ступеняў.

Такія сцэны з забойствамі ў Варшаве напоўнілі жалем усіх свядомых людзей, усхвалявалі балюча Начальніка. Яшчэ ў лагеры пад Гаўкова атрымалі мы тую сумную вестку. Загадалі неадкладна напісаць праклямацыю да варшаўскага народу, паказаўшы яму жах такога агіднага абыходжання, нагадаўшы народу, што ён бы гэтага сам не учыніў і права ўшанаваў бы. Гэтая праклямацыя даказвала, якімі далёкімі мы былі ад рэвалюцыйнай Францыі, адносячыся так паблажліва да злачынстваў. Няхай гэтае застаецца тут выказаным.

Касцюшкам яшчэ раней была прызначана Народная Рада, якая складалася з маршалка Патоцкага, Калантая, Мастоўскага, Каханоўскага і Суліастроўскага. Займалася яна ўсім тым, што стасавалася ваенных патрэб, жыўнасці, гармат і іншага. Старанны люд у першыя дні паўстання ад святла да ночы насыпаў вакол горада ўмацаванні і рэдуты. Але прыклад рэвалюцыйнай жудасці ў Францыі авалодаў і нашымі фанатыкамі. Справядліва за сваю прадажнасць і здраду супраць айчыны былі пакараны праз шыбеніцу Ажароўскі, гетман Таргавіцы, Касакоўскі, біскуп Ліфляндскі і Забела. Бадай на гэтай справядлівасці ўсё і скончылася б, але здарылася тое, пра што ўжо гаварылася. Ужо шмат пазней, праз 40 гадоў, 15 жніўня 1831 г., у Варшаве можна было пабачыць тыя ж самыя жахі.

Касцюшка, абураны гэтымі незаконнымі ўчынкамі рэвалюцыйнага люду, з-пад Варкі, загадаў мне напісаць ліст да Рады, абвінавацііўшы яе ў тым, што дапусціла непатрэбнае — так шкоднае святой справе народа. Аднак, каб паскорыць ход справядлівасці, прызначыў асобны крымінальны суд, які павінен быў асудзіць верхаводаў Таргавіцкай канфедэрацыі. Старшынёю гэтага быў прызначаны генерал Заёнчак. Такім чынам, асуджанымі на шыбеніцу былі: Шчэсны, Патоцкі, гетман Браніцкі і Севярын Ржэвуцкі — верхаводы Таргавіцы, біскуп Скаршэўскі быў асуджаны за тое, што на Гародненскім сейме звольніў паслоў, якія прысягнулі Канстытуцыі 3 мая. Адзін толькі Скаршэўскі заставаўся прытомным у Варшаве: кожны рабіў намаганні, каб выратаваць яму жыццё.

Яшчэ ў Фалентах, ужо пад Варшавай, дайшло да Начальніка паведамленне пра вышэйузгаданыя ў Варшаве падзеі. Але не скончылася на гэтым. Пад'юджаныя аслепленымі дзеячамі і ўсялякімі паклёпнікамі, што панавалі ў грамадскай думцы, габрэі, адзін з якіх прыняў імя Дэмбоўскі, а другі — Канопка, простанароддзе пачало збірацца натоўпам, абвінавачваючы (хто ж ужо гаварыў бы!) яшчэ нядаўна так любімага Калантая. Ёсць падазронасць, што схілілі да гэтага маскалі, а можа і сам двор, спалохаўшыся таго, каб Калантай не ўчыніў у Варшаве трагічных сцэн Парыжа, таму тую буру і паднеслі супраць Калантая.

Як жа! Характар Калантая мог непакоіць многіх. Быў гэта чалавек, які валодаў усімі вартасцямі, якія вялі да значнасці і славы. Жадаючы ўлады, скоры да ўзнагароды тых, хто яму слепа ахвяраваў сябе, помслівы, ён не ўмеў дараваць крыўды, гатовы быў ужыць усялякія спосабы, каб сцерці ў пыл тых, хто яму перашкаджаў. Словам, у краі, яшчэ не зрынутым, у краі, дзе маюцца яшчэ сілы і сродкі, а патрабуецца толькі правадыр, у такім краі загаварыў другі Кромвель альбо Рышэлье.

Шмат клопату з ім нацярпеўся Касцюшка, што не маршыраваў досыць смела і шпарка. Ведаю гэта добра, таму што на працягу ўсёй рэвалюцыі неадступна быў з Касцюшкам і спалі мы ў адным намёце (!).

Успамінаў я пра біскупа Скаршэўскага, асуджанага на смерць, і пра моцныя ўмешванні ў гэтую справу. Дык вось, сам кароль прыязджаў па гэтай справе ў лагер Касцюшкі, а, таксама нунцый папскі Літа, які даказваў, што ўжо два біскупы пакараны ганебнаю смерцю, што не прыстала вернаму Богу, высакароднаму польскаму народу, пераймаць раз'юшаную лютасць французаў. Касцюшка, хутчэй збянтэжаны, адказаў некалькімі неразборлівымі словамі, але рэшту дня быў моцна занепакоены. Быў гэта чалавек, пры вялікай адвазе, лагодны, які зусім не хацеў крыві, ноччу доўга мучыўся, не мог заплюшчыць вачэй. Нарэшце запытаў у мяне, што я думаю аб справе Скаршэўскага, хіба абавязкова яго трэба вешаць?

— Не бачу ў гэтым неабходнасці, — адказаў я, — для прыкладу здраднікам ужо навешана нямала, падобныя экзекуцыі штораз больш раз'юшваюць люд, чым больш будуць на гэта яны глядзець, тым нахабней будуць ставіцца і да падазроных, а можа і нявінных гэта пачне тычыцца, а агіда, кінутая сёння на Рабесп'ера і Марата, і на нас упадзе. Збяражом нашу рэвалюцыю, наколькі гэта магчыма, вольнай ад лютасці абвінавачванняў.

— Маеш рацыю, — адказаў Касцюшка, — але што з ім рабіць?

— Ці нельга б злажыць з яго біскупства і на ўсё жыццё закрыць у турму?

— Маеш рацыю, так і зробім.

Назаўтра адмяніў ён прыгавор. Скаршэўскі быў адлучаны ад біскупства і застаўся ў турме. Ад гэтага паведамлення Калантай не змог усядзець ад злосці, ён быў асабліва злосны на Скаршэўскага, што ў часы Таргавіцы прыняў аднятую ў Калантая малую каронную пячатку. Такім чынам, напісаў ён да Касцюшкі суровы ліст, зняважлівы, папракаючы яго недахопам энергіі, павольнасцю да двара і гэтак далей. Касцюшка быў так закрануты тым лістом і адпісаў, што ён складае ўладу Начальніка. Тут клопат узнік для Калантая, ведаючы, як быў Касцюшка любімы ўсім народам, папулярны ў простага люду, забаяўся, такім чынам, што аддаленне правадыра народа будзе прыпісана яму. Дык вось, памірыўся ён з Начальнікам, аднак глыбока ў сэрцы захаваў антыпатыю.



## Аблога Варшавы

Не ў стане пісаць пра паўстанне Касцюшкі толькі па памяці, на жаль, пазбаўлены патрэбных мне для гэтага матэрыялаў, толькі сцісла абазначу найзначнейшыя здарэнні ў часе аблогі Варшавы з 9 ліпеня 1794 г. і аж калі мы апынуліся каля Мацяёвіц.

9 ліпеня Касцюшка ад Фалентаў, Заёнчак ад Гаўкова сцягнуліся пад Варшаву. Макраноўскі на чале дзвюх конных брыгад учыніў вылазку супраць прусакоў пад Блонню, моцна іх прыціснуў і прымусіў адступіць. Але хутка атрымаў загад засланіць Варшаву ад Марымонта. Заёнчак спыніўся пад Чыстым. Сам Касцюшка аказаўся пасярод, у Макатова. Усе нашыя сілы былі не больш чым за 17 000 пяхоты, гэта былі пераважна сяляне-касінеры і 5000 коннікаў. Аб'яднанае войска маскалёў і прусакоў налічвала звыш 50 000 чалавек і шмат артылерыі.

Дзіўна, што вораг, меўшы такую перавагу сілы, не ўдарыў адразу па змардаваных паўстанцах, якія і не акапаліся яшчэ, а толькі тры месяцы марнаваў час на малых сутычках.

Касцюшка нястомны быў увесь гэты час. Апрануты ў шэры балахон накшталт халопскай сярмягі, ён разам са сваім штабам аб'язджаў на кані ўсе пазіцыі войска, адказваў на ўсе рапарты, даваў загады, прымаў прысягі і просьбы, і не раз, не давяраючы шчасліваму канцу рэйда, нічога

не прапускаў, каб, прынамсі, можна было бітву ўчыніць вельмі добрую і на магіле айчыны вянок славы ўскласці.

За тры месяцы часу, якія Касцюшка стаяў лагерам пад Варшавай, доўгі час мы чакалі штурму, але частковыя баі, важныя выпадкі здараліся то ў ваколіцах аблажанага горада, то ў адкрытай яшчэ для нас Літве. Хацеў бы напрыканцы свайго жыцця як найдалей распавесці пра публічныя здарэнні, але цяжка для мяне расцягвацца пра кожнае асобна. Будучы пастаянна пры Касцюшку, сапраўды, шмат чаго быў сведкам, добра ведаў пра ўсё праз адпісванне рапартаў, якія мне для далейшай працы аддаваў Начальнік, але коратка без апярэджвання і шчыра ўспомню пра ўсіх.

Дзейным было наша жыццё ў лагеры: і ўдзень, і ўначы непрыяцельскую прысутнасць мы адчувалі бесперапынна. Не раз, калі сядзелі апранутымі ў крэсле, у намёце Начальніка, прыязджаў ганец альбо з правінцыі, альбо ад каравулаў нашых з данясеннем, што маскалі цягнуцца. Найчасцей гэтыя данясенні былі марныя, але Начальнік і войска браліся за коней і збіраліся пад ружжо. Ніколі не гасілі святла ў намёце, таму што па атрыманні данясенняў ад розных атрадаў экспедыцыі тут жа мусілі на іх адпісваць.

Шматразова і мы самі рабілі начныя вандроўкі, ва ўсіх неадступна ўдзельнічаў сам Касцюшка. Нічога больш небяспечнага не было, як тыя, у начной цемры наскокі. Паходы гэтыя мелі штосьці урачыста жахлівае. Заўсёды выбіралі ноч для іх як мага найцямнейшую. Бачнымі былі нашы атрады, якія рушылі ў цішыні, у такіх размытых ценях, што ледзьве шэраваты водбліск штыкоў і кос абазначаў шарэнгі. Прыглушаны тупат конніцы, якая павольна рухалася, трывожнасць чаканай сутычкі, ледзь не пад самымі агнявымі пазіцыямі непрыяцеля. У той момант, калі раздаваўся пранізлівы, раптоўны крык, кідаліся касінеры на валы. Блісканне агню на мушкетах нашай пяхоты, яркае полымя маскоўскіх гармат было адзіным святлом тлумачэння гэтай жудаснай сцэны. Крыкі тых, хто нападаў і бараніўся, разам палохалі і захаплялі. Але ў цэлым, блісканне ў чорнай начы толькі агню ад гармат і стральбы, пранізлівыя крыкі тых, хто змагаўся, і параненых палохалі жудасна.

Мэтаю тых вылазак было падхапіць непрыяцельскую гармату і забраць яе з сабою, для гэтага заўсёды меліся напагатове коні, альбо, калі не ўдаецца, загваздзіць варожыя гарматы. Часам удавалася пасекчы маскоўскіх артылерыстаў, часам былі адкінуты самі, не здзейсніўшы свайго намеру. Але пільнасць і маскоўская перавага не дазвалялі нам забіраць шматабяцаных трафеяў, карысць у гэтым была тая, што наша смеласць утаймоўвала маскоўскую нахабнасць і што нашы касінеры не раз наносілі маскоўскім кананірам жахлівыя і балючыя раны.

Аднойчы ў поўдзень, калі пярэднія каравулы нашы змяніліся, Начальнік задумаў дзёрзкі намер: раптоўна загадаў напасці на маскоўскую

батарэю і забраць гарматы. Гатовыя да бою маскоўскія палкі гуртам утрымалі нашых, адагналі іх і сорак чалавек узялі ў няволю. Прусакі часцей надакучвалі пад Воляй.

Праз дзень альбо больш давалі мы сабе адпачынак, каб гэтым часам гадзіну паспаць, разабрацца і змяніць бялізну. Наставалі данясенні ад Найвышэйшай Рады, рапарты, канферэнцыі з уладамі і камендантамі карпусоў, падрыхтоўка разнастайных экспедыцый. Меў толькі малую дапамогу ад перапісчыкаў, увесь час працаваў. Абед быў сціплы, але сытны, бывала запрашалі на яго прыбыўшых ганцоў з Варшавы. Бляшаныя міскі і паўміскі, піва, мала віна, але ж Начальнік любіў старое венгерскае, не прадавалася яно, прыносілі прыхільнікі. Аднойчы атрымалі білет ад слаўнага паэта Трамбіцкага, дзе былі толькі такія на латыні словы: «Калі б мог бы ўбачыць вялікага мужа?». Адпісаў яму, каб прыязджаў. Рассыпаўся непамерна, абяцаючы Касцюшку, што будзе пісаць гісторыю нашага паўстання. Але ж пасля нешчаслівай развязкі нашай справы Трамбіцкі падаўся да Шчаснага ў Тульчын, застаўшыся там яго наёмнікам, і замест гісторыі Касцюшкі на сваёй лютні выконваў прадажныя спевы кровазмешанага шчаснавага кахання.



Не раз пасля абеду наведвалі нас шаноўныя польскія матроны. Ні адна з іх не прыйшла з пустымі рукамі: усялякія найдаражэйшыя аздобы свае з каштоўных камянёў, з жамчужын, золата і срэбра са слязамі чуллівасці на тварах аддавалі яны на ахвяру айчыны. Многія прыводзілі з сабою малых дзяцей, каб яны пабачылі свайго вызваліцеля.

Калі Ганібал спыніўся пад мурамі Рыма, не была такой вялікай вера жыхароў гэтага горада, як тая, якую ў той час выклікаў у сэрцах палякаў Касцюшка.

28 ліпеня прусакі распачалі штурм Волі, дзе камандаваў Заёнчак, і захапілі гэтую вёску, нашы былі вымушаны адступіць да Чыстай. Прусакі, авалодаўшы Воляй, гадзінамі без перапынку пачалі весці густы артылерыйскі агонь па Варшаве, але празмернае аддаленне ад горада не дазваляла, каб гарматны агонь прыносіў якую-небудзь шкоду асаджаным. Перастрэлкі, бесперапынны гул гармат не спынялі грамадскіх сходаў на пазіцыях. Памятаю, аднойчы, будучы разам з Касцюшкам каля батарэі ў Чыстым, калі прусакі адкрылі моцны агонь па нашай батарэі ад Волі, пабеглі адтуль мы з Начальнікам. Выйшлі мы з перадавой гарматнай пазіцыі, як асыпаў нас град гарматных куль, але ўжо не мелі яны сілы. Гул іляскат стаяў такі вялікі, што ледзьве можна было каго пачуць. Сярод таго ўсяго чую, што нехта качыным голасам прама на вуха мне штосьці крычыць:

— Будзь сёння ў мяне на вячэры.

Азіраюся, а то ж пачціва прэзідэнт горада Закжэўскі. Прыводжу гэты выпадак як прыклад таго, што звычайная небяспека не знішчыла нашага

духу і ні на хвіліну не зменшыла польскую гасціннасць. Калі ўжо кананада спынілася, паехалі мы да яго і пасярод глухога пакоя за сталом правялі вечар. Са шматдзённаю кананадаю ўжо нават малыя дзеці звыкліся і бегалі за кулямі, якія каціліся ў канцы Электаральнай вуліцы. Тыя кулі, што падалі з неба, збіралі яны і неслі да арсенала, атрымліваючы па тры грошы за штуку.

Адпраўленыя камандавацъ яшчэ раней Караль Серакоўскі да Буга, Квашнеўскі, Карвіцкі да Нарвы і новай прускай граніцы аддалялі з таго боку непрыяцеля, і край гэты заставаўся вольны для таго, каб нам даставляць харчы.

У той час атрымаў Начальнік праз маскоўскага трубача ліст ад генерала Хрушчова, які стаяў насупраць нас і прасіў, каб яму выдалі яго жонку і сям'ю, якія засталіся ў Варшаве. Касцюшка не толькі гэтую сям'ю, але і іншыя маскоўскія сем'і загадаў вольна адаслаць з Варшавы. Кацярына ж, дзе магла, хапала нашых грамадзян і высылала іх у Сібір.

Як у мірны час заможны чалавек выязджае на прагулянку, так і мы штодзень выязджалі на малыя з непрыяцелем сутычкі. Не было і дня вольнага ад сутычак, менш альбо больш заўзятых. Прусакі сыпалі без перапынку шрапнеллю і бомбамі са сваіх гарматных пазіцый пад Воляй, але з невялікай шкодай для горада і люду. Найважнейшай вылазкай прусакоў за гэты час была вылазка да Бабяй Горкі. Камандаваў там князь Юзаф Панятоўскі, замест пасланага ў Літву Макраноўскага. Удалося прусакам захапіць там яшчэ на досвітку наш атрад з некалькімі малымі гарматамі.

Праз тры дні спакусіліся прусакі прарваць абарону Варшавы з боку Паважак, камандаваў імі сам прускі кароль і яго малодшы сын. Касцюшка сам, уласнай персонаю, ваяваў там. Далучыліся да войска шматлікія добраахвотнікі, жыхары Варшавы, якія так асмялелі, што, усё роўна як на паляванне, выходзілі са сваімі крамянёўкамі страляць па прускай пяхоце. У паважкоўскіх лясках у гэтых крывавых сутычках шмат людзей страцілі прусакі, палегла ў іх шмат і нашых мяшчан. На маіх вачах загінуў Гумінскі, камердзінер пані гетманшы Агінскай, папрасіўшыся ў сваёй пані адлучыцца на некалькі гадзін, каб біцца з ворагам. У важнейшых сутычках праславіліся палкоўнік Красінскі, падпалкоўнік Ябланоўскі, брыгадзір Копаць, Калыска, Дунікоўскі. Апошні загінуў, здзейсніўшы цуды мужнасці. Малады Калантай адважна першы палажыў там жыццё, калі вёў узятага ў палон прускага афіцэра, з пылу насцігла яго здрадніцкая куля і хутка ён ад раны памёр. Знясіленыя нарэшце цяжкімі стратамі, прусакі пасунуліся назад на старыя свае пазіцыі. Пасля апошняга найупарцейшага бою цэлы дзень меркавалі яны, каб даць сабе перадых, але той жа ноччу выслаў Касцюшка наш атрад пад камандаю капітана артылерыі Зэферына, каб ён напаў на іх. Захапіўшы прускую батарэю, загваздзілі ім дзевяць гар-

мат і некалькі дзясяткаў забралі палонных і прывялі іх з сабою. Крапінскі і Ябланоўскі адважна паводзілі сябе ў той начной вылазцы. Першы пры загвазджэнні гарматы быў небяспечна паранены прусам, другі ўцалеў, але пазней у Санта Дамінга аддаў сваё жыццё.

Успамінаючы пра адвагу варшаўскіх мяшчан, мушу дадаць, што паслухмянасць вышэйшай уладзе раўнялася іх мужнасці, таму што, калі пабачыўшы небяспеку пакінутай на руках зброі, якая можа хутка спакусіць просты люд на насілле, Начальнік загадаў, каб мяшчане сваю зброю злажылі ў арсенал, усе аказаліся паслухмянымі. Але гэта ахвоты іх да бою не зменшыла, таму што пад выстраламі гармат пад Зігмунтам ішлі здабываць зброю і ваявалі з жаданнем.

Адна са значных сутычак адбылася таксама з боку, дзе камандаваў Касцюшка. Генерал Дамброўскі склаў дасканалы план выгнання маскалёў з Вілянова і спрытным манеўрам шчасліва гэтае выгнанне здзейсніў. Нам з Кралікарні, палацыка з паркам на Макатове, здаваўся манеўр паказным.

Але не толькі пад самай Варшавай ваявалі. З Літвы і Валыні да нас даходзілі таксама паспяховыя весткі. Касцюшка добра ведаў рэвалюцыйную партызанскую вайну праз шматгадовае вядзенне яе ў Злучаных Штатах Амерыкі: паўсюль ён наганяў, трывожыў, раздвойваў сілы, адрываў непрыяцеля. Эх! Калі б падобным чынам было гэта спрактыкавана ў вялікіх камбінацыях ваенных абаротаў?!

У Літве камандаваў паўстанцамі Велахорскі. Выхаваны на аўстрыйскай службе, быў ён без вялікіх намаганняў, але акуратны аж да дробязяў. Пакуль камандаваў Ясінскі, смелы дух літвінаў не апускаўся. Ежы Грабоўскі доўга абараняў Вільна, але ўсе гэтыя адважныя камандзіры, бачачы, як штораз больш шматлікія сілы збіраюцца супраць іх, не атрымліваючы аніякага падмацавання, па загадзе Велахорскага мусілі адступіць пад Коўна і Гародню. Літвіны, незадаволеныя Велахорскім, папрасілі другога военачальніка. Назначылі ім, такім чынам, Макраноўскага, а камандаванне сіламі пад Варшавай ад Млоціна і Бялян аддалі князю Юзафу Панятоўскаму.

Ежы Грабоўскі, муж бясстрашнай адвагі, толькі з некалькімі сотнямі чалавек сцярог Вільна і абараняў яго супраць большых сіл маскоўскага генерала Кнорынга. Ад карцечы палягло там да дзвюх тысяч непрыяцеляў, і прымусіў ён Кнорынга адступіць. Апошняя гэта была, на жаль, наша ўдача, падцягваліся ўжо з глыбінь Масквы шматлікія карпусы генералаў Дэрфельдэна, Зубава, Цыцянава, Заграйскага, Глазенгофа і, акругам рухаючыся, заграбалі нас у матню[3], усюды жудасна несучы рабункі і спусташэнні.

3 Так у польскамоўным арыгінале.— Аўт.

Нічога больш жахлівага я не адчуў, калі ўладанні майго бацькі Скокі былі абрабаваны Дэрфельдэнам дашчэнту з такою заўзятасцю, што не толькі дом абдзерлі, але коней і жывёліну забралі, нават не прапусцілі маленькага сабачкі маёй сястры, якога казакі разнеслі на піках. Старэчы мой бацька тады ледзьве здолеў захаваць сваё жыццё. Мелі месцы і іншыя здарэнні.

Маскалі авалодалі Люблінам, у тыл ім быў высланы Ліберадскі, які каля Уладзіміра і Луцка зносіў іх камендатуры, склады і забіраў амуніцыю. Гедройц і Ваўрэцкі пасунуліся з паўстанцамі аж у Курляндыю. Курляндзец Мірбах схіліў жыхароў да паўстання. Жыхары Палангі, адзінага месца, дзе да Польшчы дакраналася мора, узброілі два судны і забралі маскоўскую шлюпку з амуніцыяй. Стэфан Грабоўскі на чале атрада з трох тысяч чалавек дайшоў аж да Інфлянтаў і захапіў Дынебург. Міхал Агінскі дасюль яшчэ ўмешваўся ў сутычкі ў правінцыях, потым пусціўся ў набегі, але быў акружаны і забраны ў палон.

Вернемся пад Варшаву. Надыходзіў ужо месяц верасень. Пасля смелай вылазкі капітана Зэферына, помсцячы, можа, за тую шкоду, на наступны дзень, 5 верасня, прусакі з надзвычайнай сілаю цэлы дзень вялі жудасны і безупынны агонь па Варшаве, з малой, праўда, для нас стратаю і без выніку. Тым жа днём пасля поўдня прабраўся да нашага лагера праз непрыяцельскую аблогу адзін вялікапольскі жыхар, імя якога, на жаль, не памятаю. Чатыры дні і ночы ішоў ён трыццаць міль пехатою акружнымі шляхамі, лясамі, збожжавымі палямі, пазбягаючы жылля і чалавечага вока. Ён быў апрануты ў простую вопратку, але такі абадраны, змардаваны голадам і хадзьбою, што, увайшоўшы ў намёт да Касцюшкі, упаў і страціў прытомнасць. Прыйшоўшы ў сябе і падсілкаваўшыся ежаю і старым віном, працягнуў Начальніку ліст ад Мнеўскага, каштэляна Куяўскага, з якога вынікала наступнае важнае паведамленне: «Мнеўскі, каштэлян Куяўскі, даведаўся, што кароль прускі, знясілены доўгаю аблогаю Варшавы, загадаў па Вісле падцягнуць штурмавыя гарматы і неабходныя да іх боепрыпасы. Мнеўскі, напалоханы гэтай страшнай падрыхтоўкай, сабраў восемдзесят дзевяць адважных грамадзян і прапанаваў ім перахапіць прускі транспарт. Спярша перанялі яшчэ да Брэста Куяўскага прускую каманду і адтуль яе прагналі, затым перанялі яшчэ раз каля Влоцлаўкі. Пруская артылерыйская каманда праз некалькі гадзін аб'явілася ўжо ў Брэсце Куяўскім, калі манахі куяўскіх канонікаў і некалькі грамадзян ужо ў самым горадзе ўдарылі па ёй і забралі ў палон. Гэты поспех падбадзёрыў гараджан, яны, аб'яднаўшыся з Мнеўскім, нападаюць на прускі транспарт, які ішоў вышэй па Вісле на некалькіх дзясятках малых суднаў з афіцэрам і шасцюдзесяццю людзьмі. Ударылі па ім. Бараніліся прусакі, але, убачыўшы больш

за дзясятак сваіх забітых, здаліся. Гарматы, порах і снарады, немагчымыя да выкарыстання самімі, Мнеўскі затапіў у Вісле».

Гэтая вестка напоўніла нас радасцю. Немажліва было прыдумаць нашай справе і цяжка аблажанай Варшаве большай, як гэтая, паслугі. Імя яго будуць з вялікай удзячнасцю ўспамінаць нашчадкі. Таму што, калі б гэтыя штурмавыя гарматы прыбылі пад Варшаву, якая толькі была акружана слабым земляным валам, Варшава была б знішчана, праўда, яе ўзяцце не абышлося б без лютай разні.

Кароль прускі, даведаўшыся пра тое, быў страшна расчараваны і загадаў ад Варшавы адступіць. Аднак, перш як прыступіць да канчатковага кроку, напісаў ён да Станіслава Аўгуста, прапануючы яму здаць Варшаву. А калі той адаслаў яго да Начальніка, які стаяў каля горада, жадаючы апанаваць Варшавай выключна для сябе і не жадаючы звяртацца прама да Касцюшкі, ён загадаў свайму генералу Манштэйну падобную прапанову напісаць каменданту горада генералу Арлоўскаму. Адасланы і тым да Начальніка, звярнуўся нарэшце з пажаданнем магчымай сустрэчы з генералам Заёнчакам. Тое было дазволена. Гэта здарылася за дзень да адступлення прусаў пад Чыстым, дзе камандаваў генерал Заёнчак. Найперш убачылі прускага трубача, а за ім генерала Манштэйна. Мэтай гэтага візіту было як бы жаданне размовы з камандуючым генералам, куды і даставілі Манштэйна з завязанымі вачыма. Даўшы на сустрэчу дазвол, Заёнчак добра ведаў, як у рэвалюцыйныя часы люд наш скоры да падазронасці, таму пажадаў мець сведкаў той сустрэчы. Пачаў Манштэйн з таго, што пажадаў атрымаць дазвол, каб мог пабачыцца з прускімі палоннымі. Зразумеў Заёнчак, што гэтая просьба была толькі адгаворкай, а на самай справе, Манштэйн хацеў схіліць яго, а, прынамсі, даведацца, што ён думае пра пакорлівасць Варшавы. Пасля доўгай, абыякавай, ні аб чым размове Манштэйн запытаў, ці няма нейкага спосабу часовых крокаў да прымірэння. На гэтую прапанову Заёнчак яму адказаў:

— У 1792 г., калі былі яшчэ звязаны з намі святым саюзам, тады быў час гаварыць пра абавязкі дружбы і ўдзячнасці, але калі так нікчэмна ў апошняе бяздонне апусцілі нас, парушылі саюз, краіну разарвалі, могуць быць якія-небудзь паміж намі дамовы ці можна спадзявацца, што мы паверым хаця б аднаму вашаму слову?

Манштэйн, пабачыўшы, якая заслужаная нянавісць да прусаў пануе ў сэрцах палякаў, павярнуў размову ў іншы бок, запытаўшы Заёнчака пра поспехі французскіх войск. На словы:

— Як справы ў пратэжыраваных вамі маскалёў?

— О, вельмі прыніжаныя, — адказаў Манштэйн і ад'ехаў.

Назаўтра пасля гэтай размовы, як усё роўна прусакі хацелі выстраляць увесь свой порах, бесперапынку палілі са сваіх гармат. Аж, нарэшце, з 6 на

7 верасня, цёмнай ноччу, непрыяцельскія войскі, заключыўшы саюз, знялі аблогу Варшавы.

Раніцай пярэднія нашы заслоны далі знаць пра гэта камандаванню. За імі былі густа высланы раз'езды з загадам не ўступаць у сутыкненні, а толькі назіраць за іх перамяшчэннямі. Працяглая асада, безупынныя сутычкі, разасланыя ў розныя бакі атрады так аслабілі нашы шэрагі, што, відавочна, Касцюшку не было чым атакаваць ворага, які адыходзіў арганізавана.

Хтосьці аказаўся здольны праявіць радасць, як у войску, а яшчэ лепш сярод жыхароў сталіцы, што мела выгляд звольненага ад аблогі горада: дзе-колечы вокам кінуў, ужо не было відаць ненавісных атрадаў, толькі прасторныя нівы і лугі. Выходзілі натоўпамі з акопаў жыхары, каб убачыць месцы, дзе ляжаў непрыяцель.

...Ахвотна народ адведвае, бераг пакінуты аглядае без пагрозы (Вергілій, Энеіда, II, с. 27–28).

Апошні той раз засвяціла пагоднае сонца перад блізкім сканчэннем няшчаснай маёй айчыны: адтуль толькі параза і смутак.

Аддаленне ворага не зменшыла клопатаў і працы ў Начальніка. Заўсёды вёў ён самае сціплае жыццё. Апрануты як селянін, заўсёды дзейны. Стол яго не быў вытанчаны, але дастатковы, прысылалі яму адусюль старое венгерскае віно, якое любіў, піў каву гарачую, халодную і ледзяную. Хто прыязджаў са значнейшых, заставаўся на абед. Пасля адступлення непрыяцеля першы раз мы спалі раздзетымі.

## Верасень

Нядоўгай была перадышка. Адусюль, адно за другое пагрозлівейшае, прыходзілі паведамленні. Нават маральны венскі кабінет, прадбачачы смутны канец нашага змагання, а можа і апошні падзел, пажадаў загадзя таксама забяспечыць сябе пэўнай часткаю агіднай здабычы. З гэтай мэтаю паслаў ён пад камандаваннем генерала д'Гарнокорта войскі ў Сандамірскае і Холмскае ваяводствы. Маскалі і прусакі, што ціснулі на нас, штораз станавіліся шматлюднейшымі, не мелі мы войска для супраціўлення аўстрыякам. Касцюшка, аднак, не губляў сэрца, як вужака, прыціснутая нагою вандроўніка, яшчэ ва ўсе бакі ўецца і кідаецца, сілячыся параніць яго нагу, так і Касцюшка на ўсе бакі кідаўся і бараніўся. Атакаваны з усіх бакоў, мусіў быў дзяліць свае слабыя сілы. Трэба было ўспомніць вялікапольскіх паўстанцаў пад кіраўніцтвам Мнеўскага і перашкодзіць карпусам Суворава і Дэрфельдэна злучыцца з Ферзенам, што падцягваўся да Варшавы.

Паўстанне ў Вялікай Польшчы бараніла пакінутых суайчыннікаў ад пруской помсты, нягледзячы на ціск непрыяцеля з боку Літвы, і туды

скіраваў сваю пільнасць Начальнік. Чаму ж, на жаль, Божа не натхніў яго геніяльнасцю Напалеона (!), чаму ж не сабраў ён дастатковыя сілы, не ўдарыў наперад па маскалях пад камандаю Ферзена. Спыняла яго ад гэтага трывога за Варшаву, усё-такі прусакі, баючыся лютасці люду гэтай сталіцы, не адважыліся б ударыць па ёй, а знішчаны Ферзен затрымаў бы рух наперад Суворава. Інакш пажадаў лёс. Разарваў Начальнік свае сілы: Дуброўскі з дзвюма тысячамі чалавек, а за ім Панятоўскі — першы падаўся да Быдгосці, другі, абапіраючыся на яго пад Каменнай, спыніўся пад Бзурай. Генерал Дуброўскі, які неадкладна пацягнуўся супраць прускага генерала Секулі, збіў яго пад Быдгосцю, узяў гэты горад і самога Секулі, раненага, узяў у палон. Менш шчаслівы быў Адам Панінскі, які атрымаў загад з чатырма тысячамі войска бараніць пераправу праз Віслу ад Ферзена. Высланы, нарэшце, адважны Ліберадскі на Валынь для арганізацыі на тым баку дыверсіі, пазносіў малыя каравулы маскалёў, але, не маючы магчымасці ўтрымацца, вярнуўся назад.

Але перш за ўсё сваю ўвагу звярнуў Касцюшка на Літву, і, ўзяўшы толькі мяне з сабою, без усялякага эскорту, таемна перад Варшаваю, пусціўся да корпуса Макраноўскага пад Гародню, каб сваёй прысутнасцю падмацаваць дух літоўскага войска. Імчалі мы, як пошта, спыніліся толькі на абед у Седльцах у гетманшы Агінскай, у доме, дзе ў былыя часы гэтулькі шчаслівых дзён правялі. Будучы прывязанай да даўніх традыцый, гэтая пані не была прыхільніцай прынцыпаў Канстытуцыі 3 Мая, але як добрая полька ненавідзела маскалёў, таму мы з Касцюшкам былі прыняты як найпрыемней. Пабачыліся мы ў яе доме з былым гетманам польным літоўскім Тышкевічам, які быў ужо ў цяжкім стане, няздатны ні да чаго. Не бавячыся ні хвіліны, пасля абеду рушылі мы далей у дарогу да Гародні. Пры развітанні пані Агінская падаравала Касцюшку цудоўны бірузовы пярсцёнак, асаджаны дыяментамі. На жаль, пад Мацяёвіцамі трапіў ён у рукі маскалёў.

Нямала быў здзіўлены генерал Макраноўскі, якім шчасцем сярод дзейсных паўсюль маскоўскіх атрадаў дабраліся мы цэлымі да Гародні. Касцюшка, аб'ехаўшы нешматлікі корпус Макраноўскага, у якім першай аздобаю быў полк слаўнага Беляка, загадаў яму напісаць да літоўскага войска палымяную і разам суровую пракламацыю. Патрабавала гэтага баязлівасць некаторых нашых атрадаў. За вышэйшых военачальнікаў вызначыў Касцюшка Макраноўскага, Ваўжэцкага і Гедройца. Пасля абеду і кароткай канферэнцыі, дзе Начальнік даў інструкцыі, ужо не той, што раней, дарогаю, але па бездарожжы 30 верасня пусціліся мы назад. У баку Сакулкі мы засталі некалькі харугваў татараў, якія Касцюшка таксама агледзеў. Сярод іх сустрэў я даўняга свайго калегу па кадэтах Юзафа Марыконі. Ён, як і шмат іншых, за свой кошт выставіў атрад конніцы. Пад

Вішняўцом агледзелі мы нешматлікія страі генерала Серакоўскага, і там, як і ў Гародні, пакінулі мы пракламацыю і ўзнагароды. Ужо 2 кастрычніка спешна вярнуліся мы да сваёй генеральнай кватэры пад Варшаваю ў Макатове. Казакі валачыліся па ўсіх дарогах, гэта цуд, што мы не былі імі схоплены.

На час свайго ад'езду ў Літву пакінуў Касцюшка замест сябе галоўным военачальнікам пад Варшаваю генерала Заёнчака.

Калі б я загадаў сабе пісаць гэтыя ўспаміны з найвялікшай шчырасцю, ненаўмысна нікога не хацеў бы ні асудзіць і не прабраць, то не змог бы тут замаўчаць таго, што мне сказаў адважны палкоўнік Крапінскі:

— Калі я, — казаў ён, — у адсутнасць Касцюшкі быў на дзённым дзяжурстве ў намёце Заёнчака, пасля доўгіх ліслівасцей Заёнчак вымавіў:

— Што ты скажаш пра нашага Начальніка? Якія бездапаможныя ўсе яго распараджэнні, як шкодзіць, што ён марудзіць з каралём, яго сям'ёй і столькімі здраднікамі: не ўтрымаемся мы, калі іх спярша ўсіх не прыбярэм.

Аслупянелы Крапінскі маўчаў, Заёнчак, не знайшоўшы ў ім чалавека адпаведнага сваім думкам, далей гаварыць таксама перастаў. Не ўспамінаў бы, можа, той акалічнасці, калі б пазней учынкі генерала Заёнчака былі таму сведчаннем. Ужо тая брутава нянавісць да караля, ужо тыя правілы вольнасці і роўнасці былі шчырыя, прыроджаныя ў ім. Але калі пазней гэты рыцар служыў слепа Напалеону, не хацеў насіць польскі мундзір, калі яшчэ да падзення Напалеона свае вызваленства аддаў таму, хто панаваў, калі ўслых выказаўся ў Радзе, што нічым яму ёсць айчына і Польшча, што нічога ад іх ён не мае, а ўсё толькі ад Напалеона і Аляксандра, калі, сёння ўдзельна пануючы, ён нішто не лічыць за святое, бачу, што, як не ведаў ён шмат іншых правіл, меў толькі ўласны інтарэс. Так абыходзіліся Шчэсны, Ржэвуцкі, Бранецкі, Сухаржэўскі: у поцісках іх была айчына, ва ўчынках — здрада. Хай застанецца гэта навукаю для нашчадкаў, каб не верылі слепа ўсім.

Але вернемся да справы нашай. Ледзьве вярнуліся мы з нашага падарожжа з-пад Гародні, калі ўжо адасланыя калоны аддаліліся з-пад Варшавы, прыбег ганец ад генерала Серакоўскага з рапартам з Брэста: каля Крупчыц пад Кобрынам здарылася бітва з аб'яднанымі пад камандаю Суворава і Дэрфельдэна маскоўскімі карпусамі, шмат забітых маюць людзей, і, што, нягледзячы на вялікую перавагу сілы непрыяцеля, трымаліся на полі бою да ночы. Не маючы, аднак, дастаткова сіл, не захаваўшы вайсковы парадак, пасоўваюцца назад да Брэста Літоўскага і, не атрымаўшы падмацавання, пасланага ў гэтае месца, не здолеюць далей абараняцца. Касцюшка неадкладна выслаў на дапамогу, прыдатнага для гэтага, адважнага генерала Князевіча з трыма батальёнамі пяхоты і некалькімі эскадронамі конніцы,

а для мяне аднаго паведаміў, што назаўтра досвіткам пусцімся на конях да Серакоўскага, як найхутчэй.

Ужо восеньскія дажджы пачалі кісла дакучаць жаўнерству, якое хавалася ў шалашах і ў выкапаных зямлянках. Яшчэ 4 кастрычніка атрымаў Начальнік ад Панінскага вестку, што маскоўскі генерал Ферзен пераправіўся праз Віслу пад Казініцамі. Восеньская імгла, на шмат месцаў падзеленыя сілы Панінскага аблегчылі пераправу маскалям. Калі ў чым не дагледзелі пераправу, то можна было б у гэтым абвінавачваць Панінскага.

Зараз жа, калі генерал Князевіч выйшаў на ўзмацненне Серакоўскага, да якога меў далучыцца і Панінскі, Начальнік паведаміў мне тайна, што назаўтра са святлом пусцімся мы толькі ўдвух конна да злучаных нешматлікіх атрадаў Серакоўскага, то правялі мы вечар у Варшаве ў прэзідэнта Закжэўскага. Маршалак Патоцкі, Мастоўскі, Каханоўскі і яшчэ некалькі старых добрых прыяцеляў знаходзіліся там. Ніхто пра нашае заўтрашняе ранішняе падарожжа не ведаў, толькі ў мяне не выходзіла гэта з галавы. Сядзеў вечарам я каля маршалка Патоцкага, рассеяна разглядаючы антычны пярсцёнак на сваім пальцы, які я год таму купіў у Рыме. Ён меў форму накшталт жука скарабея, які круціць пярсцёнак, на другім баку якога выява ляжачага гладыятара з мячом у руцэ. Маршалак пажадаў разгледзець гэты антык, неяк я не сумняваўся ў тым, што гэта антычнасць найвышэйшай прыгажосці. Калі ён пачаў прыглядацца і пахвальваць пярсцёнак, я падумаў, што такая няпэўная дарога хутка чакае мяне, і захацелася мне вельмі гэтаму сумленнаму і міламу мужу пакінуць памяць пра сябе, таму што няўпэўнены быў, што будзе са мною ў баях, і пярсцёнак гэты можа дастацца маскалям.

Прапанаваў я Патоцкаму ўзяць у мяне пярсцёнак як памяць пра сябе і папрасіў, каб ён яго захаваў, бо ў лагерных хваляваннях я мог бы хутка яго згубіць. Аддаў я пярсцёнак пану Ігнацы Патоцкаму, маршалку. Трымаў ён яго і верна насіў аж да самай сваёй смерці ў 1809 г. І гадоў васямнаццаць таму ягоны брат Ян аддаў мне яго. Пярсцёнак вярнуўся да мяне яшчэ больш каштоўны, таму што насіў яго мой сябра і, што мне важна, у жыцці маім напамінае тыя хвіліны.

Маю яго сёння з сабою.

### Мацяёвіцы

Пасля шмат якіх страт і рассеяння маіх кніг і рукапісаў, не ведаю, якім чынам некаторыя нататкі пра бітву каля Мацяёвіц і маскоўскі мой палон, напісаныя па памяці ў Амерыцы, вярнуліся са мною да айчыны. Такім чынам, выпішу з іх сцісла пра сумныя тыя выпадкі майго жыцця, што лічу найважнейшымі.

Назаўтра, **6 кастрычніка 1794 г.**, на досвітку мы ўжо былі на конях абодва, як заўсёды на працягу ўсёй той вайны, у шэрых куртках рушылі з лагера каля Макатова, перадаўшы камандаванне генералу Заёнчаку. Праехаўшы мілі тры за Прагу, заўсёды амаль гналі галопам, і коні нашы пачалі стамляцца. Пакінулі мы іх і ўзялі сялянскія. Ехалі мы, спяшаючы, таму, што прыйшла вестка, што генерал Ферзен, камандуючы маскалямі пад Варшавай, мінаваў дывізію Панінскага, якая размясцілася на правым беразе Віслы, каб не даць наладзіць пераправу яму, пераправіўся пад Мацяёвіцамі. Таму гналі мы коней таропка, падобным спосабам абменьваючы іх амаль праз мілю, калі коні нашы стамляліся, і так бралі мы коней сялянскіх ад месца да месца, таму што не толькі вясковы народ і валасці былі абрабаваны маскалямі, але і пажыткі былі знішчаны ва ўсім. Якімі мізэрнымі выглядалі сёдлы, часта, замест муштука пры цуглях, вяроўка на мордзе каня, аднак, не скруцілі мы з-за гэтага сваіх каркаў, лёс падрыхтаваў нам нешта лепшае.

А чацвёртай гадзіне пасля поўдня спаткалі мы перахватчыкаў з корпуса генерала Сeракоўскага, афіцэр нам паведаміў, што **генерал Серакоўскі, адступаючы з-пад Крупчыц, быў ноччу атакаваны Суворавым на Цярэспальскіх грэблях праз Буг каля Брэста, з апошніх сіл адбіваючыся,** яго разгубленыя рэшткі войска той ноччу большасцю ўцяклі, але ў той паніцы страцілі свае гарматы. Хутка пабачылі і корпус Серакоўскага каля Акржэі. Генерал Панінскі, пакінуўшы свой малы корпус міляў за шэсць, прыбыў толькі сам. Трэба было, аднак, што найхутчэй перашкодзіць злучэнню Суворава з Ферзенам, а таго апошняга пастарацца разбіць.

Позна вечарам спыніліся мы ў галоўнай кватэры Серакоўскага. Войска апошняга налічвала ледзьве 2500 жаўнераў. Была малая ваенная рада, а днём пазней імклівым маршам злучыўся з Серакоўскім энергічны генерал Князевіч. Здзівіўся я, што Начальнік не загадаў Панінскаму разам са сваім корпусам рухацца разам з намі. Можа быць, у задумцы Начальніка было выкарыстаць Панінскага пазней, у час бітвы, калі ён мог бы паказацца нечакана на левым маскоўскім флангу і змяшаў бы ім баявы строй. Вынік паказаў, што гэта ўжо было запозна.

Знясілены шматгадзіннай яздою на кані на працягу ўсяго дня, не ведаў, куды можна прыткнуць галаву, каб адпачыць, смелы і шчыры брыгадзір Копаць ахвяраваў для мяне сваю кібітку, у якой я і пераначаваў. Назаўтра, 7 кастрычніка, малое наша войска, не чакаючы 2000 пяхоты, 10-эскадроннай конніцы і 12 гармат, якія згодна загаду выслаў нам з Варшавы на дапамогу генерал Заёнчак, рушыла далей. На распагоджаным небе ясна свяціла сонца. Жаўнеры, не прадбачачы, што іх чакае, крочылі весела і спявалі. Адзін з іх цудоўна пераймаў салаўя. Затрымаліся мы для перадышкі ў Жэляхове, мястэчку, якое належала сумленнаму Закжэўскаму і цяпер

было цалкам знішчана маскалямі. Пад вечар прыцягнуліся ў Карытніцу, таксама абдзёртую маскалямі яшчэ больш. Паўсюдна былі відаць сляды прабывання войска Кацярыны. Дом уладальніка быў абазначаны за генеральскую кватэру. Разбураны быў ён цалкам казакамі: сталы, табурэткі, крэслы, канапы, бюро, камоды — усё было пасечана на кавалкі. Звер пабываў у доме гэтым — усё пасек і пабіў. Павыкідваныя кніжкі і паперы пасечаны былі на дробныя кавалкі і ўсцілалі падлогу.

За вёскаю цягнуліся два ланцугі ўзгоркаў, падзеленыя лагчынай. Малое наша войска стала на адным з тых ланцугоў узгоркаў перад лагчынай, упіраючы да зарасляў свае флангі. Назаўтра лінуў шчодры дождж. Каля поўдня адзін з нашых раз'ездаў захапіў дзесяць маскоўскіх гусараў з палка Воўкава і капітана інжынерыі, паляка Падчаскага, якога выслалі для здымкі плана ваколіц. Гэты няшчасны чалавек быў з Брацлаўскага ваяводства, ахоплены нязмерным страхам, як ваюючы супраць айчыны, варты быў шыбеніцы і ўжо ўяўляў сябе прыгавораным да смерці. Кляўся, што з патрэбы падаўся да маскоўскай службы, з якой, нягледзячы на яго ўсялякія настойванні, не звальнялі.

— Схоплены са зброяй у руках супраць уласнай айчыны, — адказаў яму Касцюшка, — заслугоўвае кары смерцю, аднак, даруем табе гэта, калі дасі праўдзівыя паказанні пра становішча маскоўскіх войск.



Не ўтойваючы нічога, узрадаваны Падчаскі, абрысаваў у цэлым пазіцыю корпуса Ферзена, пералічваючы сілы кожнага палка, лічбы гармат і г. д. Бачылі мы яго перавагу, маліў Падчаскі, каб мы з такою малой колькасцю сіл не набліжаліся да праціўніка, які нас так моцна пераважваў. Запэўніваў нас, што непрыяцель мацнейшы за нас і зброяй, і людзьмі, і біцца нам не раіў. Не хацелі мы даваць яму веры... Злы лёс штурхаў нас наперад!

Пасля поўдня пад вечар прыбыў кур'ерам палкоўнік Мольскі, не апошні паэт, ад генерала Дамброўскага з афіцыйным паведамленнем, што той разбіў ушчэнт прускі корпус палкоўніка Шэкелі і авалодаў Быдгосцю. Камандуючы смяротна паранены, дзве тысячы прусакоў загінулі альбо трапілі ў няволю. Горад Быдгосць, яшчэ пры першым падзеле забраны прусамі, адваяваны. Напісаў зараз жа пракламацыю, абвяшчаючы войску пра гэтую перамогу, падбадзёрваючы ваяроў, каб набытая іх таварышамі слава зброі стала годнай у баі, які ў хуткім часе мае адбыцца. Пад вечар перастаў падаць дождж, распагодзілася. Жаўнеры нашы перазарадзілі зброю. Генерал Каменскі, калега мой па корпусе кадэтаў, прыбыў да кватэры Касцюшкі. Прагульваючыся па дзядзінцы з маімі школьнымі таварышамі — генераламі Князевічам і Каменскім, размаўлялі пра наша становішча, прыгадваючы тыя прыемныя, першай нашай маладосці, успаміны. Сярод размовы Каменскі заўважыў двух крумкачоў, што ляцелі па правай ад нас руцэ, і тут жа адазваўся:

— Ці памятаеш Лівія твайго? Крумкачы ляцяць па правай нашай руцэ, ліха гэта для нас прарочаць.

— Не верце гэтаму, — адказаў я, — для рымлян гэта, а не для нас, пабачыце, маю нейкае прадчуванне, што на гэты раз нас чакае ўдача, што разаб'ем маскалёў.

Эх! Як я страшэнна памыляўся!

З гэтага месца, як я ўжо ўпамінаў, маё апісанне будзе больш дакладнае, таму што выпадкова захаваліся ад маскоўскага грабяжу нататкі майго палону і цудам перасланы былі мне. Тое, што ніжэй, выцягваю адтуль.

Дзень 9 кастрычніка быў таксама пагодны, як і папярэдні. Зранку прыбыў Князевіч, за ім палкоўнік Крыцкі, якія прывялі з сабою два цудоўныя палкі пяхоты, што былі высланы з некалькімі гарматамі з Варшавы. І военачальнік, і войска былі стомлены раптоўным, празмерным начным паходам і голадам. Злы паляк, калі галодны, нешта бурчаў пад нос сабе, але падбадзёрванні афіцэраў, раздадзеная ежа і некалькі кубкаў гарэлкі суцішылі бурчанне і вярнулі добры гумар.

Нашы сілы ў той час складалі да 5600 чалавек і 21 гармату (па ацэнцы М. Куцеля польскія сілы складалі каля 7000 чалавек). Прыбыў з падмацаваннем таксама С. Фішар, даўні ад'ютант Касцюшкі.

А дзявятай гадзіне раніцы рушылі мы з войскам наперад. А чацвёртай пасля поўдня высунуліся з лясоў і сталі на ўзгорку падзамчышча насупраць Мацяёвіц. Начальнік, узяўшы з сабою мяне і некалькіх уланаў, рушыў наперад, каб разведаць праціўніка. Убачылі мы хутка шчыльныя рады варожага войска. Расцягнуўся іх лагер над берагам Віслы, як толькі магло ахапіць вока. Хоць даволі вялікая адлегласць да лагера выразна ўсяго ўбачыць не дазваляла, але быў гэты выгляд заварожлівы. Апошнія прамяні сонца, якое заходзіла, адбіваліся ад чыстай сталі густых радоў пяхоты, далёкае іржанне коней, прыглушаны гоман гэтага нязмернага мноства напаўняў паветра і нёс у сабе штосьці жахлівае.

Кінуліся мы як хутчэй да стралкоў у бакавы лясок, які стаяў па абодва бакі ад нас. Пярэднія нашы заставы ўжо ўвязаліся з казакамі ў перапалку на раўніне, якая прасціралася ад Віслы да ўзгорка, на якім стаяў Мацяёвіцкі дом, і забілі некалькі казакаў. Калі ж толькі пабачылі мы, што яны зрываюць тут жа з забітых шабеты (кісеты), у якіх былі польскія манеты, як з неймаверным крыкам і віскам на нас выскачыла цэлая аблава казакаў. Ляцелі яны на нас у звычным для сябе страі — паўмесяцам (такі ў казакаў ёсць нораў), адсякаючы нас і акружаючы, ужо былі мы з Касцюшкам з усіх бакоў акружаныя нечакана так, што ўжо дзіды казацкія бачылі побач перад сабою, і не разумею, як не апынуліся схопленымі, калі неспадзявана, на наша шчасце, паказаўся эскадрон лёгкай кавалерыі палка Каменскага.

Гэтая пагроза прымусіла казакаў даць драла ў тыл. А пятай гадзіне вечара ўсё супакоілася і наша войска цалкам сцягнулася на месцы.

Мацяёвіцкі двор, званы Падзамчышчам, ляжыць у нізіне, а сам мураваны дом на ўзгорку супраць Віслы. З тылу дома знаходзіцца вёска ў даліне, на пярэднім плане — доўгая грэбля вядзе да мястэчка, па правую руку — рэчка Акрзея, з левай рукі — карчы і багна. Пазіцыя гэтая здавалася нам вельмі добрай і цяжкай да ўзяцця. Усе нашы сілы ўмясціліся на ўзвышшы. Ад дома паставілі батарэі насупраць грэблі, якія маглі прашываць агнём усю яе працягласць. Два палкі стралкоў і два батальёны Дзялынскага былі аддадзены пад камандаванне генерала Серакоўскага. Рэшту акругі запоўніла пяхота, брыгада конніцы Копаця, уланы Каменскага, два эскадроны кавалерыі кароннай гвардыі і столькі ж міліцыі Брэст-Літоўскага ваяводства (!) — усе пад камандаваннем генерала Князевіча. Загадаў Начальнік у некалькіх месцах насыпаць валы для заслону, але захапіла ноч, калі ледзь пачалі сыпаць. Пяхота і касінеры стаялі па левым баку ад дома пад камандаваннем Князевіча і Крыцкага. Конніца кароннай гвардыі, лятучая кавалерыя Каменскага і новы прызыў брэстлітоўскай міліцыі расцягнуліся па рацэ і сярод чатырохгранніка абароны. Такім чынам, увесь наш нешматлікі баявы строй умясціўся на адным узвышшы, абапіраючыся на раку і цяжкія для праходу месцы. Усё войска на ноч засталося пад зброяй. Падвоены былі каравулы, кожнаму коннаму далі яшчэ пешага стральца. Зрабіўшы гэтыя распараджэнні, падаліся мы да ўспамянёнага вышэй каменнага дома.

Не веру адтуль прадчуванням. Быў гэта пярэдадзень аднаго з найнешчаслівейшых дзён майго жыцця. Дзень, у які страцілі мы волю, а што ў сто раз балюча, дзень, у які маёй айчыне быў нанесены смяротны ўдар. Я ж быў спакойны, больш за тое — вясёлы.

Палац мураваны, у якім мы ўкрыліся, быў гэтак жа абабраны і знішчаны, як усё тое, што наведалі маскалі. Калісь Мацяёвіцы належалі да роду Мацяёвіцкіх, перайшлі пазней да Патоцкіх, ад якіх ужо набыў іх канцлер Андрэй Замойскі. Спыніліся мы ў тым доме з Начальнікам. Верхняя зала была ўпрыгожана партрэтамі знакамітых уладароў, прымасаў, канцлераў, гетманаў, біскупаў. Божа мой! Які выгляд руйнавання і спусташэння: усё, што было можна злупіць, злупілі, на ўсіх партрэтах дзідамі павыколвалі вочы, шаблямі пасеклі твары. Такім было войска слаўнай Кацярыны II, апякункі навук і цудоўных мастацтваў. Не знайшлі мы ўжо там бібліятэкі, забралі яе маскоўскія афіцэры, скрыня толькі адна, у якой былі малыя друкаваныя выданні і збор польскіх газет з пачатку XVIII ст., валялася разбітай на паркетнай падлозе ў каплічцы. Сярод іншых натрапіў там на газеты, дзе паведамлялася пра смерць караля Аўгуста II, і дзённік Канвакацыйнага сейма. Пазбіраў некаторыя, дзікая мешаніна лацінскага з

польскім тых часоў, надзьмуты стыль забаўлялі мяне бясконца і выклікалі смех. Уся падлога зруйнаванай капліцы была ўслана тымі газетамі. Падняў з іх некалькі аркушаў і за вячэраю чытаў іх Касцюшку. Размаўлялі мы пра заўтрашні дзень, пра цяжкасці, з якімі сутыкнуцца маскалі пры атацы на нашы пазіцыі. Дзе ж было тое прадчуванне, пра якое столькі чуў! У прадвесці многіх жахлівых забойстваў і апошняга сканання няшчаснай нашай айчыны мы смяяліся, былі вясёлыя — занадта, пэўна, даверапы былі вельмі добрай нашай пазіцыі. Ужо позна прыпалі мы да прынесеных кулёў саломы.

А другой гадзіне пасля поўначы разбудзіў нас ганец ад Панінскага. Касцюшка загадаў яму адпісаць, каб Панінскі, як найхутчэй, паспяшаў злучыцца з намі. На жаль! Ужо гэта было запозна. Панінскі стаяў ад нас міль за тры і не мог ніяк паспець, калі ганец вярнуўся да яго, мы ўжо былі ў агні, і з гэтага боку ён павінен быць вольны ад падазронасці і віны.

10 кастрычніка 1794 года, у пятніцу, на самым досвітку ад'ютант ад службы Кунеўскі даў нам знаць, што вораг у баявых страях падступае да нас. Наша войска да яго падыходу хутка падрыхтавалася. Праз хвіліну мы ўжо былі на конях. Начальнік, пабачыўшы ў нашым тыле вёску, асцерагаючыся, што яе могуць захапіць маскалі, загадаў яе запаліць. Ніколі не забуду таго жудаснага выгляду ад полымя, якое ахапіла вёску, ад чорных клубоў дыму, што ўзносіліся над ёй, ад сялян, жанчын з дзецьмі на руках, жывёлы, хатніх птушак, якія ўцякалі ва ўсе бакі і напаўнялі паветра плачам і енкам.

Маскалі, маючы гарматы большага калібру ад нашых, адкрылі па нас агонь здалёку і першымі сваімі гарматнымі ядрамі пачалі нас дасягаць. Велізарныя тыя ядры, са страшэнным ляскатам і жахлівым трэскам прадзіраючыся праз дрэвы і карчакі, ламаючы галіны, падалі сярод нашага ўмацаванага чатырохгранніка і накрывалі нас адарваным галлём. Не мелі мы больш як за чатыры 12-фунтовыя гарматы, калі вораг наблізіўся на іх дыстанцыю, адкрылі і мы з іх агонь. Сам Касцюшка цэліўся і наводзіў гармату з такім вынікам, што можна было пабачыць, як шэрагі маскоўскія пасля ўдару ўскалыхваліся і пачалі радзець. Знаходзіліся мы на месцы высокім і сухім, маскалі былі вымушаны наступаць праз багну.

Праз тры гадзіны бою мелі мы верх над імі настолькі, што генерал Серакоўскі, камандуючы атрадам і гарматамі, якія білі ад фасада палаца, наблізіўся да Касцюшкі і прамовіў яму:

— Здаецца мне, што маскалушкі нядоўга пратрымаюцца і пачнуць збірацца да адступлення.

Але неўзабаве ўсё здарылася інакш. Ферзен, чатырохкратна нас перавышаючы колькасцю і ў людзях, і ў гарматах, страты сваіх людзей лічачы за нішто, не зважаючы ніякай увагі на цяжкасці прыступу, ні на наш агонь,

штораз набліжаўся да нас усё больш. Агонь іх штораз станавіўся трапнейшы і страшнейшы. Град ядраў і гранат разнастайнага калібру, карцеч без перастанку свісталі каля вуха і з усіх бакоў падалі на нас. Не разумеў я не таго, што людзі нашы гінулі, а таго, як у параўнанні з той гушчынёю ядраў і куль, не гінула людзей больш, якія заставаліся жывымі сярод лятаючай паўсюль смерці. Здзіўляла гэта мяне. Павялічвала жорсткасць гэтай хвіліны відовішча Мацяёвіцкай вёскі, ахопленай полымем, крыкі і плач няшчаснага люду з дзецьмі і пажыткамі, яны шукалі выратавання па лясах. Прыпамінаю сабе, што запаленая граната ўпала ў тое месца, дзе толькі што Начальнік і я стаялі разам, і, узарваўшыся крокаў за пяцьдзесят ад нас, палажыла трупам кананіра. Каля першай гадзіны з поўдня праціўнік знаходзіўся ад нас ужо на адлегласці выстралу ручной зброі. За гэтым большым зближэннем пачаў весціся з абодвух бакоў густы ружэйны агонь, пакрываючы ўсю зямлю забітымі, палохалі жахліва, разносячыся ў паветры, енкі параненых і паміраючых, але ні адзін з нашых не пакінуў свайго месца, з якога працягваў весці агонь. Жаўнеры нашы, знаходзячыся ўжо шэсць гадзін на адным месцы пад агнём, пачалі праяўляць нецярплівасць і тупасць. Ужо пабіты коні каля гармат, ужо скончыліся баявыя зарады, знясілеў цалкам наш агонь. У гэты час палкоўнік Крыцкі, які ўжо не мог стрымліваць жаўнераў, якія стаялі пад агнём 6 гадзін на адным месцы, не адчуваючы нічога, акрамя высакароднай роспачы, звярнуўся да сваіх касінераў з заклікам:

— За мною, вера!

Ускінулі свае косы, рушыўшы наперад, стойкія сяляне і прарвалі, сутыкнуўшыся, строй ворага, калі непрыяцельская куля смяротна зваліла на зямлю храбрага Крыцкага; затрымаўшыся ад нечаканай смерці свайго военачальніка, касінеры пачалі адыходзіць альбо рассейвацца. Сталася растуліна ў нашым абаронным чатырохграннiку. Памчаўся я да Касцюшкі, паведамляючы яму, што ўжо непрыяцельская конніца праз карчы набліжаецца да таго выгіну. **Сам жа хутка наблізіўся да эскадрона брэст-літоўскіх паўстанцаў, сабраў іх у атрад і, падбадзёрыўшы, ходка кінуўся наперад, як раптам стралецкая куля разрывае мне наскрозь правую руку вышэй локця.** Выпадае зброя з рукі, кроў хлешча багата па мне і каню майму. Бяру Бога ў сведкі, што, пабачыўшы кроў, што лілася з раны, не выхваляюся, а шчыра прызнаюся, што першым маім пачуццем была не боль раны, а нейкая ганарыстасць — так скажу — якісьці салодкі гонар, што кроў мая пралілася за абарону любай маёй айчыны. Здавалася мне, што, сплочваючы ёй такім чынам свой доўг, ужо пазнейшыя мае засмучэнні я перанясу лягчэй. Але тая радасць, тая патрыятычная пыха хутка ўступіла месца смутку, калі ўбачыў поўны наш пройгрыш. Нягледзячы на атрыманую рану і страчаную праз гэта зброю, я мог яшчэ пера-

мяшчацца. Азірнуўся, але ўжо мае новавярбованыя брэстлітоўцы, якімі я толькі што камандаваў, разбегліся з поля бітвы цалкам. Паўсюль блытаніна і беспарадак. Ужо ўсё маскоўскае войска наступала на нас і акружала адусюль. Пяхота наша значна парадзела, аднак яшчэ адбівалася штыкамі ад насядаючых маскалёў, адступаючы да палаца, на яго дзядзінцы, на ганку і нават у падвале. Сярод гэтай разні Касцюшка спрабаваў сабраць рэшткі нашай конніцы. Я вярнуўся да Касцюшкі. Адзін афіцэр пяхоты, пабачыўшы мяне, аблітага крывёю, зняў са сваёй шыі чорную хустку і абвязаў мне руку. Яшчэ раз на момант наша конніца адбіла непрыяцеля. Але хутка ён вяртаецца яшчэ мацнейшым, у сярэдзіну нашага чатырохгранніка ўвальваецца цэлая маса маскоўскіх драгунаў. Пад Касцюшкам забіты конь, ён перасядае на іншага, намагаецца яшчэ раз склікаць сваіх і знікае з маіх вачэй. Ужо ў нашай пяхоце мужчына схапіўся з мужчынам. Хутка акружаны казакамі, бяссільны, бачу, як маскоўскі афіцэр хапае майго каня за цуглі: ранены, без зброі, далей бараніцца я не мог. Стаў я палонным.

Казацкі афіцэр, які схапіў майго каня за цуглі, адвёў яго са мною далёка да бліжэйшага ляска і там зрабіўся маім гардэробшчыкам. Высакародны той афіцэр, пераканаўшыся, што зброя мая была ўжо выстраляна, адабраў яе ў мяне, спытаў далей пра гадзіннік і торбачку. Забраў найперш гадзіннік, затым торбачку з грашыма. Здымаючы з мяне акрываўленую маю куртку, пабачыў цудоўны пярсцёнак на пальцы і з-за таго, што параненая рука набракла, не змог яго зняць хутка. Афіцэр узяўся за праверaны спосаб. Ужо ўлажыў мой палец у рот і хацеў яго ўраз з пярсцёнкам адкусіць. Адчуваючы ўжо яго зубы, хоць і быў слабы, але вырваў палец з яго зубоў.

— Пачакай, — крыкнуў я, — я яго сам здыму.

Добра паслюнявіўшы той палец, з вялікай цяжкасцю і болем сарваў гэты пярсцёнак і кінуў яму. Меркаваў, што на тым гэта скончыцца, але афіцэр з разбойніка ператварыўся ў камердынера. З дапамогаю двух сваіх падначаленых здзёр з мяне да канца тую ж куртку, камізэльку, хустку. Не маючы ўжо што адабраць, кінуў на мяне мундзір, здзёрты з забітага нашага жаўнера і выехаў са мною з лесу, правёўшы мяне да сваёй каманды.

Ад страты крыві пачаў я ўсё больш слабець. Ужо стральба цалкам сціхла, праязджалі мы сярод шматлікіх маскоўскіх палкоў, напышлівых ад перамогі. З жахлівымі абразамі кідаліся на мяне маскоўскія афіцэры з усіх бакоў, радасным дзікім крыкам выяўляючы сваю перамогу, і кожны з іх абражаў мяне грубіянскімі словамі. Адзін з вышэйшых драгунскіх афіцэраў сваім варварствам так быў ахоплены, што, вырваўшы ў казака плётку, ударыў мяне ёю па плячах.

— Толькі подлая душа, — зрэагаваў я, — можа крыўдзіць раненага і безабароннага, варвар ты!

Дзікун той парываўся ўжо да палаша і хацеў мяне, безабароннага, рассячы, калі б на маё шчасце не з'явіўся падпалкоўнік Талстой, які вылаяў яго за нялюдскасць і подласць і тут жа забраў мяне пад сваю апеку, суцешыўшы мяне і запэўніўшы, што сам уласна аддасць мяне камандуючаму войскамі.

Яшчэ раз праехалі мы праз пабоішча. Уся зямля была заслана целамі загінуўшых маскалёў і паўстанцаў. Целы іх ужо былі ўсе аголеныя. Гэтае відовішча крывавай смерці мела нешта вялікае нават у самой сваёй жудаснасці. Усе тыя велічэзныя целы палякаў (распазнаць іх можна было па розніцы твараў ад маскалёў), усе тыя, гавару, целы з прабітымі ў большай частцы штыкамі грудзьмі, з крывёй, ужо застылай на моцных іх частках, з выяўленнем яшчэ жаху альбо роспачы, застылай на мёртвых тварах, бледных і суцішаных праз смерць, — наводзілі на думку, што мужныя гэтыя людзі, але нешчаслівыя, усё ж такі са славаю грудзьмі сваімі закрывалі айчыну і паляглі за яе. Усё гэта пакінула мне чуллівае, глыбокае, незабыўнае ўражанне, якога ніколі не сатру.

### Палон



Прыбылі мы нарэшце да найвышэйшага военачальніка, генерала Ферзена. Адшукалі яго, калі ён прагульваўся па дзядзінцы Падзамчышча са сваім старэйшынам. Гэта быў стары гадоў пад семдзесят. Сухі, высокі, замест мундзіра на ім быў ружовы сурдут з залатым галуном, без шпагі, словам, па-цывільнаму, як толькі мажліва, асабліва ў дзень бітвы. Вёў з сабою пад руку дзяўчыну, якая магла мець, можа, гадоў пятнаццаць найбольш, сваю наложніцу. Быў я яму прадстаўлены і адведзены да дома, які яшчэ сем гадзін таму служыў нам за галоўную кватэру. Хата напоўнена была маскоўскімі генераламі і многімі нашымі, узятымі ў палон, як і я. Гэта генералы Князевіч, Серакоўскі, Каменскі, брыгадзір Копаць. Слёзы пацяклі з нашых вачэй, калі мы паглядзелі адзін на аднаго, асабліва пасля паведамлення, што Касцюшка быў забіты, гэта яшчэ больш павялічыла наш боль. Маскоўскія генералы, якіх я ўбачыў тут, былі наступныя: Хрушчоў, Тармасаў, Дзянісаў, Энгельгард і падпалкоўнік Талстой, які мяне даставіў сюды. Ведалі яны ўсе прозвішча маё, такім чынам, не пераставалі мяне суцяшаць і вялікую чыніць далікатнасць і дэкларацыйнасць.

— Не варвары мы! Не варвары мы! — паўтаралі яны безупынна. Сама паспешлівасць у безупынным паўтаранні, што не з'яўляюцца яны варварамі, даказвала, што ўласнае сумленне нагадвала адчуваць ім сябе варварамі, раз імя гэтае справядліва ім было нададзена! Справядлівасць, аднак, вымушае мяне прызнацца, што ў тыя хвіліны ветлівасць іх да нас была шчырая і яны не заслугоўвалі гэтага дакору. Рэдка ў шчасці чалавек бывае злы. У тыя хвіліны ўсе военачальнікі знаходзіліся ў радасным

захапленні. Скончыліся ўсе іх ваенныя справы, выйшлі яны шчаслівыя з крывавай і ўпартай бітвы, пазбавіліся кіраўніка паўстання, з якім уяўлялі вайну закончанай назаўсёды. Замест паходных клопатаў, небяспекі, смерці, найпагоднейшая будучыня раскрывалася перад іх вачыма. Медалі, крыжыкі, ордэны, рублі, дыяменты, шыкоўныя ўзнагароды, зоркі, стужкі, наданне ўладанняў у цудоўным карагодзе танцавалі ў галовах. Такім чынам, паўтараюся, што ў тыя першыя хвіліны радасці адносіліся яны да нас як да прадмета будучага шчасця, не маглі яны нас тады ненавідзець, старанні іх у прыязнасці да нас не мелі межаў.

Палкоўнік Маранцаў і Глебаў, убачыўшы мяне, залітага крывёю і не перавязанага яшчэ, тут жа паслалі па сваіх цырульнікаў. Пасля агляду раны высветлілася, што ў месцы, дзе выцякала кроў, куля, перабіўшы ўсе жылы, блізка самой артэрыі слізганула па касці, не парушыўшы яе, і прайшла навылёт збоку артэрыі, дзе звычайна пускаюць кроў. Пры першым аглядзе не адчуваў я вялікага болю, не прадбачыў у той час, якія мукі мне прыдзецца цярпець пазней. Страціўшы ўсю сваю вопратку, не меў я ў што пераапрануцца. Маранцаў, той, якога я праведаў яшчэ ў Кракаве як палоннага, даў мне чыстую тонкую кашулю.

Тым часам галоўная кватэра штораз усё больш напаўнялася новымі людзьмі. Сярод іх — жонка генерала Хрушчова з дзвюма дочкамі і пляменніцай, якія прабраліся сюды праз поле бітвы, дзе змаганне было найбольш лютае. Не маглі мы перастаць таму здзіўляцца, з якой халоднай крывёю і смеласцю гэтыя калмыкаватыя прыгажуні пераступалі праз голыя целы, праз акрываўленыя трупы, якімі завалена была дарога. Як гэтымі дамамі асвоена было відовішча падобнай разні?!

Але яшчэ больш жахлівейшае чакала нас відовішча. Уласна, будучы занепакоеным, распытваў усіх, што сталася з Касцюшкам? Маскалі паведалі мне, што ён загінуў у баі. Але паміж чацвёртай і пятай гадзінамі вечара заўважылі мы атрад жаўнераў, які набліжаўся да галоўнай кватэры, несучы на насілках з лазы пакалечанага чалавека. Быў гэта наш храбры, але няшчасны Начальнік Касцюшка. Уся яго постаць была заліта крывёю, жудасна супярэчыла са смяротнаю бледнасцю яго пасінелага твару. Касцюшка атрымаў глыбокае рассячэнне галавы і дзве раны ад дзіды вышэй сцёгнаў, ледзьве дыхаў. Відовішча гэтае сціснула маё сэрца, слёзы пацяклі з вачэй, доўгае маўчанне перарваў плач і енк. Кінуўся я на бледнае цела і ад той хвіліны аж да той, у якой стаў замкнёным асобна вязнем у пецярбургскай цвердзі, не пакідаў яго і на момант. Занеслі яго да залы наверх, хірург агледзеў раны. Я, смутны, сядзеў пры ім, два грэнадзёры стаялі ў дзвярах. Нічога суцяшальнага цырульнік не выказаў. Яшчэ да змяркання Ферзен патрабаваў гэтую залу падрыхтаваць назаўтра да банкету. Ужо позна ноччу нас пераправодзілі на ніз, да пакою, якраз над склепам.

Глухая ноч пасля гэтага няшчаснага дня была найбалючай ва ўсім маім жыцці! Ляжаў на саломе збоку Касцюшкі і ў сто раз пакутаваў больш маральна, чым фізічна. Стаяла варта перад дзвярыма і ўнутры памяшкання. Натоўп маскалёў напаўняў дом, ужо паволі пачалі разыходзіцца, ужо пагасілі святло, калі гоман, змешаны з вясёлым смехам і выкрыкваннем сальнасцей, уступіў месца енкам і выкрыкам параненых і паміраючых.

Тут прыпомніць патрэбна, што ў час жудаснай той бітвы, а хутчэй апошняй разні, каля сотні жаўнераў з палка Дзялынскага і стралкоў, адступаючы крок за крокам і адбіваючыся штыкамі ад колькасна мацнейшага непрыяцеля, загнаны былі аж да Мацяёвіцкага палацыка, дзе яны і схаваліся. Мужныя, яны там бараніліся да апошняга, калі ўсе боепрыпасы былі выстраляны, маскалі ўварваліся ў сенцы. Тут пачалася рукапашная бойка штыкамі, з пакоя ў пакой, пакуль не загналі абаронцаў у склеп, дзе здарылася найжудаснейшае забойства, аж пакуль там усе не паляглі забітымі альбо цяжка паранеными, не маючы магчымасці бараніцца. Дык вось, яшчэ там, у склепе, дагэтуль гэтыя няшчасныя заставаліся, калі нас перамясцілі ў пакой над імі. Енк іх і крыкі, знясіленыя галасы: «Няхай нас хто-небудзь даб'е!» — раздзіралі маю душу.

Бедныя ваяры, якія змагаліся за айчыну, не змаглі яе ўратаваць, цяпер заканчвалі жыццё ў цяжкіх болях, пранізліва крычалі, цяжка паміралі, пакідаючы ў бязлітаснай няволі ўдоў і сірот.

Сярод тых нечалавечых галасоў, сярод дзікіх вокрыкаў варты, сярод пранізлівага ўжо восеньскага холаду, сярод цяжкіх разважанняў пра гэты дзень і жахлівыя для маёй айчыны вынікі гэтага, гледзячы на цяжка пароненага сябра, прамучыўся я ўсю ноч, найжудаснейшую, якую толькі чалавеку можна перацярпець.

Світанне, нарэшце, разагнала цені той страшнай ночы. Касцюшка прачнуўся, як чалавек, прыведзены да прытомнасці пасля глыбокага летаргічнага сну. Пабачыўшы мяне раненага каля сябе, запытаў:

— Што гэта ўсё значыць? Дзе мы?

— На жаль! — адказаў я. — Мы пораненыя і з'яўляемся маскоўскімі палоннымі, я з табою і не пакіну цябе ніколі.

— Эх! Як жа, — вымавіў ён слабым голасам са слязамі на вачах, — у няшчасці маім я ёсць шчаслівы, калі маю такога вернага сябра.

З радасцю ўспрыняў на той час, што Начальнік не быў так небяспечна паранены, як мне здалося і чаго я злякаўся. Падышлі маскоўскія афіцэры, што не дазволіла нам працягваць размову далей.

У першы дзень вайсковыя справы не давалі Ферзену магчымасці займацца намі. Узнагароджаныя гэтай нядбайнасцю мы былі толькі да сённяшняга ранку. Толькі цяпер, пасля ўціхамірвання гвалту святкавання пасля атрыманай перамогі, пачалі маскалі думаць аб дакладным на-

шым вартаванні. Вызначылі афіцэраў і жаўнераў, якія нас павінны былі пільнаваць, падслухоўваць і ні на хвіліну з нас не спускаць вачэй. Да Касцюшкі быў прыстаўлены Іван Пятровіч Цітоў, маёр, да мяне — капітан Зміеўскі, да Фішара, ад'ютанта Касцюшкі, — паручнік Карпэн. Да іх яшчэ далучылі капітана Удома, паручніка Мітрава і некалькіх грэнадзёраў. Мелі яны загад, хутчэй інструкцыю, пра якую я пазней даведаўся, не спускаць з нас ніколі вачэй, не дазваляць нам размаўляць паміж сабою, сачыць за кожным нашым учынкам і быць уважлівым да кожнага слова, і штодзень пра ўсё, што заўважылі, пачулі, пагадзінна пісаць рапарты пра свае назіранні.

А 10-й гадзіне мелі мы візіт генерала Ферзена, які прыйшоў адведаць Касцюшку.

— Спачуваю Вашай горкай долі, — вымавіў ён, — але такі лёс у жаўнерскага рамяства.

Не ўмеючы размаўляць па-французску, сам будучы немцам, ён размаўляў па-нямецку, а я яго перакладаў, бо Касцюшка не ведаў ні нямецкай, ні маскоўскай мовы. На тым размова і скончылася. Па тоне Ферзена, цвёрдым і сухім, хутка я змог заўважыць, што пазней мне пацвердзілі самі маскалі, што Ферзен чуў, напэўна, пра мае прамовы на сейме і мае друкі і лічыў мяне за найгалоўнейшага ворага Кацярыны і ўсяго маскоўскага роду. Гэтае самае хутка мне пацвердзіў і генерал Серакоўскі. Адкрыццё такіх адносін да мяне ўжо тады падказала, якая помста і якія цяжкасці мяне чакаюць.

А 12-й гадзіне, у поўдзень, патройны залп з усіх гармат і ручной зброі, бубны, літаўры, трубы невыносным гукам адзначылі ўчарашні хуткі трыумф перамогі магутных над слабымі. Якое сумнае для нас святкаванне! Адно суцяшэнне, не быў, аднак, гэты трыумф без цяжкіх для маскалёў страт: лічылі яны, што амаль кожны наш пяты жаўнер забіў ворага. Нам аплакваць засталося палкоўніка Крыцкага, маладога чалавека найцудоўнейшай адвагі і найпрыгажэйшай паставы. Сярод іншых загінуў там і мой сваяк, мужны капітан Баруслаўскі. На жаль, у той дзень загінула і мая айчына. Калі Касцюшка не меў талентаў першага ваяра, то ён меў душу, якая не выносіла ярма, адвагу, меў невычэрпную здольнасць дзейнічаць. Параўнаўшы паходы 1792 г. і яго ў 1794 г., у сцяснёных межах, з малой жменькай рэгулярнага войска, колькі ж ён здзейсніў баёў, як усюды непакоіў непрыяцеля. Калі пазней, праз некалькі тыдняў, бачылі мы магутных манархаў, якія стаялі некалькі хвілін ля ахвяр захопніка, ён жа цэлых сем месяцаў з трыма магутнымі суседзямі, калі не прадухіліў смерць айчыны, то пазбавіў, аднак, нас усіх ад сораму загінуць без славы.

Пасля таго, як скончыўся гул стральбы даў Ферзен абед на сто асоб, на які запрасіў і нашых генералаў. Чулі мы з дому жахлівае выццё. Банкет гэты гаспадару не каштаваў і граша: разаслалі яны казакаў па акрузе, забіралі

тыя па дамах віно, мяса, хатнюю птушку, прыправы, срэбра і ўсё, што патрэбна было да банкету — усё тое было нарабаванае. Ферзен у час банкету быў ветлівы з нашымі генераламі, нават піў за здароўе Серакоўскага, Князевіча і Каменскага.

Дазволена нам было ў той дзень напісаць лісты ў Варшаву і дамагацца, каб прыслалі нашы рэчы. Левай рукой (правай не мог паварушыць), начарціў некалькі слоў да генерала Заёнчака і ваяводшы Зыберг, просячы, каб нам прыслалі слуг і нашы рэчы. Назаўтра яшчэ адпачывалі пасля бітвы, а можа і пасля банкету. **13 кастрычніка, у панядзелак, усё войска з палоннымі рушыла нарэшце з месца ў паход.** Генерал Касцюшка ехаў у малым экіпажыкашы з доктарам, нас траіх — генерала Князевіча, мяне, Фішара і стоража нашага Цітова ўмясцілі ў вялікай карэце. Эскадрон кавалерыі акружаў наш экіпаж. Пасля доўгіх карагодаў нарэшце рушылі мы. Што за неабсяжны табар экіпажаў, вазоў, вазкоў, калёсаў кібітак — войска, хіба, Дарыўша магло выставіць падобнае. Не магло вока ахапіць шарэнгаў, што цягнуліся ў тры рады. Ні адно войска не вядзе вайны з такімі вялікімі выгодамі. Генерала суправаджаюць карэты і брычкі, кожны афіцэр мае, прынамсі, хоць адзін экіпаж. Прускі кароль у сваіх успамінах кажа, што ў 1737 г. у вайне маскалёў з туркамі налічана было ў войску фельдмаршала Муніха столькі павозак, колькі жаўнераў. Узважыўшы, якім спосабам праводзілася з намі вайна, здзіўляцца такому шматлікаму табару непатрэбна. Складаўся ён з нязмернай здабычы, забранай па палацах паноў і па дамах больш-менш заможнай шляхты. Не толькі рыштунак, але карэты, коней, жывёлу забірала гэтае здабычлівае войска. Генералы, палкоўнікі, штабы спраўлялі гэты марш у цудоўных карэтах з гербамі польскіх родаў, спраўлялі яго з жонкамі, наложніцамі, гардэробшчыкамі, з кухарамі, са світаю ўласных слуг. Стары генерал Ферзен ехаў у цудоўнай карэце ліловага колеру са срэбрам, запрэжанай шасцю прыгожымі сівымі конямі, забранымі ў Пулавах. Збоку таго старца сядзела шаснаццацігадовая дзяўчына, прыгожая, як анёл, але свавольная і пустая. Пасля бою, калі ні адзін з нас не меў на сабе кашулі, яна кінула маёру Фішару, ад'ютанту Касцюшкі, жаночую сваю кашулю, мне даў палкоўнік Маранцаў сваю.

Сунуліся ў сярэдзіне расцягнутага непрыяцельскага войска, якое ж яшчэ сумнае чакала нас відовішча! Што за жудасны выгляд, калі, адсюль выязджаючы, напаследак убачылі на дзядзінцы нашых палонных, рэшткі нашага незалежнага рыцарства, тыя гарматы, тыя харугвы на маскоўскіх вазах. Ашаламляльны, пэўна, выгляд, вялікіх ценяў Стэфанаў, Жалкевічаў і Хадкевічаў! Ці хтосьці гнаў па пустынях тых варвараў, хтосьці захопліваў іх сталіцы, а сёння вашых спутаных патомкаў вядуць!

Дзве тысячы нашых палонных, рэшткі войска, ішлі наперад з сумна звешанымі да зямлі галовамі, за імі 20 забраных у нас гармат, далей воз,

на ім два альбо тры штандарты з польскімі арламі, пышна вышытымі срэбрам. Гэтае відовішча мы ледзьве маглі трываць.

Цягнуліся далей міль шэсць, вечарам, у канцы дня прыбылі ў Карытніцу. Тут затрымаліся на цэлы дзень, і толькі цяпер пачаў я адчуваць нясцерпны боль у маёй правай руцэ. Каля 10-й гадзіны прыйшла з Варшавы павозка з багажом Начальніка і яго слугамі: Мурзынам Джонам і Станіславам Балінскім, кухарам; прыбыў таксама з клуначкам мой слуга Францішак Бендзяхоўскі, усё гэта пад аховаю ад'ютанта Касцюшкі Бяданскага. Найвышэйшая Народная Рада напісала да Начальніка ліст, які перадала праз яго ад'ютанта, былі ў тым лісце ласкавыя і высакародныя выказванні. Рада прапанавала ахвяраваць маскоўскаму генералу ў замен за вызваленне з палону Касцюшкі ўсіх палонных маскоўскіх генералаў, афіцэраў, жаўнераў, якіх у нас было да 3000. Ахвяра гэтая не была прынята. Праз ад'ютанта Бяданскага Рада прыслала Начальніку 4000 дукатаў, залатую табакерку і тры гадзіннікі. Касцюшка палову гэтай сумы пакінуў у сябе, другую палову аддаў нашым палонным афіцэрам і жаўнерам.

Хутка пасля прыбыцця нашых рэчаў вызначыў Ферзен камітэт са сваіх бесцырымонных афіцэраў для дакладнага агляду ўсяго нашага багажу. Адкрылі куфэркі, развязалі клумкі, клумачкі, і ўсё толькі, што ў іх было, выпатрашылі на падлогу. Пачалі ўсё раскладваць, аглядаць, пераварочваць, кожны фант па некалькі разоў пераварочвалі, каб пераканацца, ці няма зброі, атруты альбо нейкага схаванага ліста. Тут някемлівае глупства добрага майго, беднага Францішка адкрыла ім хутка шчодрае жніво ўсяго таго, што шукалі. Непрадбачлівы гэты чалавек замест таго, каб пакласці ў клумачак мой бялізны, патрэбных рэчаў і іншых рыштункаў, напхаў яго ўсялякімі друкамі, якія выдаваліся мною ў часы Канстытуцыйнага сейма, пасля сейма і напісаны былі ў маім італьянскім падарожжы. Хутка сябе праславіць можна, таму што ні мужу бойкай Кацярыны II, ні народу маскоўскаму ў тых пісаннях не было літасці. Сярод іх у тым клумку знаходзіліся: фрагмент «Бібліі Шчэснага», «Элегія на другі падзел Польшчы», «Ліст да таргавіцкіх здраднікаў» *(верагодна мова ідзе пра верш «На верхаводаў таргавіцкіх».— Аўт.)*, «Форма ўраду Таргавіцкай канферэнцыі», у рукапісе — «Падарожжа да Італіі» і шмат лістоў ад вучоных таго краю. Фрагмент «Бібліі Таргавіцкай» быў поўны іроніі і найбольш злосны. Трэба было бачыць радасць таго новага ўраджаю мытнікаў ад выгляду такой кантрабанды. Якая радасць для маіх ператрасачоў. Пахапалі ўсё да найменшай паперкі і занеслі свайму военачальніку, а потым знішчылі. Вось так глупства майго добрага Францішка нямала дапамагло той жорсткасці, якая пазней да некаторых палонных была ўчынена ў маскоўскай турме, а таксама і да мяне.

## Эскорт

Праз два дні далейшага маршу генерал Ферзен атрымаў загад ад фельдмаршала Суворава, каб ён паспешна рухаўся да злучэння з яго вялікім войскам, якое цягнулася пад Варшаву. Ферзен неадкладна аддзяліў 2000 найгоршай часткі свайго войска пад камандаю генерала Хрушчова, каб той, навакольнымі дарогамі, правёў нас да маскоўскіх граніц і далей у глыб Масквы. Найсуровейшымі былі інструкцыі, дадзеныя яму адносна нашай аховы і віжавання за намі, аж да найменшых дробязяў. Пад такім вось дазорам праехалі мы Холмскую зямлю, Валынь, Падол і нашу Украіну. Наш марш толькі да Заслаўля трываў чатыры тыдні. Такім чынам, мелі мы час і зручны выпадак пазнаёміцца з нашымі стражамі: добра назіраць за іх характарамі, мараллю, звычаямі вышэйшых і ніжэйшых нашых назіральнікаў. Пра іх, і пра далучаных пазней у тым падарожжы, кароткія нататкі.

Акрэслю тут гэта коратка, каб паказаць, што гэта за такі маскоўскі народ, захопы якім суседзяў зрабілі яго вядомым і страшным і якога сапраўдная каштоўнасць так мала вядома.

Цары і царыцы маскоўскія правяць з неабмежаваным самаўладствам. Грамадская думка, плён святла і цывілізацыі, пад якімі ў Еўропе нават найвышэйшая ўлада згінаецца, невядомы маскоўскаму люду — цёмнаму і дзікунскаму. Ва ўсялякіх паўстаннях, якія не раз узрушвалі царскі трон, не людзі старадаўняга роду і вызначэння былі віноўнікамі, а адвага і дзёрзасць ішла з ніжэйшых слаёў грамадства, і вырашальныя адмены тычылі не лёсу народа, а толькі лёсу тых, хто павінен быў правіць краінай.

У народзе, якому невядомы прыроджаны гонар, ні памяць даўніх заслуг; у манархіі, *якая яшчэ не налічвае нават аднаго стагоддзя сваёй значнасці* ў Еўропе, толькі хтосьці можа вылічваць чыны продкаў, спасылацца на гісторыю, якая дзе-нідзе мае прывілей значнай вагі. Ласка, узнагароды ўсемагутнага Гаспадара апускаюцца часам да ўзвышэння галавы, часам да таго, каб яна пакацілася па зямлі. Дабрачыннасць, сумленнасць, гонар — ні ў якай цане, але адвага, ваенныя здольнасці прыцягваюць увагу пануючага ў народа, які прабывае ў бясконцых войнах. Афіцэр знакамітага таленту пэўна будзе ўзвышаны. Большая частка маскоўскіх правадыроў узнеслася з ніжэйшых радоў да найвышэйшых вайсковых ступеняў, і Хрушчоў быў з гэтага ліку.

Атлетычнай выглядала постаць Хрушчова: у прапорцыях мужны і ганарысты сабою, на выгляд як бы адкрыты і фамільярны. Высокі — не менш шасці стоп (*стапа — прыкладна раўнялася 30 см*) вышынёю, плячысты ў меру, меў постаць рымскага гладыятара, рысы твару прыгожыя, у абыходзе з іншымі выяўляў як бы шчырасць, якую, праўда, набываў толькі ў ваенным лагеры. Што да маральнасці, то яна была

агульнай для ўсіх яго суайчыннікаў: хітрасць, хцівасць, рабаванне, абжорства. Найвыдатнейшымі з іх яму пасавалі дзве апошнія. Чыніў ён найпаскуднейша абдзіранні і рабаванні, не толькі без усялякага сораму, але нават з нейкім выхваленнем. Яму здавалася, што красці і разбойнічаць — гэта ёсць адна з умоў таемнага саюзу з ягонай манархіняй; гэта значыла, што ён павінен быў ісці туды, куды яго пасылала гасударыня, а яна тым самым дазваляла яму там ўсялякія рабаванні, лютасць і абдзіранні. І чаму ж чыніць гэтага ён не мог? Чаму іншаму магло навучыць яго выхаванне і ў маладосці, і ў старасці? Так што развіваўся ён з унутраным задавальненнем у кірунку найбрыдшай подласці.

Да таго часу, як былі мы аддадзены пад дазор Хрушчова, ён ужо меў больш за сорак вазоў, нагружаных разнастайнымі рэчамі, прыбранымі да рук з дапамогай рабункаў. Казеніцы, зімовы палац польскіх каралёў (месца нараджэння Жыгімонта Аўгуста), Казеніцы, кажу я, 13 міль ад Варшавы, было значнейшым месцам тых паноў для іх жніва. Палац не быў надта багата абсталяваны, таму што кароль наязджаў туды толькі зімой на паляванне на аленяў і дзікоў, але там быў цэлы зімовы каралеўскі гардэроб, рэдкія каштоўныя футры, збор найсучаснейшай зброі, склеп быў шчодра напоўнены адборнымі вінамі. У адзін дзень усё гэта было разбіта, забрана, апранута тымі, хто мог красці больш і хутчэй. Трэба заўважыць, што ні адзін ніжэйшы афіцэр, ні адзін жаўнер да тых рабункаў не меў аніякага дачынення, ім дазволена было абдзіраць мяшчан і сялян з іх рыштункаў і быдла. Хвала рабавання палацаў была пакінута выключна вышэйшым і штабным афіцэрам.

У Казеніцах, дзе ксёндз Сярчынскі, на той час мясцовы пробашч, паспеў вывезці да сябе каралеўскае срэбра, Хрушчоў застаў толькі багатыя футры, найкаштоўнейшую зброю і іншыя цудоўныя каралеўскія рэліквіі; што найкаштоўнейшае, роўна як і ўсю піўніцу, забраў Хрушчоў, ніжэйшым афіцэрам пакінуўшы лішкі. Іван Пятровіч Цітоў, наш ахоўнік, распавядаўшы нам аб тым рабаванні, скардзіўся са слязамі на вачах, што яму дасталіся толькі адны фіранкі, здзёртыя з ложка каралеўскага камердзінера.

Пулавы, месца пражывання князёў Чартарыйскіх, найжахлівей пазналі варварства маскалёў. Замак быў там упрыгожаны як пышна, так і з густам. Вялізная зала з пазалачонымі люстрамі, фарфорам, франтонамі з малюнкамі Боўхера, не менш багатыя княжацкія пакоі, карціны, бібліятэка — забраны альбо пасечаны былі на кавалкі. Не пашкадавалі і паркаў. Нейкі Бібікаў, злучаўшы цвыркаванне французскага цырульніка з маскоўскім варварствам, быў Ахілесам *(адзін з трох найсмялейшых герояў у грэчаскай міфалогіі, асаджаўшых Трою.— Аўт.)* той экспедыцыі.

Чым далей мы рухаліся, тым больш павялічваўся табар Хрушчова з ягонай здабычай; гарады, мястэчкі, вёскі, найбольш дамы вясковай шляхты — усё заставалася зрабаваным, спустошаным, разбітым. Нягледзячы на тое, што дашчэнту былі і так спустошаны нашы валасці і мястэчкі, паўсюль Хрушчоў яшчэ накладваў і кантрыбуцыю. Частка войска, вызначаная адзіна да нашага пільнавання, рухалася праз спакойныя землі, але знішчаныя, дзе не было ніводнага польскага салдата, аднак Хрушчоў накладаў і тут кантрыбуцыю, разбураў і рабаваў усё. Найзаможнейшыя дамы былі першымі ахвярамі яго прагнасці. Спосаб рабавання ў яго быў заўжды такі, як апісана гэта ніжэй.

Як толькі Хрушчоў прыбываў да значнейшага дома ў якім-небудзь месцы, зараз жа нашых палонных зачынялі ў стадолах, маскоўскіх салдат рассялялі па хатах. Сам Хрушчоў з жонкай, дарослай дачкою, пляменніцай і малымі дзецьмі размяшчаўся ў доме ўладальніка, апанаваўшы ўвесь дом. Нас размяшчалі ў афіцынах. Неадкладна кожны з ад'ютантаў Хрушчова і афіцэраў штаба ляцелі да выдзеленага кожнаму дэпартамента рабавання. Адзін з іх з некалькімі грэнадзёрамі спускаўся ў прорву цёмных піўніц і забіраў там усё віно, якое адшукваў; другі ляцеў да стайні і выводзіў адтуль найлепшых коней; шмат іншых разбягалася па мястэчку, накладаючы на жыхароў кантрыбуцыю; там іх мучылі, замыкалі ў свінарніках габрэяў, пакуль не выдзіралі з тых апошнія схаваныя грошы.

У той час, калі ад'ютанты Хрушчова такім чынам спраўлялі сваю службу, сам ён, найвышэйшы военачальнік, з жонкай, малымі дзецьмі, дачкою і пляменніцай абягалі ўсе пакоі ўладальніка палаца і там не раз у прысутнасці ўладальніка з дасціпнымі жарцікамі адчынялі камоды, забіралі тое, што там было, здымалі са сцен гадзіннікі, карціны, гравюры; забіралі гатавальні, люстэркі, мэблю, кніжкі — словам, усё, што толькі было ў доме, і гэта ўсё рабілася са смехам і жартамі.

Павінен сказаць, што не прапускалі нават дзіцячых забавак: адзін з сарака асабістых вазоў з трафеямі Хрушчова загружаны быў цалкам такімі цацкамі. Пацешна было глядзець на той стос перамешаных паміж сабою драўляных коней, малых возікаў, лялек, трубачак, палацаў з кардону і т. п. Малы Іван, малодшы пяцігадовы сынок Хрушчова, што датычыцца лялек і забавак, то быў, відаць, найбагацейшым дзіцём ва ўсім свеце, калі ўжо ў пяць гадоў пазнаў нуду і сытасць ад такога багацця, якое высыпалася перад ім. Як толькі затрымліваліся на прывал альбо начлег, адразу ж перад Іванушкам выкладаліся ўсе тыя скарбы; спачатку бавіўся імі хвіліну, беручы цацкі адну за другой, далей ламаў і кідаў іх на зямлю. Быў то малы Байран, які сярод усялякага лішку нудзіўся і сабою, і ўсім іншым.

За паўгадзіны да абеду вярталіся высланыя ў экспедыцыі на рабунак афіцэры, кожны з якіх пра свой паход здаваў рапарт: столькі бочак і бутэ-

лек віна, столькі жарабцоў, столькі клячаў, столькі тысяч злотых золатам, столькі манетаю, столькі таварам. Калі нажыва была шчодрая, што найчасцей і здаралася, Хрушчоў, паціраючы рукі, са смехам вымаўляў: «Очень хорошо! Очень хорошо!» — і ў добрым настроі садзіўся за абед.

Ежы было без меры. Празмернасцю і сытнасцю вызначаліся стравы, а яшчэ лепш было, калі ежа плавала ў тлушчы, была запраўленая шафранам, перцам і імбірам, і тым гучней выкрыкваў Хрушчоў: «Очень хорошо! Очень хорошо!» — і пражорліва глытаў ежу. Зараз жа пасля абеду ён сам і ўся яго сям'я клаліся спаць і храплі аж да вечара. Пасля заходу сонца не прабуджваліся інакш, як праз усялякае брынчанне лыжачак, філіжанак і імбрычкаў да чаю. Разам усе схопліваліся і садзіліся да чаю, п'ючы яго кубак за кубкам. Колькі пры тым ішло гарачых пірагоў, аладкаў і т. п. Акрамя здобы, печыва і сочыва наступала чарга разносіць на добра запоўненых срэбраных падносах канфіцюры, разынкі, міндаль, фігі, нарабаваныя па склепах у яўрэяў. Усё хутка змяталася за гуляннем у карты аж да шчодрай яшчэ вячэры. Такім быў іх спосаб жыцця на працягу ўсяго паходу.

Як адрозніваўся пры гэтым наш стан ад гэтай звярынай раскошы Хрушчова. Мы разам з тым цярпелі і фізічныя, і маральныя мукі. Усе тыя гучныя банкеты дрэнна, на жаль, адпавядалі нашаму няшчаснаму становішчу. Чацвёра афіцэраў і столькі ж грэнадзёраў ні на хвіліну не спускалі з нас вачэй. Генерал Касцюшка, здавалася, быў лепшы, чым я, раны якога былі небяспечнейшыя, і ўжо амаль зацягваліся, праўда, ён адчуваў пры гэтым, што неяк страчваў сілы ў нагах.

Што да мяне, то ў параненай маёй руцэ альбо праз няўмеласць цырульніка, які мяне адразу кепска агледзеў, альбо праз разрыў куляй мноства малых жыл, болі і мукі былі нязноснымі, якія мусіў я цярпець. Боль быў не столькі ў самой ране, колькі ў далоні гэтай рукі. Рана і ўся рука распухлі, як калода, можа, праз затрымку крывацёку, і тым самым прычынялі мне боль і паленні, не даючы ні хвіліны адпачынку. Боль адняў у мяне таксама сон. Лежачы на саломе ў хаце ў слабым святле свечкі, усе ночы жаласліва стагнаў, не знаходзячы суцяшэння ні ў сабе, ні ў суровым твары салдата, які сядзеў пры мне. Часам чалавек, крануты маімі скаргамі, клікаў падхірурга, якога звалі Ксенафонам, той прыходзіў з рондэлькам, у якім была развараная мука, якой ён абкладаў маю руку.

Сам хірург прыдумаў дасціпнае лякарства, загадваў мне класці руку ў гарачую ваду, але і гэта не змяншала ні маіх боляў, ні крыкаў ні днём, ні ноччу. Енчанні мае сталі нязноснымі маёру Цітову так, што ён прапанаваў цырульніку, каб той адрэзаў маю руку. Хірург, выведзены таксама з цярплівасці, ужо пацвердзіў, што не існуе іншага спосабу, як адняць руку, і ў Радзыні збіраўся да гэтага прыступіць — нават інструмент прынёс.

Прыгавор гэты, можа, і быў бы даведзены да выніку, і я застаўся б толькі з леваю рукою, калі б не воля Вышэйшага, па якой неспадзявана ў Радзынь прыбыў наш штабс-хірург, першы хірург нашага войска, француз Майгнайн. Ён быў прысланы ад улады, каб даведацца пра стан нашага здароўя. Зірнуўшы на маю ўспухлую руку, вымавіў па-французску, што маскоўскі хірург быў аслом і дрэнна мяне агледзеў з самага пачатку. Пан Майгнайн, агледзеўшы раны, загадаў пусціць кроў і прыпісаў прыпаркі і пластыры, што хутка прынесла нейкую палёгку ў маіх пакутах. Добры гэты чалавек, прысланы ад нашай улады, прывёз для мяне ад майго прыяцеля Мастоўскага запас рваніны для перавязак, чорную кітайку для нашэння рукі на перавязі і «Жыццё Плутарха і Гарацыя». Назаўтра Майгнайн павінен быў ад'ехаць.

Затрымаліся мы на цэлы дзень для адпачынку ва Уладаве. Ведаючы, што мая сястра замужам за Дуніным *(Антаніна Урсын Нямцэвіч.— Аўт.)* непадалёку адсюль жыве, звярнуўся да Хрушчова, каб ён дазволіў паслаць па яе. Столькі атрымаўшы ветлівасці ад майго радзіннага дому — але не адмовіў. Прыбыла яна з мужам і двума дзецьмі, малой дачкою і сынам. Якім чуллівым было наша спатканне, на жаль (!), апошняе, таму што больш яе я ўжо не ўбачыў. Размова наша ішла ў прысутнасці прыставаў: хаця і пад прымусам, аднак была салодкай для сэрцаў брата і сястры. Гаварылі мы пра нашых братоў, сёстраў і сваякоў. Сястра мая абавязкова хацела пабачыць і перавязаць мае раны, аднак, відаць, з-за таго, што яна была цяжарная, ёй гэтага не дазволілі. Да вечара мы са слязамі як брат з сястрою развіталіся.

Знаёмая Хрушчова, як і ўсе мае блізкія, таксама лёгка атрымала дазвол на спатканне са мною. Колькі ж было балючых размоў і праліты слёз, якія, аднак, нас, афіцэраў, звычайна абміналі. Прывезлі мне цэлую пасцель, з якой узялі толькі падушкі. Праз колькі кароткіх хвілін нам загадалі развітацца.

Праз два дні мой стрыечны брат, рэвяціцкі стараста, што памёр гродзенскім губернатарам *(Станіслаў Урсын Нямцэвіч.— Аўт.)*, пісаў да мяне ў канверце Хрушчова, паведамляючы, што бацька і мае браты, хаваючыся ад непрыяцеля, яшчэ не адважыліся вярнуцца да знішчанай сваёй воласці. Перадаў таксама, што ў агульнай нястачы і руінах ледзь змог для мяне пазычыць пяцьдзясят дукатаў, якія і перадае праз пасланца, і не можа, на жаль, дапамагчы больш.

Такім чынам, мы пачалі рухацца па Валыні і Падолу, правінцыямі, захопленымі ў час паўторнага падзелу ВКЛ, якія ў апошнім паўстанні не прымалі аніякага ўдзелу, аднак адшукалі мы і там сляды вайны 1792 г. Атрымліваючы кожны дзень ад ганцоў Суворава і Ферзена данясенні, на Валыні Хрушчоў даведаўся, што па краіне разнеслася вестка, як бы

сапраўдны Начальнік Касцюшка выйшаў цэлы з бітвы пад Мацяёвіцамі, і таму маскалі, каб нагнаць страху на палякаў, замест яго вязуць фальшывага Начальніка. Гэты досціп быў варты маскалёў, якія мелі столькіх фальшывых Дзмітрыяў, Пятроў. Каб знішчыць гэтую вестку, усюды, дзе мы спыняліся на адпачынак, быў дадзены загад Хрушчову склікаць уладароў і навакольных абывацеляў і паказваць ім генерала Касцюшку.

Смутнымі былі гэтыя спатканні з нашымі землякамі, маглі мы гаварыць ім толькі тое, што было дазволена ў прысутнасці нашых стражаў. Хвіліны гэтыя былі аднолькава атрутнымі як для гледачоў, так і для нас. У параненым правадыру бачылі яны замардаваную сваю айчыну. Колькі слёз узаемных! Дагэтуль людзям паказвалі толькі драпежных звяроў, сёння адбывалася наадварот.

У Астрогу, адным з перадавых гарадоў на Валыні, апынуліся мы ў моцным маскоўскім гарнізоне, пад кіраўніцтвам генерала Льва Разумоўскага, сына казацкага гетмана, які з простага казака, быўшы царкоўным дзякам, спадабаўшыся царыцы Елізавеце і стаўшы яе каханым і мужам, прыйшоў да найвышэйшых ступеняў і непамерных багаццяў, атрымаўшы абшары маёмасці нашых Вішнявецкіх. Стараннае выхаванне з малых гадоў у маладым Разумоўскім нічога не пакінула маскоўскага: быў ён ветлівы, далікатны і, больш за тое, чалавечны. Наведаў нас, прыслаў нам тое, у чым толькі была неабходнасць, а таксама вельмі добрую вячэру і назаўтра запрасіў на абед, але я з-за бязлітасных боляў у руцэ не мог быць у яго. Наперакор усяму далі мне даволі шмат опіуму. Правёўшы бяссонную ноч, пад вечар у суправаджэнні майго Аргуса (*у грэчаскай міфалогіі шматвокавы велікан*) быў у стане зрабіць да Разумоўскага свой візіт. Знайшлі дом генерала поўным гасцей: найбольш было маскалёў, трохі палякаў, у т. л. пані Поўпарт, жонка французскага генерала, які быў на польскай службе, але зараз ужо знаходзіўся на маскоўскай; была яна са сваёй сястрой паннай Камінскай, абедзве цудоўныя і чуллівыя. Яна і яе сястра, поўныя абаяльнасці, не стрымлівалі сваіх слёз перад намі. **А што можа быць саладзейшае для суцяшэння, чым сляза, што ўпала з вачэй чароўнасці?**

У тым жа доме першы раз пачулі славутую маскоўскую музыку з рагоў, што называлася проста рогі, дзе кожная нота выдавалася асобным музыкантам. Аркестр складаўся больш як з шасцідзесяці чалавек, таму што кожны з іх выдаваў толькі сваю ноту. Вельмі незвычайна цяжкі спосаб выканання музыкі, які толькі шчодрай раздачай кіёў можа быць дасягнуты.

Цітоў, пазіраючы на нашых дам, заўважыў мне па-французску: «Вашы польскія пані таксама цудоўныя, як і нашы, але нашы паўнейшыя і маюць большую стапу». Не сталі мы дыспутаваць пра гэтае першынства.

Два дні затрымаліся мы для адпачынку ў Астрогу, для чаго спыніліся ў езуіцкім кляштары. Раніцай у дзень ад'езду пасля бяссонна праведзе-

най у цяжкіх муках ночы, калі яшчэ, пакутуючы, ляжаў у ложку, пачуў на калідоры ўстаўны гоман і ўдары, падобныя на тое, як бы нехта трапаў сукно, але мацнейшыя, і праз гатычныя скляпенні кляштара яшчэ доўга тыя ўдары аддаваліся. Калі ўбачыў увайшоўшага да нас майго калегу маёра Фішара, ад'ютанта Касцюшкі, то запытаў яго, што гэта за такі нязмучаны слуга, што так дбае пра сукно свайго пана, якое трэпле ўжо больш за паўгадзіны. «Які слуга, — выгукнуў Фішар, — якое сукно, то два капралы па загадзе Цітова старанна лупцуюць палкамі нашага цырульніка Ксенафона».

«О, Ксенафон! — ускрыкнуў я. — О, у яго ёсць, прынамсі, аргумент у запасе: гэта дзесяць тысяч грэкаў *(маецца на ўвазе старажытнагрэчаскі пісьменнік і гісторык, які стаў военачальнікам дзесяці тысяч наёмных грэкаў.— Аўт.)*. О, высакародная штука лекарская, як жа вас трактуюць!». Тут Цітоў пачаў смяяцца да ўпаду з майго здзіўлення.

«Што ж такога бедны Ксенафон зрабіў?» — запытаўся я ў Цітова. Брыдка адказаў маскаль: «Няшмат злога, але ўжо вельмі даўно не атрымоўваў кіёў, загадаў даць яму іх, каб не адвучыўся ад гэтага, інакш з лайдацтвам справіцца нельга». Калі ж рушылі з мястэчка, угледзелі Ксенафона на маршы, які спяваў, свістаў, як бы нічога з ім і не здарылася.

Цягнуліся мы да Заслаўля аж чатыры тыдні: выязджалі з начлегаў а восьмай гадзіне раніцы, праехаўшы некалькі міль, каля трэцяй гадзіны дня, спыняліся на папас і там начавалі. Маскоўская конніца была перад кожным з нашых транспартных сродкаў.

Заслаўль — невялікае мястэчка з цудоўным замкам, які належаў князю Янушу Сангушку. Размясцілі нас у аўстэрыі, Хрушчоў жа без усялякага запрашэння з жонкаю і сям'ёй заехаў прама ў замак і размясціўся там.

Удзячнасць не дазваляе мне таксама забываць пра сведчанні прыхільнасці да нас нашых землякоў. Княгіня сама прыслала да нас маршалка двара даведацца, што нам патрэбна. Некалькі дзён нашага там прабывання з асабістай кухні князёў прысылалі нам штодзённа снеданне, абед і вячэру. Княгіня Любамірская з Сасноўскіх прыслала да нас маладога свайго сына з цёплым сукном, бялізнай, віном, кніжкамі. Пані Чацкая з дому Сангушкаў напісала да мяне ліст, каб даведацца пра наша здароўе, ліст вельмі чуллівы і прыяцельскі. Абедзве далучылі да гэтай ветлівасці, як ужо гаварылася, значны запас бялізны, сукна, найвышэйшых гатункаў віна і т. п., і т. п. Апошні раз атрымалі мы сведчанне чуллівай далікатнасці ад нашых землякоў і зямлячак. Ужо набліжалася хвіліна нашага смутнага развітання і з імі, і з гэтым светам. Адказалі і мы ім з найчуллівай удзячнасцю, таму што тыя добрыя пані нам столькі прыслалі рэчаў, што толькі частку іх мы маглі ўзяць з сабою. Але як толькі аддаліліся пасланцы,

то Цітоў і яго калегі заявілі, што ўсё прывезенае хворым непатрэбна. Пазабіралі рэчы і падзялілі паміж сабою, харчы і напоі з'елі і выпілі.

Гэтыя знакі такіх шаноўных нашых дам закранулі нас за жывое, яны былі адзіным суцяшэннем у нашым балючым становішчы падчас бяссонных начэй, сярод няспынных боляў і найсмутнейшых думак.

17 лістапада прыбыў кур'ер ад Суворава з паведамленнем пра ўзяцце штурмам Прагі і, як ён сказаў, «погуляню», гэта азначала жудасную разню таго мястэчка, у якім ужо па ўзяцці бессардэчна вынішчалі жыхароў. Таксама прынёс ён нашым стражам інструкцыі, як пільнаваць нас далей. Але аб гэтым да нас даходзілі толькі невыразныя чуткі, пра якія мы маглі толькі здагадвацца, чуючы ўстаўныя размовы шэптам паміж Хрушчовым, Цітовым і іх калегамі. Гэтыя размовы трывалі паміж імі ў асобнай хаце з важнічаннем, ганарлівым задзіраннем галавы і сакрэтнымі нарадамі паміж Цітовым і Хрушчовым. З вязнямі і калекамі яшчэ ўжываць сакрэтнасць і прыроджаную дэспатызмам падазронасць? У тых, хто знаходзіўся ў кіпцюрах хітрага і варварскага люду, гэта ўсё выклікала трывожнасць і недаверлівасць.

Бачылі мы, што мае наступіць нейкая перамена, напэўна не найлепшая, таму губляліся ў здагадках, меркавалі, што нас завязуць у глыб Масковіі, можа ў Сібір, можа аж да Камчаткі. Усё прыходзіла на думку, акрамя жудаснага зняволення, якое нас чакала. У хуткім часе даведаліся, што Хрушчоў атрымаў загад заставацца са сваім войскам і нашымі палоннымі; Касцюшку ж, мяне і Фішара пад дазорам Цітова, трох афіцэраў, грэнадзёраў у абозе і коннага эскорту, праводзіць далей. Але тайным заставалася яшчэ месца нашага суправаджэння: можа кудысьці ў глыб Масквы, а можа ў Сібір?



Вечарам Хрушчоў прыслаў да мяне данясенне, што княгіня Сангушкава жадае мяне пабачыць і развітацца са мною. Неадкладна з маім стражам Цітовым адправіліся мы ў замак. Княгіня, напэўна, у цэлым з-за боязні прынесці сябе ў ахвяру маскалям, пасля прывітання ўзяла мой бок і пасля чуллівых слоў і спачування над маім лёсам сказала мне наступнае:

— У вашых уласных руках знаходзіцца ваш лёс, выбіраць можаце паміж найраскошнымі ўзнагародамі і вечнымі мукамі строгай кары зняволення, усё залежыць ад тваёй шчырасці. Напэўна, выбераш першае: адкрыеш усе таямніцы рэвалюцыі, выявіш імёны тайных віноўнікаў, якія вас да гэтага найбольш падахвоцілі.

— Пані, — адказаў я, — рэвалюцыя наша не мае таямніц, падахвоціла яе сама царыца: яе разбор Польшчы, яе насілле, яе прыгнёт, нарэшце, яе здзек з няшчаснага народа; адтуль разгубленасць, але, прынамсі, згінуць са зброяй у руках. Калі ж Бог не даў шанцу добрай справе, але не дапусціў, прынамсі, каб мы з ганьбай і подла загінулі, то калі ж і былі грамадзяне,

што нас шчодра падтрымлівалі, ні турма, ні смерць не прымусяць мяне да выяўлення іх імён.

— Але не адкрыеце нават імён?

— Не! Найгоршая пакута не прымусіць мяне выставіць для помсты дабрачынных маіх землякоў.

— Спачуванне пану ад душы з-за вашай упартасці, — сказала княгіня і тут жа аддалілася ад мяне і стала шаптацца з Хрушчовым. Так закончылася напружаная размова, ініцыяваная Хрушчовым.

Скалануўся я, як гэта ж такая полька магла ўзяцца за падобную негацыяцыю. Але княгіня Сангушкава ўсё жыццё шукала выгаду асабістым целам, а любоў да айчыны не пераходзіла ў яе межаў Заслаўскай воласці.

Вяртаючыся да аўстэрыі, раптам да мяне звярнуўся Цітоў:

— Хіба д'яблы нададуць, не разумеў ніколі, каб вас заслаць у месца з добрай назвай.

Не хацелася далей тлумачыць, што я і Фішар зрабілі ўжо выснову пра добрае месца. Напэўна нас пашлюць да Ноўгарада, Казані альбо Астрахані, таму што ўжо бачылі, што такіх, як мы, не трымаюць у Пецярбургу.

Папярэдзілі нас, што заўтра на досвітку рушым: так што пачалі мы рыхтавацца да таго невядомага падарожжа. Вечар сцярпелі ў прыгатаванні да падарожжа. Назаўтра пабудзілі нас перад світанкам. Было сыра і пранізліва холадна, але можна было трываць, круціла густая снежная замець, словам, уся панурасць глухой восені. Калегі нашы, генералы Князевіч, Серакоўскі, Камінскі, усе школьныя таварышы і мае прыяцелі, якіх асобна было прызначана везці да Кіева, брыгадзір Копаць, пазней высланы на Камчатку, шмат іншых, прыйшлі, каб апошні раз развітацца з намі. Дагэтуль нам было забаронена размаўляць паміж сабою, канешне, бачылі адзін другога, прынамсі, што былі разам. Часам, незразумела для нашых стражаў, маглі некалькімі значнымі для нас словамі абменьвацца, і з гэтай асалодай цяпер мусілі развітацца, таму што заставаліся адны. Толькі Бог ведае, ці давядзецца нам калі-небудзь пабачыцца. У няшчасці нашым, у балючым становішчы яшчэ дадалося і развітанне. Поўнае слёз развітанне спыніў гучны голас Цітова, што патрэбна ўжо рассаджвацца.

Нарэшце выехалі. Цітоў з двума афіцэрамі, Фішар і я селі ў вялізную телегу (*так Нямцэвіч назваў тып крытай карэты.— Аўт.*). Генерал Касцюшка са штабсхірургам селі ва ўласны кош[4]. З тылу абодвух экіпажаў сядзела яшчэ па два грэнадзёры, а два ў асобнай кібітцы; перад экіпажамі спераду і ззаду ехала конніца.

Яшчэ дзень не абазначыўся. Холад быў пранізлівы, а снег, змешаны з градам, біў па замёрзлых шыбах телегі, так што цяжка было распазнаваць

4 Так у польскамоўным арыгінале.— Аўт.

прадметы за акном. Дарога, поўная калдобін, напалавіну замерзлых, але ў тлустай раскіслай зямлі калёсы западалі па самыя восі. Пранізлівы холад, вільготнасць павялічвалі боль у маёй ране, які рэзка і цяжка аддаваўся пры штуршках. Але больш за ўсё — сучаснае, будучае, вестка пра разню ў Празе, апошняя страта нашай айчыны, пра якую нам паведалі нашы стражы — душыла нас журбой і смуткам: думкі абцяжарвалі мой розум. Дасюль бачылі мы, прынамсі, сваіх землякоў і таварышаў нядолі нашай, нягледзячы на стараннае вартаванне, часам маглі мы прамовіць пра сябе слова і ўздыхнуць разам. Цяпер жа вакол было чужое, жорсткае. Непрыязныя вартавыя, лёс безпрытульных бацькоў, братоў, блізкіх, знішчэнне іх маёнткаў, бязлітасны лёс, які чакаў нас саміх, а толькі няпэўнасць, якога роду пакута была наперадзе, — усё гэта разам акунала нас у балючыя роздумы.

Цітоў, які быў дагэтуль з намі досыць ветлівы, хаця праяўляў гэта адносна павярхоўна, цяпер, альбо ад атрыманых суровых інструкцый, альбо ад адсутнасці начальніка над сабою, стаў у момант тонам вышэйшай улады і смешнай павагі, прыняўшы пры тым ганарлівы і непрыязны выгляд. Бачыўся ў ім дасканалы склад саманадзейнасці, грубіянства і лютасці. Гэты чалавек быў увасабленнем няўмельства, фанабэрыі і злосці, адважны ў баі, як гэта мне паведалі, але яшчэ больш хлус і злодзей, чым мужны. Яго таварышамі былі: капітан Астафій Астафавіч Удом, хітры, але далікатнейшы за іншых; Зміеўскі, нахабны і піяка; Мітроў, просты і добры чалавек; малады паручык Карпен; Фінляндчык, фальшывы, але лепшага выхавання ад іншых. Такімі вось былі нашы пільнавальшчыкі, якія з нас ні днём, ні ноччу не спускалі вачэй ні на хвіліну. Замест прыроджанага спачування шляхетным душам нічога большага мы не чулі, як грубыя насміханні і дзікунскія шпількі.

Рухаюся далей у гэтых маіх успамінах, тым лепш, што бачу, як гэта было расцягнута і далёка заходзіць у дробязях. Пісаў пра гэта, калі быў у Злучаных Штатах Амерыкі, хутка пасля майго вызвалення, таму ўсе акалічнасці яшчэ былі свежыя ў памяці, іх апісаннем саладзіў журботу сваёй самоты.

Хутка пасля нашага раздзялення з Хрушчовым, капітан Удом, які быў выхаваны ў Польшчы і меў саладжавыя манеры паводзін, які часта ўспрымаў і стрымліваў грубіянства Цітова, таемна для вышэйшых начальнікаў выехаў да Варшавы. Мэтай гэтага падарожжа было пабачыцца са сваёй апякункай, менавіта, з княгіняй Гагарынай, удавою, муж якой загінуў у часе рэвалюцыі ў Варшаве. А таксама прывесці ў парадак сябе і Цітова ад ног да галавы, даставіць Цітову не толькі пакінутыя там рэчы, але і яго Евушку, наложніцу. Тое падарожжа павінна было трываць тыдні два-тры, і ён павінен быў нас дагнаць.

Ад'езд Удома сторазова пагоршыў наш стан, мы былі пакінутыя цалкам на волю дзікіх капрызаў Цітова. Вызвалены ад Удома, які Цітова не раз прымушаў адтэрміноўваць яго нястрыманасць, цяпер ён смела пераступіў усе межы сораму і прыстойнасці. Ферзен, аддзяляючыся ад нас, даў Цітову тысячу чырвоных злотых на расходы нашага падарожжа і наша ўтрыманне. Аднак, пакуль мы яшчэ былі ў Польшчы, усё жыхары мусілі дастаўляць нам задарма, калі ж выехалі ў межы забранага краю, далей у маскоўскія межы, за жыўнасць і коней сплачваў Цітоў не больш паловы кошту, а часцей і ледзьве трэць адпушчанай квоты траціў; толькі раз на дзень даваў нам сціплы абед, за вячэру і за ўсялякія там напоі плаціць мы ўжо мусілі з уласнай кішэні. Цітоў жа з самага пачатку гэтыя грошы прызначыў для сябе і сваіх таварышаў. Калі мы праязджалі Броды каля Дубна, Цітоў набраў за выдзеленыя на нас грошы тавараў у жыдоў гэтага мястэчка і экіпіраваў сябе бялізнай, сукном, футрам і г. д., а таксама справіў не толькі па некалькі кашуль сваім таварышам, а прыбраў іх ад ног да галавы.

З паштовых двароў — падобныя ж крадзяжы, што можа быць больш варварскіх учынкаў. Улюбёным заняткам Цітова было біць паштовых людзей, а калі тыя хаваліся, біць коней, сабак і ўсё, што толькі пападала пад рукі. Гэтай лютасцю выклікаў такі перад сабою жах, што паштмайстары, даведаўшыся, што ён ужо набліжаецца да станцыі, пакідалі будынкі, пакідалі там коней, не жадаючы яму плаціць. Усё гэта памнажала даходы Цітова.

Праз тры дні пасля нашага раздзялення з Хрушчовым прыбылі мы да Менджыбога, маёмасці князя Адама Чартарыйскага, генерала падольскіх зямель, зараз сканфіскаваных на карысць царыцы, і там спыніліся. Непадалёку адсюль у Галасткове пад Менджыбогам знаходзіўся славуты і найлепшы ў Польшчы статак князя, які складаўся з тысячы кабыліц і ста пяцідзесяці польскіх, арабскіх, іспанскіх і англійскіх жарабцоў, не лічачы маладога прыплоду. Напэўна такога цудоўнага і такога шматлікага статка не было нідзе. Але ўсё было раскрадзена генераламі альбо прададзена на карысць вялікадумнай Кацярыны па нягоднай цане. Такой была тая Кацярына, якую ўзносілі да неба Вальтэр, Д'Аламбер і Дзідро.

У Менджыбогу знаходзілася галоўная стаўка маскоўскага войска ў забраным краі. Салтыкоў быў там найвышэйшым военачальнікам, там жа размяшчаўся гарнізон пад яго камандаваннем. Нас размясцілі ў кляштары. Назаўтра рана прыслаў генерал Салтыкоў паведамленне, што з-за слабага здароўя не можа нас наведаць, але пасылае свайго ад'ютанта са спачуваннямі над нашым няшчасцем і гарантыямі, каб мы не мелі прычыны баяцца і былі за свой лёс спакойныя і ўскладалі давер на неабмежаваную імператарскую дабрыню. Нічога не бойцеся, паўтараў ён безупынна.

Мы пабачылі, што афіцэр, які прыйшоў да нас, даволі ўжо немалады, але ў капітанскім мундзіры. Было відаць, што ён мае нейкую прымушаную манеру паводзін і добрую выхаванасць.

Пасля тых усялякіх суцяшэнняў і запэўніванняў выехалі мы з Менджыбога. Якім жа было наша здзіўленне па выездзе, калі выпадкова ад нашых стражаў, якія шапталіся паміж сабою, праз п'янага Мітрова пачулі, што той прытворны ад'ютант Салтыкова нікім іншым не быў як самім Салтыковым, першым каханкам Кацярыны II і сапраўдным бацькам Паўла I, але спачатку Кацярына пад сябе яшчэ прыбрала Станіслава Аўгуста *(Панятоўскага)*. Павел тым самым пусціў на свет пануючых байструкоў. Для чаго Салтыкоў з намі разыграў камедыю, навошта тыя пераапрананні, прыкідванні, тыя салодкія ўцехі, адказаць я не магу.

Якраз у той час, калі ён з аднаго боку з намі размаўляў лагодна, то з другога боку даваў Цітову найсуровейшыя інструкцыі. Загадаў яму, каб той кожны дзень высылаў яму рапарт не толькі аб тым, як рухаліся мы па дарозе наперад і пра здароўе, але пра кожнае вымаўленае намі слова. Быў гэты абавязак для Цітова нязносны, таму што слыў ён апошнім невучам, ледзьве чытаць мог. Як жа тут скласці, як жа напісаць гэты рапарт? Такім чынам, кожны вечар клікаў ён на дапамогу вучонейшых за яго сваіх калег Зміеўскага і Карпена. Не ведаю, няўжо Віргілію каштавала столькі працы яго цудоўная Энеіда, колькі масквічынам тым іх штодзённыя рапарты. Позна вечарам збіраліся яны для гэтага апісання, колькі ж кожны выраз, кожнае слова на шалі сваіх досціпаў разбіралі, важылі. Не раз начаваць нам прыходзілася ў двух малых пакойчыках, з якіх адзін для Цітова быў, другі для нас усіх; а то не раз хата была адзінай, у якой усе мы мясціліся покатам. Дык вось, у хуткасці аўтары рапарта збіраліся да працы. Колькі разоў, лежачы на саломе і прытварыўшыся як бы я сплю, мог чуць іх напружанні над гэтымі ўзвышанымі кампазіцыямі, іх спрэчкі пра гладкасць стылю, моц выразаў. Якія былі спрэчкі адносна выбару выразу, думак, расстаноўкі слоў, якім усё потым выглядала дзікім і бяссэнсавым; не раз мусіў закрываць галаву плашчом, каб не чулі мяне, і душыцца ад прыпадкаў смеху.

Не ведаю, альбо ад той цяжкай і важнай працы пісання рапартаў, альбо туга па волі ад валачэння па гэтай працяглай дарозе знудзілі Цітова, і ён штодзень рабіўся ўсё больш нязносны і прыкры, штораз больш злы і нецярплівы. Не існавала прыкрасці, якую ён нам не зрабіў. Найбольшай раскошай для яго, найвялікшым задавальненнем было са здзекам і злараднасцю лаяць Польшчу і палякаў. Хоць і палоннымі былі мы, але я і Фішар не маглі гэтага знесці і жыва ставілі ў рамкі недалікатнасць падобных размоў. Напружана перакладалі яму, як гэта непрыстойна і недалікатна з яго боку такім вось чынам насміхацца з бяззбройных палонных. Але і гэта не замыкала яму вусны. Тады распачалі трымаць сябе ў найглыбокшым

маўчанні. Нарэшце ўбачыўшы, што гэта на дзікуна аніяк не ўздзейнічае, вырашылі нічога не гаварыць і чытаць кніжкі. Як толькі хутка пачынаў ён свае паклёпы, я, як бы іх не чуючы, браў кніжку і пачынаў чытаць. Ён штораз больш далёка заходзіў у сваёй з'едлівасці, а я штораз больш у кніжку.

Раззлаваны да рэшты Цітоў, што ж гэта ён робіць? Падымае драўляныя шторы, засоўваючы вокны карэты, каб не даць мне чытаць, мяркуючы, што адняў святло для гэтага. Але, на яго няшчасце, была ў дошках значная шчыліна, якая дазваляла святлу даходзіць, да якой я, прыклаўшы кніжку, прадаўжаў чытаць яе далей. Цітоў са злосці пачынае кусаць губы, нарэшце адзываецца, каб скарыць мяне снарадам сваёй эрудыцыі:

— Можаш чытаць сабе колькі хочаш, — заяўляе ён, — але ніколі не будзеш такім вучоным, якім быў Пігмаліён.

— Пігмаліён, — усклікнуў Фішар, прыпадняўшыся ад смеху, — што ён напісаў?

— Пігмаліён, — адбіваецца Цітоў, — не смейся, бачу, што з усім вашым чытаннем не ведаеце, што Пігмаліён, маючы маладую дзяўчыну, высечаную з мармуру, навучыў яе гадаць, чытаць і пісаць.

Змоўклі мы, пераглянуўшыся, а Цітоў працягваў з трыумфам па-французску:

— Не, не ведаеце! Не, не ведаеце!

Калі б, прынамсі, грубіянскія дзівацтвы Цітова абмяжоўваліся толькі прасторам телегі, але ён станавіўся непараўнальна лютым, калі і высаджваўся з яе. Толькі гаспадар аўстэрыі альбо паштмайстар выходзіў для прывітання, зараз жа Цітоў сустракаў яго шматразовым ударам па твары з жорсткай лаянкай; выходзіў жа паштальён з коньмі, Цітоў хапаўся за біч, ляцеў да яго і ўвесь час хлыстаў неміласэрна, пакуль той запрагаў каня. Калі гаспадар змог схавацца, а паштальён па нешта аддаляўся, і ў гэтым выпадку Цітоў не заставаўся бяздзейнасным: узброены заўсёды вялікім бізуном, хлыстаў ім дзяцей і прасталюдзінаў, якія сабраліся каля телегі, а калі і тыя разбягаліся, накідваўся на коней. Невыносным цяжарам было для нас назіраць за гэтай безупыннай лютасцю. Можна адкрыта сказаць, што ўсе месцы, дзе мы спыняліся, заліты былі слязамі, а не раз і крывёю.

Нарэшце, паказаліся пазалочаныя шпілі кіеўскіх вежаў. Загад быў: ні ў адным вялікім месцы не прыцягваць да сябе ўвагі, таму прымусілі нас аб'ехаць вакол Кіева і затрымацца ў хатцы аднаго папа за некалькі вёрстаў ад горада. Тры гадзіны затрацілі мы, каб пераправіцца праз Днепр. Цітоў цэлы дзень страціў на Кіеў; я, знясілены, зараз жа кінуўся на ложак.

У Кіеве знаходзяцца падзямеллі Пячорскай Лаўры, дзе ў раках, напоўненых аліўкавым алеем, пахаваны 70 маскоўскіх святых мучанікаў, усе прыбраныя ў багатае адзенне. Кіеў — Мекка для маскалёў, таму кожны

з іх, просячы аб уратаванні сваім, мае абавязак хаця б раз у жыцці наведаць гэтае святое месца. У 1787 г. бачыў тыя рэліквіі.

Цітоў такі ж забабонны, як і люты, не быў выключэннем, яшчэ ўчора акроплены слязамі і крывёю няшчасных паштальёнаў, паштмайстраў і дзяцей, якіх бязлітасна лупцаваў нагайкай, сёння з засмучоным сэрцам і пакорным чалом ішоў наведаць гэтае святое месца.

Вярнуўся ён вечарам вельмі радасным і ўзнёсла апавядаў сваім таварышам, як чыніў паклоны перад святымі, як маліўся. А потым, як яго сэрца было рэлігійна ўзрушана, калі наблізіўся да спачылых старцаў, якія ляжалі ў алеі, якімі салодкімі былі яго пачуцці, калі поп, зняўшы шапачку з галавы мучаніка, паклаў яе на яго галаву, і як пры канцы тым алеем, у якім знаходзіліся святыя, намазаў чало, вочы і вусны набожнага маёра. Цітоў, акрапёны крывёю няшчасных яшчэ ўчора, здаваўся сабе сёння ўсхваленым духам набожнасці і пакорнасці.

Тым жа яшчэ вечарам неспадзявана ўваліўся да нас ганец, пасланы з Пецярбурга Аляксеем Мікалаевічам Самойлавым, пракурорам і міністрам тайных спраў цара. Быў гэта маёр Ахматаў, які з салдата ўзнёсся да ступені маёра. Чалавек просты, але добрай душы, калі так можна выказвацца аб нашых усіх стражах, але гэта быў насамрэч добры чалавек. Лепей была яго народная прастата і няведанне, чым смярдзючае паскудства нашых стражаў.

Кацярына баялася, што Цітова з прыданым яму эскортам было недастаткова для аховы трох палонных параненых, і прыслала ў дапамогу яшчэ афіцэра Ахматава. Гэтае дзяленне ў кіраўніцтве не прыйшлося ў цэлым Цітову да смаку, аднак жа, фальшывы і здатны прыкідвацца, ведаў, як гэта прыкрыць. Лагоднасць і прастата навапрыбыўшага ў хуткасці дала Цітову перавагу над прастаком. Маёр Ахматаў, урадавы кур'ер для тайных спраў Самойлава, міністра сакрэтных спраў вязніцкіх, быў найцямнейшы, недасведчаны чалавек: не ведаў, што Еўропа, што Азія — блытаў; не ведаў колькі хвілін у гадзіне; апавядаў, што рыба бялуга мае даўжыню з вярсту, а калі яе рыбакі выцягваюць з вады, плача і просіць рыбакоў яе адпусціць; хваліўся, як у час шведскай вайны, калі камандаваў адной маскоўскай невялікай галерай, у марской бітве пад Svenska Sund былі атакаваныя большым, чым яго, суднам, бараніліся колькі маглі, убачыўшы, што далей гэта сэнсу не мае, вымушаны былі спусціць сцяг і ўжо падалі знак, што здаюцца, але, калі шведы спынілі агонь і падышлі зусім блізка, ён неспадзявана адкрыў па іх агонь з усіх гармат і стрэльб, змяў шведаў і адышоў. Яму гэты спрытны ўчынак удаўся аж два разы. Цітоў увесь аж заходзіўся ад цудоўнага фіглярства Ахматава.

Але прыбыццё гэтага новага стража дало нам нейкі адпачынак ад грубіянства Цітова і прынесла карысць, таму што Цітоў, цалкам паглы-

нуты размовай з Ахматавым, менш нас мучыў. Любячы бясконца балбатаць, чынячы розныя пытанні Ахматаву, даваў нам спакой.

Аддаляючыся ад Кіева, павінен успомніць пра лёс нашых калег, з якімі рассталіся ў Заслаўлі. Завезлі іх да замка фельдмаршала Румянцава, які быў канфіскаваны ў гетмана Агінскага. Такім чынам, спыніліся перад ім генералы Серакоўскі, Князевіч і Камінскі, якіх ветліва прыняў Румянцаў, і, напэўна, згодна дадзеных яму інструкцый, прынёс ім у падарунак царскую ласку, больш за тое, калі б яны пагадзіліся пайсці на царскую службу, атрымалі б тыя ж самыя чыны. Усе трое, хоць і былі народжаныя без маёмасці, адмовіліся ад прапанаванага ім ахвяравання. Серакоўскі палічыў за лепшае пайсці за настаўніка да сыноў князя Сангушкі; Князевіч узяў невялікую на Валыні арэнду ажно да таго часу, калі змог трапіць да новага Польскага легіёна, які фарміраўся ў Францыі і з якім пазней так праславіўся; Камінскага з жонкай і дзяцьмі прытуліла ў сваім доме пані Мнішкава, маршалкова Вялікага княства. Так гэтыя бедныя верхаводцы пагадзіліся на нізкае існаванне для сябе ад узвышэння ў непрыяцельскай айчыне.

Праз два дні дарогі прыбылі мы да Чарнігава, цудоўна збудаванага з дрэва горада, які таксама, як і Кіеў, перад гэтым сто гадоў належаў да Польшчы (!), пакуль Ян Сабескі, поўнасцю заняты вайною з туркамі, не ўступіў яго цару Міхаілу Аляксеевічу за невялікую суму. Чарнігаў амаль увесь драўляны, але пабудовы дасканалыя: маскалі выдатныя майстры ў цяслярстве. Жыхары Чарнігава яшчэ да гэтага часу захоўваюць шчырую прыхільнасць да даўняй айчыны, многія з іх носяць нават польскі строй. Пасля абеду прыйшлі да нас два афіцэры родам з палякаў з непамерна вялікай пасудзінай цудоўных яблыкаў з просьбай, каб мы ад іх гэты падарунак прынялі. У момант, калі нашы стражы на хвіліну аддаліліся, звярнуліся да нас па-польску: «Спачуваем вашаму лёсу, кроў польская цячэ ў нашых жылах, але, на жаль...» — прынесла тут Цітова, так што размова тут жа спынілася.

Не толькі Чарнігаў быў чыста і роўна забудаваны, апрача таго вёў горад гандаль ужо гатовымі струганымі дамамі. Усё дрэва было прашнуравана, што дазваляла разабраны дом перавезці як мага далей і за дзень потым злажыць і паставіць дом. Ва ўсіх маскоўскіх значнейшых гарадах маюцца таргі з гатовымі дамамі на продаж. Ад часу, як мы пакінулі польскія граніцы, гэта значыць пасля Чарнігава аж да самага Пецярбурга, не бачылі мы ўжо ні адной сярэбранай манеты: усё папяровыя банкноты альбо медзь. Медзь складалася з цяжкіх вялікіх пятакоў. За дзесяцірублёвы білет патрабаваўся вялікі мяшок пятакоў. Гэтых апошніх везлі мы з сабою непамерна многа мяшкоў. Калі хацелі мець серабро, трэба было даць у той

час сто рублёў паперамі за 40 сярэбраных манет. Для вандроўнікаў было нявыгадна вазіць з сабою такі цяжар з пятакоў.

Уехалі мы, нарэшце, у Белую Русь, землі, забраныя ў 1773 г. Кацярынай II. Пачынаючы ад Гомеля, 20 міль урадлівага, апрацаванага і цудоўнага краю яшчэ нядаўна з'яўляліся ўласнасцю заможнага роду князёў Радзівілаў. Мінулі Гомель і іншыя значныя валоданні Радзівілаў і Агінскіх, якія пыхлівая Кацярына раздавала сваім наложнікам альбо правадырам. Гэтыя былі забраны царыцай і аддадзены Румянцаву.

У Магілёве яшчэ раз пераправіліся праз Дняпро і затрымаліся толькі для таго, каб перапрэгчы коней. Магілёў з'яўляўся значным і гандлёвым горадам, разам з паветам быў калісьці каралеўскай эканоміяй ці сталовымі валоданнямі. Сёння сталіца аднайменнай губерні. Перад паштовым домам збеглася мноства даўніх нашых землякоў, хутчэй праз спачуванне, міласэрнасць да няшчасных, чым з цікаўнасці. Ніколі не забуду між імі сямідзесяцігадовага старца найшляхетнейшай постаці ў польскім строі. Доўга ён стаяў непадалёку, утаропіўшыся ў нас з жаласлівым выразам вачэй, пакуль яны чулліва не напоўніліся слязамі, тады ён, нарэшце не вытрымаўшы, з распацёртымі рукамі паспяшыў да карэты, як бы, прынамсі, злучыць свае далоні з нашымі. Але на няшчасце паказаўся неміласэрны Цітоў, як заўсёды, з нагайкай у руцэ абы-аблажыць ёй шаноўнага старца, каб той спехам адсунуўся, што няшчасны старац ледзьве паспеў зрабіць.

Назаўтра начавалі ўжо ў Шклове, гандлёвым месцы, якое калісьці належала князю Адаму Чартарыйскаму, ваяводзе рускаму, якое той мусіў прадаць Зорычу, каханку царыцы Кацярыны.

Гэтая, далёкая цяпер, мэтрэса мужчын Кацярына заснавала ў гэтым горадзе сваё трывалае знаходжанне, прыгнятаючы яўрэяў і хрысціян. Пражываючы тут у найвышэйшай раскошы, акуналася ў празмернасці: трымала італьянскі тэатр, залажыла нават рыцарскую школу, жыла ў найлепшым акружэнні: ела, піла, іграла — і разам з тым усім заўсёды нудзіла і была найнешчаслівейшым чалавекам на свеце. Царыца абагаўляла Зорыча і кахала яго да самазабыцця. Ён жа, надзьмуты гэтым шчасцем, уяўляў, што яму дазволена ўсё.

Гуляючы аднойчы ў більярд з Пацёмкіным, пасварыўся з ім так моцна, што ў прысутнасці Кацярыны па-маскоўску ўдарыў яго кіем, потым схапіўся за зброю і бегаў за ім. Абураная гэтай дзёрзкасцю Кацярына загадала неадкладна свайму каханку ад'ехаць да Шклова. Уплыў Пацёмкіна на розум царыцы быў мацнейшы, чым яе любоў да каханка. Зорыч назаўжды застаўся выгнаны з Пецярбурга да сваёй уласнасці. Там, купаючыся ў дастатку і ўцехах, вольны ад усялякіх павіннасцяў і турбот, не пераставаў Зорыч уздыхаць, праўда, менш па страчанай каханцы і старой грацыі, чым па страчаным сваім уплыве і павазе. Але марна ён мучыўся і ўздыхаў,

таму што царыца Кацярына да таго часу змяніла ўжо пасля яго да двух дзясяткаў каханкаў, чым цешыла сябе заўсёды, што яшчэ да ласкі здатная і гэтая надзея ўтрымае яе сумнае жыццё. Зорыч жа не пераставаў карміць сябе надзеяй, што чарга пяшчотнасці няхай ужо старой Кацярыны, але яшчэ прыйдзе да яго.

Выпадак усё прадвызначыў. Корсакаў, наступнік Зорыча ў фаварытах царыцы, які на працягу года так знясіліўся, што да службы любоўнай аказаўся непрыгодны, і таму павінен быў сваё месца іншаму саступіць, але атрымаў ва ўзнагароду канфіскаваную маёмасць побач са Шкловам, якая межавала з маёмасцю Зорыча. Там два гэтыя смутныя манументы пажадлівасці Кацярыны з агульным лёсам злучыліся ў найшчаслівейшым сяброўстве, часта наведваючы адзін аднаго. Не раз Зорыч, вышмыгнуўшы з тлуму сваіх забудоў, ехаў да Корсакава, дзе, зачыніўшыся разам з ім у цёмным памяшканні і не маючы сведкаў сваіх размоў, апрача вазы з пуншам, праводзілі ночы ў паклёпніцтве на сённяшніх фаварытаў царыцы, прыпамінаючы сваю страчаную павагу і надзяляючы сябе ўзаемна таемнасцю асаблівасцей любоўнай даўняй барацьбы з Кацярынай і адчутай з ёю асалодай.

Бесцырымонныя гэтыя размовы, калі б былі запісаны, утварылі б вялікі том дадатку да кахання дванаццаці цэзараў.



Не павінен апусціць рэдкага выпадку сапраўднай галантнасці Зорыча перад сваёй даўняй каханкай. Калі Кацярына ў сваім падарожжы да Крыма павінна была праехаць праз Шклоў, Зорыч, яе даўні наложнік, сустрэў Кацярыну на каленях, яе і ўвесь двор як найпышней частаваў і прыгатаваў для яе дужа прыемную неспадзяванку. Пасля вячэры, калі патрэбна ўжо было аддаліцца да спальні, Зорыч падаў Кацярыне руку. Якім жа было яе ўражанне, калі яна знайшла, што апынулася ў сваіх уласных пецярбургскіх пакоях. Мелі яны той жа самы памер, тое ж аздабленне сцен, мэблю, тыя ж самыя, нават, у ложку фіранкі. Не існавала больш далікатнага спосабу пераканаць Кацярыну, як паказаць ёй, што памятае ён пра дарагія з ёй любоўныя асалоды, якія моцна запалі ў яго памяці. Сцвярджаюць, што чуллівая манархіня дазволіла, каб Зорыч на хвіліну сваім учынкам пецярбургскіх апартаментаў напомніў ёй пра сябе, за што Мамонаў, фаварыт таго часу, моцна крыўдзіўся.

Паміж Оршай і Віцебскам дагнаў нас пасланы таемна ў Варшаву капітан Удом. Чакалі яго з нецярпеннем усе. Я, таму што перадаваў праз яго лісты маршалку Патоцкаму і кроўнаму свайму Барыслаўскаму і чакаў, што ён прывязе адказы на мае пасланні, а з імі разам грашовую дапамогу. Іншай была падстава нецярплівасці ў Цітова: лічыў ён кожную хвіліну, каб убачыць сваю каханую наложніцу Евушку, якую Удом павінен быў яму даставіць з Варшавы. Была яна аб'ектам найвялікшай павагі і бязмежнай

любові маёра, але прабач Божа! Якім жа было яго здзіўленне, яго журба і смутак, яго, нарэшце, лютасць, як ён шалёна ўскіпеў, калі Удом данёс яму, што Евушка, гэты ўзор дасканаласці і чуласць яго закаханага сэрца, забраўшы ўсе яго манаткі, уцякла з адным казацкім палкоўнікам невядома куды.

Тут жа ўджалены Цітоў, гэты толькі што прыклад цнатлівасці і прыгажосці, ператварыўся ў крыніцу найабразлівых праклёнаў. Сваю нядаўнюю чароўную Евушку пачаў абсыпаць усялякімі абразамі і, б'ючы сваім моцным арапнікам па зямлі, дадаваў: «Ах! — крычаў ён. — Калі б я цябе схапіў, — прадаўжаў раўсці Цітоў, уздымаючы бізун угору, — як бы я цябе лупцаваў цяпер, забіў бы на гэтым месцы!». І, выкрыкваючы праклянцці ў адсутнасці Евушкі, неміласэрна калаціў бізуном па зямлі.

Калі прайшоў гэты прыступ раз'юшанасці, Удом адвёў яго ўбок і пачаў яму гаварыць, што ад набытай ім дрэннай звычкі біць людзей, коней, сабак і, нават, зямлю, якую ён яшчэ не пакінуў, ён мусіць яго перасцерагчы, таму што гэтым самым можна зрабіць сабе вялікую бяду. «Павінен ведаць, — працягваў Удом, — што па ўсёй дарозе, дзе ты праехаў, па ўсіх поштах і гасціных дварах нічога іншага не чуў і не бачыў, як толькі слёзы і скаргі на цябе, роўна як нараканні і праклянцці. Таксама бачыў пабітых табою і акрываўленых людзей са слядамі яшчэ крыві на шчоках ад тваіх удараў. Калі гэта не ўтаймуецца, а скаргі дойдуць вышэй да губернатараў тых краёў, а гэта Румянцаў і Рэпнін, людзі чалавечныя і адукаваныя, дык вось, калі скаргі на цябе дойдуць да іх, то замест спадзявання на ўзнагароды, можа чакаць цябе цяжкая кара».

Гэтае ўстрашэнне зрабіла ўражанне, і довады Удома не засталіся без вынікаў для жахлівага Цітова: цяпер ён рэдка калі хапаўся за кіі, батагі і бічы, не дазваляючы сабе больш, як толькі лаяння абразамі і праклянцямі.

Кроўны Барыслаўскі і маршалак Патоцкі адпісалі мне, і Удом прывёз іх лісты, якія наперад раскрылі нашы прыставы, а потым аддалі мне. Барыслаўскі даносіў да мяне, што Удом апрача невялікай колькасці бялізны і зімовага сукна не захацеў больш абцяжарваць сябе багажом, дадаў таксама, што перасылае мне вынутыя з маёй скарбонкі 200 чырвоных злотых. Барыслаўскі ў лісце пералічыў кожную рэч, што да мяне перасылаў, але я, апрача антыкварнай скарбонкі, са здзіўленнем замест двухсот дукатаў у золаце не далічыў там сто дваццаць дукатаў. «А дзе рэшта дзелася?» — запытаў я Удома. «Восемдзесят дукатаў, — спакойна адказаў Удом, — выдаў на экіпіроўку Цітову, трыццаць дукатаў узяў сабе. З часам разлічымся з вамі».

Божа! Не мог нават падумаць сабе, што за мараль, без сораму няшчасных вязняў абіраць?! Новы доказ маскоўскай маралі і далікатнасці. Пасля нашага вызвалення бачыўся з Цітовым, але сваіх грошай больш не пабачыў.

Праязджаючы праз Віцебск, угледзелі мы беларускіх халопаў, маладых і бадзёрых. Паназіралі трохі за гэтым натоўпам абарваных маладых вяскоўцаў. Калі ўбачылі, што мы палякі, яны знялі свае шапкі, каб ветліва нас прывітаць і тым самым адкрылі свае галовы. Ах! Які відок! Няшчасныя былі толькі напалову астрыжаныя, а другая палова галавы была ў валасах. Гэта былі рэкруты, прызначаныя да войска, а такім чынам паголеная напалову галава давала магчымасць у выпадку ўцёку лёгка апазнаць іх, схапіць і адправіць назад.

На працягу гэтай усёй нашай дарогі нам часта здаралася начаваць у драўляных палацах, пастаўленых наўмысна для царыцы ў час яе падарожжа ў Крым, у якіх Кацярына II штодзённа начавала. Везла яна з сабою ўсю сваю дваровую зграю, сваіх фаварытаў, ганаровых дам, замежных паслоў і г. д. Тысячы коней чакалі яе на кожным перапраганні. Зараз дазволена пражываць у гэтых дамах тым, хто трывае падарожжа з нагоды двара. На жаль, і нам дастаўся гэты смутны гонар: тыя ж самыя памяшканні, у якіх яшчэ нядаўна месціліся тыя, на каторых фартуна выліла ўсе свае дары, а сёння яны давалі прытулак тым, каго лёс абрынуў у бездань галечы і смутку. Тыя палацы, хаця і аголеныя ад мэблі, аднак захавалі сваё былое прызначэнне.



Праз два альбо тры дні дарогі за Віцебскам пакінулі мы даўнюю Белую Русь, забраную Кацярынай пры першым разборы Рэчы Паспалітай, і ўехалі ў Наўгародскую губерню, даўнюю Русь, забраную ў маскоўскія межы. З жалем і сорамам перад нашымі продкамі я мушу прызнацца, што калі просты люд увогуле нічога не набыў ад змены ўлады, то атрымалі шмат гарады, пазбаўленыя ўлады няшчасных калісь нашых старастваў. Няшмат клапоціцца дэспат пра сапраўдныя добрыя набыткі для сваіх падданых, уся ўласная хвала і любоў укладваецца ў тым, што павярхоўна кідаецца ў вочы. Акуратныя гарады, ганарыстыя грамадскія гмахі прымушаюць вандроўніка, не надта дасведчанага, кінуць на гэта свой позірк, а гэта азначае, да чаго звяртаюць свае старанні ўладары.

Першым значным маскоўскім месцам у Наўгародскай губерні былі Вялікія Лукі. Вялікія Лукі, Пскоў і іншыя гарады два стагоддзі таму былі полем найвыдатнейшых перамог і трыумфу адважнага нашага караля Стэфана Баторыя. Гэты ваяр мог бы прыкончыць назаўжды магутнасць цароў, калі б цар Іван Васільевіч не адправіў бы езуіта Пасевіна да папы рымскага Грыгорыя XIII, праз якога паабяцаў яму з усім сваім народам перавярнуцца ў рымскую веру, калі той угаворыць караля Стэфана спыніць далейшую вайну і заключыць з ім мір. Неасцярожныя і не абазнаныя ў маскоўскай хітрасці і кароль, і папа рымскі паверылі абяцанням. Кароль Стэфан, узяўшы Вялікія Лукі і Пскоў, далей не пайшоў і заключыў мір,

а цар, не перастаючы з'едліва гаварыць пра хуткую змену веры абодвум, застаўся ў сваёй схізматычнай веры.

Наўгародская губерня з'яўляецца ўрадлівай і прамысловай. Жыхары Вялікіх Лук і Пскова атрымалі ад царыцы некаторыя свабоды, таму іх гандаль значна павялічыўся. Маскоўскі народ тут актыўны і дзейны. Здаралася нам не раз начаваць у купецкіх дамах у заможных барадатых маркітантаў, якія займаюцца гандлем ад Камчаткі да Лейпцыга. Купцы гэтыя з вялікімі барадамі і ў азіяцкіх кафтанах сваімі таварамі звязваюць Еўропу і Азію, пераносячыся ад кітайскіх граніц аж да Лейпцыга і Франкфурта. Іх дамы акуратныя і ўсім забяспечаныя. Абраз Святога Мікалая ў адлітым сярэбраным адзенні і ў багатым акладзе найперш супыняе таго, хто ўваходзіць у дом, і разам з гэтым азначае заможнасць гаспадара. Гэты Святы з'яўляецца хатнім Богам, фетышам маскаля, займае ён, па іх меркаванні, месца адразу пасля царыцы, апярэджваючы пры гэтым Бога Айца. Як толькі жыхар Масковіі ўваходзіць у хату, ён адразу ж паварочваецца да Святога Мікалая, дзевяць разоў на яго перахрысціцца і дзевяць разоў адаб'е паклоны, кланяючыся аж да самай зямлі. Яны ўсюды з сабою возяць сваё Божышча Мікалаюшку: ён з імі заўсёды ў лагерах і абозах на вайне, ён знаходзіцца нават на караблях у моры.

У час апошняй нашай вайны ў 1831 г. шмат Святых Мікалаяў забрала наша войска разам з іх папамі. Самы вялікі алтар дастаўся генералу Скрынецкаму, які ён для бяспечнасці пераправодзіў у Галіцыю. Пазней бачыў я ў Або ў Фінляндыі ў шведскага контрадмірала падобнага Мікалая ў сярэбраным з пазалотаю адзенні, забранага таксама ў апошняй вайне. Але ці не з'яўляецца і Святы Антоній адміралам партугальскага флоту?

Тым часам ганцы з Пецярбурга штораз часцей сталі прыбываць да Цітова, штораз памнажаліся падбухторванні і шаптанні нашых стражаў. Нарэшце, Цітоў не стаў хаваць таго, што нас вязуць да Пецярбурга. Хіба ад злараднасці альбо ад няведання, ці ад зневажання альбо памылкі маёр Цітоў не пераставаў нас запэўніваць, з якой лагоднасцю і дабрынёю, павагаю і прыязнасцю мы будзем прыняты гасударыняй. «Убачыце, — звяртаўся ён да нас па-французску, — якая цудоўная і добрая гэтая манархіня, але вы павінны перад ёю ўпасці на калені, таму што Яе Імператарская Міласць гэта не кароль Іспаніі альбо Англіі».

Аднак нядоўга трываў той падман. Усё больш частымі станавіліся шаптанні кур'ераў з нашымі прыставамі. І хутка і гэтая невялікая вера, якую нам у такіх запэўніваннях запіхвалі ў галаву, была знішчана чарговым пасланнем да Цітова. Аднойчы на канверце пісьма да яго мы заўважылі наступны запіс адраса вялікімі літарамі: «Начальніку эскорта суправаджэння бунтаўшчыка Касцюшкі і іншых...». Божа мой! Як можна было так называць грамадзяніна чужога народа, вольнага і незалежнага,

які схапіўся за зброю, каб скінуць з сябе ярмо, выбрацца з далучэння дзяржавы самага несправядлівага і самага бязлітаснага.

Чым больш мы набліжаліся да Пецярбурга, тым больш нецярплівы Цітоў падганяў, як мог, наша падарожжа, нягледзячы ні на нашу слабасць і болі, ні на тое, што мацнелі маразы, раздражнялі яго нейкія ўцехі дарогі, толькі б хутчэй дабрацца да мілай сваёй сталіцы. Не зважаючы на кароткі дзень, будзіў нас у чатыры гадзіны раніцы і, даўшы па кубку кавы, пакаваў нас у тэлегу. Не забуду ніколі тых начных падарожжаў. Толькі белізна снегу, якая ахінала ўсё наваколле, прабівалася праз начную цемру і асвятляла дарогу. Не раз паўночны месяц разліваў па застылых нівах сваю крывавую чырвань. Часта мы ехалі густым чорным сасновым борам. Цемната і цішыня панавалі ва ўсёй прыродзе. Усё маўчала, толькі нашы стражы спалі і храплі, і яшчэ заставаліся мы ў маўклівым няспанні пад цяжарам асабістага жалю і смутку. Ад трывожнасці і суровага прадчування дабрачынны ўцякаў сон. Часам сухі трэск сасновых галін, якія ламаліся і падалі пад цяжарам снегу, абуджваў маёра. Тут жа ён, каб улагодзіць спалох і зноў заснуць, загадваў фурманам спяваць.

Маскоўскі люд мае рэдкую здольнасць да музыкі, іх галасы вельмі меладычныя. Акрамя італьянцаў не існуе такога люду, які мае да спеваў такую схільнасць, як яны. Нічога няма больш чуллівага і смутнага і разам з тым такога кранальнага, як іх песні і пачуццё, з якім яны іх спяваюць, напоўненае болем і рыданем, большая частка якога складзена з паўгукаў. Здаецца, што іх няволя, няшчасны, жаласлівы і ўбогі стан, у якім яны жывуць, выдыхаецца ў танальнасцях журботных скаргаў іхніх спеваў. Гэтыя плаксівыя галасы добра адпавядалі нашаму стану, таму не раз расчульвалі мяне да плачу.

Чым бліжэй была сталіца, тым мізэрней выглядалі нівы і край, таму што землі тут неўраджайныя і амаль неапрацаваныя, апрача невялікай колькасці аўса больш ніякае збожжа тут не расце. Каб мець флот, упёрся гвалтоўны Пётр I і залажыў сталіцу сярод балот, дрыгвы і марных верасоў. Што ёсць асаблівага ў гэтай бязмернай дзяржаве: чым бліжэй да сталіцы, тым больш прападае маскоўская мова. І нават каля Пецярбурга тут чужыя правінцыі, таму што люд размаўляе там на фінскай мове.

Доўга едучы неўраджайнымі стэпамі, нямала былі здзіўлены, пабачыўшы знянацку вялікі гатычны замак. Першае месца, якое нас уразіла, была Гатчына, пазасталічная рэзідэнцыя вялікага князя Паўла. Закладзены замак быў 60 гадоў таму і акружаны валам і перакопам. Пражыванне там Паўла зрабіла Гатчыну падобнай на нямецкае мястэчка. Пабудаваны замак быў нешта ў гатычным гусце, аднак не быў старэйшы за манархіню.

Нямала былі здзіўлены, затрымаўшыся каля шлагбаума і ўбачыўшы сяржанта ад грэнадзёраў, што падыходзіў да нас, зусім прускага: у востраканцовай футравай шапцы, абітай жоўтай бляхай, абцягнутага ў цесныя гамашы, словам, у даўнім уборы прускага войска Фрыдрыха II. Гэта быў батальён альбо полк на той час вялікага князя, а пазней Паўла I, які яму замест прысвоенага скіпетра ўлады дазволіла Кацярына мучыць і муштраваць па-пруску.

Нарэшце, каля трэцяй гадзіны пасля поўдня, калі ўжо пачало змяркацца, 1 снежня (17 лістапада) 1794 г. спынілася наша телега каля вялікага гасцінага двара ў Царскім Сяле, летняй рэзідэнцыі цароў і царыц. Царскае Сяло з'яўляецца маскоўскім Версалем, пабудаваным адначасова з Пецярбургам Пятром Вялікім. Упрыгожыў ён гмахі рознымі прадметамі хатняга ўжытку і цікавымі рэчамі, якіх панапёр ад розных манархаў у часы сваіх замежных падарожжаў. У Парыжы прыстаў да яго празмернай велічыні глобус Зямлі, у Берліне — цэлы кабінет з бурштыну, у Варшаве, ад Аўгуста II, шмат карцін, паміж імі карціна з выявай гетмана Жалкоўскага, які расстаўляе цароў перад Жыгімонтам III і Злучаным Каралеўствам.

Гэты палац служыў манархам толькі летам, калі станавіўся іх летняй рэзідэнцыяй. Занядбаў яе Павел I, але Аляксандр значна павялічыў і ўпрыгожыў. Кацярына II заўжды сюды прыязджала ў чэрвені і вярталася ў жніўні, гэта значыць на ўсё кароткае маскоўскае лета. Тут яна здымала з сябе бляск кароны і хацела, каб ёй верылася, што яна паходзіць на простую, адкрытую вясковую шляхцянку. А як жа! З тым жа ўсім: з простым сваім вялікім саламяным капелюшом, з чорнай кітайскай салопкай, са сваімі палачкай і парасонам у руцэ — добрая гэтая гаспадыня, вясковая шляхцянка, сярод капусты і морквы спакойна выдае загады на забойства мужа, цара Івана, Лізаветы Тараканавай, на ўсіх, хто станавіўся ёй перашкодай. Адтуль жа дэкрэты на высылку ў Сібір безліч тысяч палякаў і столькі ж сваіх, адным словам, толькі выгнанні і бізуны!

Бачылі мы Царскага Сяла столькі, колькі нам дазваляла ўбачыць акно той хаты, у якой нас замкнулі — шмат раскошнага месца маглі мы адтуль назіраць. Але адзінае прыпамінаю сабе: так гэта частку палаца і нейкую трыумфальную арку, якую Кацярына загадала паставіць свайму каханку Арлову, калі той у час чумы ў Маскве рызыкаваў там сваім дарагім жыццём. Непадалёку адсюль ёсць вёска Сафійская, дзе царыца для паўнамоцтва сваёй ролі завяла практыку чыніць пакаранне смерцю.

Трымалі нас у гэтай аўстэрыі больш за тры гадзіны ў найсуровейшай трывозе, пакуль, нарэшце, Ахматаў, пасланы наперад да Пецярбурга, не вярнуўся назад. Пасля паўгадзіннай з Цітовым нарады перавялі нас уніз і пасадзілі ў экіпажы. Ёсць у Маскве звычай прывязваць да дышла хуткіх паштовых карэт званочкі, каб іх гук папярэджваў іншыя экіпажы, і ўсе

павінны былі з'язджаць на абочыну гасцінца і саступаць ім дарогу. Першы раз сёння адвязалі гэтыя званочкі — рухаліся мы з найбольшай ціхатою і паволі шырокім гасцінцам, абсаджаным з двух бакоў мізэрнымі вербамі і бярозамі. Не затрымаліся мы нават каля шлагбаума, але ж разам з тым кружылі нас доўга па горадзе бязлюднымі малымі вулачкамі, паварочваючы то ўправа, то ўлева; сачылі, каб не запаміналі вуліц, па якіх круціліся, але гэта не прыносіла задавальнення. Усё было смутна прадказальным. З усялякіх мук, якія маскалі задаюць вязням, трэба адзначыць ненатуральную асцярожнасць, тайну, шэпты, жудасную скрытнасць, якая ёсць найжахлівай. Адчулі мы ўсё на поўную моц. Цяжка раненага, аслабленага, акружанага катамі ў сваёй уласнай сталіцы, — навошта такая таямніца і асцярога?

Спыніліся раптоўна. Ноч была цёмная і мароз траскучы. Наколькі гэта дазваляла цемната, удалося мне заўважыць дзве купкі фігур, закутаных у вялізныя футры і ў вялікіх воўчых, касматых шапках, якія закрывалі ім вочы. Больш за чвэрць гадзіны, якая для мяне паказалася вечнай, яны шапталіся паміж сабою на вуха. Нарэшце, адкрылі телегу і мне было загадана выйсці. Не меў больш часу, каб сціснуць Фішара за руку і развітацца з ім. Неяк пабачыліся мы пасля гэтага толькі праз восем гадоў. Хутка апынуўся я ўжо на зямлі, і тут жа дзве з тых упамянутых закаптураваных фігур схапілі мяне з двух бакоў пад пахі, заціснуўшы паміж сабою, і спешна павялі. Мае вушы ўтрымалі гвалтоўны шум вады і трэск кавалкаў ільдзін, якія штурхаліся між сабою. Правёўшы крокаў каля ста, канваіры яшчэ мацней мяне сціснулі, і, трымаючы з абодвух бакоў, пасадзілі ў шлюпку, поўнасцю накрытую. Гэтыя ж двое ўсадзілі мяне паміж сабою на лаву, двое іншых селі на дно шлюпкі каля маіх ног і трымалі мяне за ногі. Грабцы шлюпкі ў поўным маўчанні пачалі працаваць вёсламі. Нічога нельга было ні ўбачыць, ні пачуць, апроч толькі крыг, якія біліся паміж сабою, і не раз іх моцнае шараванне аб шлюпку, на маё меркаванне, магло яе поўнасцю раструшчыць.

Прызнаюся, што гэта быў момант для мяне адзін з найжудаснейшых: адчуў сябе не вайсковым палонным, а дзяржаўным злачынцам. Тая патаемнасць, тая цішыня, тыя ўсе жахлівыя асцярожнасці пераконвалі, што мяне на самай справе лічаць злачынцам. Вядомая заўзятасць, з якой Кацярына мела ласку аказваць мне гонар, не прадказвала нічога добрага. Сабраўся, наколькі змог, усімі сіламі розуму і мужнасці, каб адагнаць роспач, і ўвесь час гэтага цяжкага і суровага плавання паўтараў пра сябе пачатак оды Гарацыя: «Справядлівага і дужага...» (Гарацый тут развівае думку, што нічога не можа ўзрушыць справядлівага і дужага мужа).

Рымскі паэт у цудоўных сваіх рыфмах, лежачы на канапе ў сваім шыкоўным палацы, зручна мог нам прапісваць нязменную стойкасць у

цяжкіх выпадках, але ці знайшоў бы ён гэтае самае ў маскоўскіх лапах, цікава таксама — ці спяваў бы ён пры гэтым так ладна.

Праз паўгадзіны часу шлюпка, нарэшце, прыбыла да берага. Убачыў з-пад высокага муру адзін бок бастыёна. Мае анёлы-ахоўнікі зноў падхапілі мяне пад пахі і завялі пад гэтыя муры бастыёна крэпасці. «Дык вось, — падумалася адразу, — закрыты буду ў крэпасці».

*(Петрапаўлаўская крэпасць на правым беразе Нявы была пабудавана Пятром Вялікім у 1703 г. з мэтай абароны сталіцы Расіі з боку Швецыі і Фінляндыі. Але ўвесь час свайго існавання служыла турмой для палітычных злачынцаў. Сярод іншых вязнем тут былі царэвіч Аляксей, авантурная княжна Тараканава, расійскі мысліцель XVIII ст. Радзішчаў, а пазней у XIX ст. дзекабрысты і іншыя рэвалюцыйныя расійцы.— Аўт.).*

Адтуль быў я праведзены ўздоўж мура, а далей праз прасторнае падвор'е супраць вялікага будынка да вялікай брамы, за якой узносіліся шырокія сходы, добра асветленыя. Гэты бляск святла, што выходзіла з цемнаты, непрыемна ўразіў: усё там было ў надзвычайным руху, розныя фігуры, цывільныя і ваенныя, у шыкоўных і велізарных футрах падымаліся і спускаліся з гэтых сходаў, затрымліваючыся там на хвіліну, каб аб нечым пашаптацца на вуха паміж сабою. Калі і я павінен быў ужо туды ўваходзіць, з'явіліся новыя дзве фігуры ў закрытым адзенні, схапілі мяне і зараз жа завярнулі ў другі бок, каб праводзіць уніз. Але не прайшло і хвіліны, як нечакана з'явіліся яшчэ дзве іншыя асобы, другое перашэптванне, і мяне зноў схапілі і вярнулі на сходы. Заўважыўшы здалёк Фішара, усцешыў сябе той надзеяй, што, магчыма, не буду адзін зачынены ў камеры.

Праводзілі нас да вялікай залы, цалкам напоўненай рознага роду асобамі; многіх, напэўна, прывяла сюды цікаўнасць. Здалося мне, што генерал Касцюшка быў тут у бакавым кабінеце. Нас пакінулі, зала была запоўнена мноствам чыноўнікаў у пазументах, яны стаялі як укопаныя і маўчалі, час ад часу толькі дазвалялі сабе перашэптвацца альбо глядзець на нас са здзеклівай усмешкай. З паўгадзіны трывала гэтая жудасная ціша, калі, нарэшце, адчыніліся падвойныя дзверы. Зараз жа яшчэ больш напружыліся ўсе фігуры, апусціўшы вочы да зямлі. У дзвярах паказаўся чалавек велізарнай постаці, вышынёю не менш як шэсць стопаў, з суровым мужыцкім тварам і позіркам. Быў ён апрануты, як пры двары: адзенне з фіялетавага аксамітавага сукна з чатырма ордэнамі, з правага пляча налева і з левага направа перапаясаны шырокімі стужкамі, вялікі крыж, які спадаў з шыі і меншы — прышпілены збоку, дзве зоркі з аднаго і тры з другога боку, пяць малых крыжыкаў на баку, доўгія манжэты з пышных карункаў, галава, моцна напудраная, каса з тылу і футравыя боты. Гэтая ўся азіяцка-еўрапейская велікапышнасць не магла прыкрыць непрыемнай варварскай суровасці твару гэтага баярына і фальшу ў вачах. Гэта быў

Аляксандр Мікалаевіч Самойлаў — міністр тайных спраў Кацярыны і генеральны пракурор дзяржавы, жанаты на пляменніцы Пацёмкіна.

Паважна і ганарліва наблізіўся да мяне і пасля нейкага моманту маўчання, доўга-доўга думаючы, нарэшце, адазваўся наступнымі словамі: «У якім жа чыне, — запытаўся, — былі пры генерале Касцюшку?». «У чыне, які адпавядае сябру і афіцэру-добраахвотніку», — адказаў я. Пасля пытання зноў наступіла доўгае разважанне. Падарожнае маё ўбранне не было элегантнае: быў апрануты ў простае воўчае футра, раненая рука на перавязі і раскудлачаныя валасы. Убачыўшы, што Самойлаў паварушыў скуламі і нічога не сказаў, каб перарваць занадта ўжо доўгае яго разважанне і, жадаючы вывесці з заклапочанасці, сказаў: «Непрыемна для мяне прэзентаваць сябе Яго Вялікасці Пану ў такім занядбаным і непрыстойным выглядзе». Тут Самойлаў фыркнуў дурным і найядавіцейшым смехам і вымавіў: «Гэта не момант для далікатнасці», — ухваліў ён такім чынам дасціпны камплімент.

Хацеў я адказаць, што не маем хвіліны, у якой бы чалавек добрага паходжання і выхавання мог сабе дазволіць быць не далікатным. Але прамаўчаў і добра зрабіў.

Паведаўшы ў гэтай рэчы самыя далікатныя словы, ён задраў галаву ўверх і даў знак сваім выканаўцам. Тут жа кінуліся да мяне, двое катаў падхапілі мяне пад пахі і спусцілі са сходаў. Перайшоўшы вялікі дзядзінец крэпасці, выйшлі мы праз вялікую браму да моста, які злучаў саму крэпасць з вонкавымі валамі. З абодвух бакоў цягнуліся муры. Перайшоўшы пад'ёмны мост, убачыў у глыбіні доўгі, стары, драўляны дом. Адчыніліся невялікія дзверы. Уваходзячы са сваімі праваднікамі, убачыў доўгі, цесны калідор, у якім гарэла адна толькі свечка з лою, па абодвух баках каморкі з дзверцамі, а пры дзвярах кожнай стаяў салдат на варце, амярцвелы бы камень. Праводзілі мяне да апошняй, у глыбіні каморкі, агледзеўся ў камеры, вільгаць і пах вапны ў якой азначалі, што была свежа пабеленая.

«Гэта будзе месца Вашага пражывання, — сказаў мне адзін з маіх анёлаўстражаў, — адпаведна правілаў гэтага дома і ўказа Божай Гасударыні, дазвольце Вас ператрэсці, што робяць з кожным, хто сюды ўваходзіць», — крыкнуў капрал. Убачыўшы, што ён збіраецца мяне трэсці, я адказаў яму: «Калі ваша такое права, то зэканомлю вам на гэтай працы і аддам усё, што маю пры сабе». Зараз жа апаражніў кішэні, выцягнуўшы адтуль дзве паклажы золата, гадзіннік і нейкія нязначныя паперы, адным словам, усё, што меў пры сабе. Угледзелі, што з тылу маё споднее было зашпілена спражкай: «Не дазволена тут мець ніякага жалеза», — сказалі мне. Аддаў ім такім чынам і гэтую зброю, такую страшную. Ураднікі, забраўшы ў мяне ўсё, выйшлі, а замест іх увайшоў капрал і чацвёра салдат. Акінуў поглядам новае сваё памяшканне. Была гэта камера прыкладна ў пяць ква-

дратных крокаў, з маленькім акном, знутры груба ў крыж перапаясаным жалезнымі кратамі. Вялікая печ, адна табурэтка, невялікі сасновы столік, на якім гарэў кавалак свечкі з лою ў драўляным падсвечніку, нарэшце, вузкі ложак з сеннікам складалі ўсю мэблю гэтай камеры.

Захацелася піць, адзін з жаўнераў прынёс мне трохі вады ў драўляным кубку. Мой слуга, бедны Францішак Біндзяхоўскі, прынёс мой клуначак, паклаў падушку пад галаву, накрыў сеннік прасцірадлам, замест коўдры падаў мне плашч, каб накрыцца. Быў гэта дзень 10 (2) снежня 1794 г., дзень жахлівы, які ніколі не забудзецца.

Змучаны, кінуўся на тапчан. Не дазволілі загасіць свечку. Жаўнеры, абгарнуўшы сябе таксама плашчамі, леглі на зямлю вакол майго ложка, трымаючы сваю зброю пры сабе, апроч таго, вартавы стаў каля дзвярэй з набітым цалкам мушкетам. Колькі ж асцярожнасці супраць аднаго чалавека, хворага і раненага!

Выгляд такога смутнага вязніцтва, гэтых жаўнераў, што ляжалі вакол і былі асветленыя цьмяным святлом свечкі, яшчэ больш засмуцілі мяне — усю ноч, нягледзячы на тое, што быў змардаваны, не дазволіў сабе заплюшчыць вачэй. Страшнае маўчанне панавала ў гэтым доме. Часам толькі ўдавалася мне пачуць чалавека, які на пальцах падыходзіў і затрымліваўся пад маімі дзвярыма, напэўна, каб падслухоўваць, што тут робіцца. А шостай гадзіне трохі заснуў.

У жудасных, перарывістых маіх мроях толькі запомнілася тое, што мне снілася, як бы Кацярына загадала агаліць маю галаву...